Труды Бел. н.-и. ин-та
сельского и лесного хозяйства
Т. 10 вып. 2

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

Беларускі Навукова-Дасьледчы Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя У. І. Леніна пры СНК БССР і Аддзел Земляўпарадкаваньня і Мэліарацый Н. К. Земл. Беларусі.

Том X. Вып. 2 (5)

МАТАР'ЯЛЫ

экспэдыцыі па вывучэньню эканомікі мэліарацый на Беларусі.

Пад рэдакцыяй праф. Н. С. Фралова.

Белорусский Научно-Исследовательский Институт сельского и лесного хозяйства им. В. И. Ленина при Совете Народных Комиссаров БССР и Отдел Землеустройства и Мелиораций Народного Комиссариата Земледелия Белоруссии

МАТЕРИАЛЫ

экспедиции по изучению экономики мелиораций в Белоруссии.

под редакцией проф. Н. С. Фролова.

The White Ruthenian Lenin's Institute of scientific research of agriculture and forestry af the Soviet of peaple's commissaries of WRSSR and Departament for the landmeasuring and melioration at the agricultural peaple's commissariat of White Ruthenian S.S.R.

MATERIALS

for research the economics of the drainage in White Ruthenia (Bielarus')

arranged by prof. N. S. Frolow.

МЕНСК—MINSK

1929.

ПРАДМОВА.

Дасьледчая праца па пытаньням эканомікі меліарацый у БССР пачата Кіраўніцтвам меліарацыі і земляўпарадкаваньня Н. К. З. Б. у 1925 г. У першае лета дасьледваньні былі закончаны ў Мазырскай акрузе і вынікі іх былі надрукованы ў 1926 годзе. (Н. С. Фролов. „Вопросы экономики мелиораций в Мозырском Полесье“). Улетку 1926 году экспэдыцыйныя дасьледваньні па эканоміцы меліарацый былі зроблены ў Бабруйскай і быўш. Слуцкай акругах. Дасьледваньні вытвараліся па тэй-жа праграме і тым-жа (выбарачным) мэтадам, які ўжываўся і ў папярэдні год. Падрабязныя тлумачэньні праграмы і мэтаду працы выкладзены ў прадмове да другое часткі гэтага зборніку, дзе зьмешчана таблічная зводка сабраных дадзеных. У першай частцы зьмешчаны тры працы, напісаныя на падставе сабраных матар'ялаў. Працы гэтыя вычэрпываюць толькі частку гэтых матар'ялаў, поўнае-ж іх вывучэньне будзе магчымым з сканчэньнем усяго дасьледу.

Дасьледчыя працы 1926 году вытвараліся на сродкі Аддзелу меліарацыі і земляўпарадкаваньня Н. К. З. Б., а разпрацоўка іх заканчвалася на сродкі Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя У І. Леніна.

У працэсе дасьледваньня прымалі ўдзел: А. І. Гарэлікаў, на катором ляжала непасрэднае кіраўніцтва працаю, а таксама наступныя асобы: П. О. Братанаў (†), С. Е. Шэвялькоў, К. Т. Старавойтаў, Г. М. Жыркевіч, А. А. Удальёў, А. Ф. Маханькоў. У распрацоўцы матар'ялаў прымалі ўдзел, акрамя адзначаных асоб, К. С. Загорскі і інш.

У сучасны момант заканчваецца распрацоўка матар'ялаў экспэдыцыйных дасьледваньняў па эканоміцы меліарацый, якія вытвараліся улетку 1927 году і ахапілі ўсе астатнія акругі БССР. Зводка гэтых матар'ялаў і дасьледваньні па ўсім грунтоўным пытаньням праграмы будуць надрукованы ў наступных выданьнях „Прац“ Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя У. І. Леніна.

Кіраўнік экспэдыцыі
праф. *Н. С. Фралоў.*

Праф. Н. С. Фралоў.

Меліарацыйныя раёны Бабруйскай акругі.

I.

Устанаўленьне меліарацыйных раёнаў прадстаўляе адну з задач экспэдыцыйных абсьледваньняў, якія прадпрыняў Наркамзем БССР па пытаньням эканомікі меліарацый.

Патрэба ў рашэньні гэтае задачы ўзьнікае з меркаваньняў як дасьледча-мэтадалёгічнага, так і практычнага характару. Першыя заключаюцца ў тым, што сводка і вывучэньне матар'ялаў досьледаў прадстаўляюцца найболей мэтазгоднымі ў граніцах не выпадковых, з пункту гледжаньня меліарацыйных задач, межаў адміністрацыйных раёнаў ці вакруг, а ў граніцах тэрыторый больш-менш аднолькавых па прызнакам, якія адносяцца да меліарацыі зямель і адрозьніваюцца па гэтым прызнакам ад другіх сумежных тэрыторый. Практычная патрэба ва ўстанаўленьні меліарацыйных раёнаў заключаецца ў тым, што дзейнасьць, Наркамзему, якая разьвіваецца ім у галіне меліарацыі зямель, патрабуе магчымага набліжэньня яе да сялянскае гаспадаркі, а адсюль утварэньня меліарацыйнае службы, а ў выніку гэтага і устанаўленьня меліарацыйных раёнаў.

Першае пытаньне, якое ўзьнікае пры падыходзе да меліарацыйнага раёнаваньня, усё роўна як і да ўсякага раёнаваньня,—гэта пытаньне аб мэтодыцы і прызнаках гэтага раёнаваньня. Да гэтага часу гэты бок справы (у адносінах да меліарацыйнага раёнаваньня) асьветлены ў літаратуры вельмі мала. Можна паказаць на да-рэвалюцыйныя работы Л. Л. Нікіціна і Л. Л. Рума аб меліарацыйных раёнах даваеннай Расіі, а ў пасьля рэволюцыйны час І. І. Бяляева аб меліарацыйных раёнах Ніжняга Паваложжа, Наркамзему Украінскае С. С. Рэспублікі (у перспектыўным пляне па сельскай гаспадарцы Украіны) і галоўным чынам, праф. А. Н. Касьцякова (у яго кніжцы „Перспектывы меліарацый у СССР“ і інш.).

Поўнае аднастайнасьці ў выбары прызнакаў для ўстанаўленьня меліарацыйных раёнаў у паказаных работах няма, але ў большасьці выпадкаў у аснову ложацца кліматычныя і гідролёгічныя ўмовы, а таксама плошча і характар нягожых зямель, палепшаньне каторых састаўляе грунтоўную задачу меліарацыі. У сваёй справаздачнай працы па досьледам, якія праведзены ў 1925 годзе ў Мазырскай акрузе[1]), мы трымаліся таго погляду, што разнастайнасьць глебавых тыпаў, у прыватнасьці разнастайнасьць характару нягожых зямель, пры параўнальнай аднолькавасьці кліматычных і гідролёгічных умоў (а гэта мы

[1]) Н. К. З. Б. Управление Землеустройства и Мелиорации. Научно-Исследовательские работы 1925 г., вып. 5, Н. С. Фролов. Вопросы экономики мелиораций в Мозырском Полесье.

мелі ў Мазырскай акрузе) зьяўляецца грунтоўным момантам, які ўносіць параённыя рознасьці ў задачы і характар меліярацыйных мерапрыёмстваў.

Перавага таго ці іншага віду нягожых зямель, як аб'екта меліарацыі і павінна пагэтаму ў падобных умовах, служыць падставаю для намячэньня меліарацыйных раёнаў. Паколькі, аднак, меліярацыі зьяўляюцца па свайму прызначэньню, па перш усяго, гаспадарчым мерапрыемствам, якое мае мэтаю шляхам затраты капіталу і працы ўтварыць умовы, спрыяючыя падняцьцю зямельнае рэнты, ці ўтварэньню таго яе віду, каторы мы можам назваць меліарацыйнай рэнтаю, пастолькі аднаго гэтага прызнаку рознасьці характару нягодных зямель— недастаткова для ўстанаўленьня меліарацыйных раёнаў: неабходна выходзіць ня толькі з гэтага прызнаку, але і з рознасьці ў эканоміцы сялянскае гаспадаркі. На гэтым пункце погляду мы стаім у пытаньнях мэтодыкі меліарацыйнага раёнаваньня і ў сучасны момант: меліарацыйнае раёнаваньне павінна быць пабудована на падліку асабістасьці тых прыродных і эканамічных фактараў аддзельных частак краю, якія адзначаюць характар неабходных меліарацыйных мерапрыёмстваў.

На нарадзе па меліарацыі і культуры балот, якая адбылася ў Менску ў Кастрычніку 1927 г., шэрагам асоб, найбольш вызначана Г. І. Гарэцкім,—была адмечана неабходнасьць пры рашэньні пытаньня аб рацыанальным тыпу меліарацыйных мерапрыёмстваў у аддзельных раёнах, улічваць ступень інтэнсыўнасьці сельскае гаспадаркі ў іх. Гэта зусім правільна і ці будзем мы азначаць гэтую ступень інтэнсыўнасьці разьмерам укладаў ці высатою прыбытку, мы заўсёды тут падойдзем да ўясненьня таго боку эканомікі сялянскае гаспадаркі, якая самым цесным чынам зьвязана з адзначэньнем разьмеру ўкладу ў меліарацыі, якія магчымы і рацыянальны з пункту гледжаньня гэтае гаспадаркі, г. зн. з пытаньнем аб ступені інтэнсыўнасьці саміх меліарацый.

У поўным аб'ёме задача па ўстанаўленьню меліарацыйных раёнаў Беларусі можа быць разьвязана тады, калі будуць распрацоўвацца ўсе сабраныя матар'ялы абсьледваньня, скончанага ў 1927 годзе: тады-ж неабходна будзе болей дакладна застанавіцца і на пытаньні аб мэтадалёгіі раёнаваньня. У сучасны момант мы абмяжуемся пагэтаму пытаньню і пярэйдзем да непасрэднай задачы—намячэньню мэліарацыйных раёнаў Бабруйскае і Слуцкае акруг.

Бабруйская і Слуцкая акругі БССР прадстаўляюць вобласьць, якая ляжыць паўднёваю сваёю паловаю ў граніцах Беларускага Палесься, а паўночнымі раёнамі выходзіць у центральна-беларускую вобласьць.

У кліматычных адносінах Бабруйская акруга сваёю паўднёваю часткаю, а Слуцкая цалком, па карце кліматычных раёнаў праф. А. І. Кайгародава, ляжыць у найбольш вільготнай паласе Беларусі з ападкамі свыш 650 мілімэтраў, а паўночная частка Бабруйскай акругі— у раёне з ападкамі 600 – 650 м.м.

У гідралёгічных адносінах абое вакругі цалком ляжаць у басэйне р. Дняпра. Як Дняпро, так і найбольш буйныя прытокі яго, якія працякаюць праз Бабруйска-Слуцкаю вакругу маюць кірунак з паўночы на поўдзень, або паўднёва-захад. Дняпро прарэзвае самую ўсходнюю частку Бабруйскае акругі, ляжыць ва ўсходняй яе частцы, так што амаль уся разглядаемая тэрыторыя распаложана на захад ад Дняпро.

Заходней Дняпра, амаль раўналежна яму, працякае Бярэзіна, яшчэ заходней—Птыч, далей Случ і па самай мяжы БССР з Польшчаю прыток Случы—Морач. Такім чынам уся тэрыторыя Бабруйскае і Слуцкае вакруг распаложана ў вобласьці чатырох гідралёгічных раёнаў—Дняпра, яго прытока Бярэзіны і прытокаў Прыпяці—Птычы і Случы.

Рака Бярэзіна, упадаючы ў Дняпро на паўднёва-усходняй мяжы Бабруйскае акругі, вельмі тут зьліжаецца з ім; акрамя таго трошку паўночней, у граніцах тае-ж акругі ўпадае ў Дняпро р. Друць. Усё гэта складае параўнальна густую рачную сецць ва ўсходней часьці Бабруйшчыны і ў сваю чаргу адбіваецца, як убачым далей, на гаспадарчых умовах, у прыватнасьці на разьмерах і характару кармавое плошчы.

Агульны характар верхняга глебавага пакрову Бабруйска-Слуцкае акругі характарызуецца наступным чынам (схэматычная глебавая карта Беларусі праф. Я. Н. Афанасьева 1926 г.): за выключэньнем паўночна-заходней часткі Слуцкае акругі (Слуцкі, Капыльскі, часткова Чырвонаслабодзкі раёны), дзе пануючыя глебы прадстаўляюцца ў відзе лёсавідных суглінкаў, а таксама плям такіх-жа суглінкаў на поўнач ад Асіпавіч і Рагачова, уся астатняя абшырная тэрыторыя пакрыта тонказярністымі пяскамі, на поўнач ад Глуску і на захад ад Бярэзіны—зьвязнымі слаба валуннымі і безвалуннымі, а на поўдзень і на паўднёва-захад ад паказаных ліній—рыхлымі, распаложанымі сярод лабірынтаў балот [1]). Гэтыя пяскі з колькасьцю зьвязваючых гліністых частак ад 10 да 15%, адносяцца названым аўтарам да пераходных глебаў, якія прадстаўляюць рэзультат адкладу ледавіковых вод (флювіогляцыяльных). Згодна гіпсамэтрычнай карты Цілло, тэрыторыя Бабруйскае і Слуцкае акруг прадстаўляе тую паласу Беларусі, дзе пачынаецца (паўднёвей лініі Бабруйск-Глуск-Любань) найбольш паніжаная яе частка (40—60 саж. над узроўнем мора)—Палеская Нізіна.

Паніжаны, раўнінны рэльеф, слабы ўклон мяйсцовасьці зьяўляюцца прычынаю слабага ўклону русла ракі. Наколькі малы ўклон р. Птыч, чытаем мы у Матар'ялах па дасьледваньню рэк і рачных далін Палесься [2]), відаць з таго, што на вучастку паміж маенткам Крынкі б. Бабруйскага павету, і в. Гарэльцам, б. Ігуменскага павету, зараз у Бабруйскай акрузе, па праэкту спрамленьня агульнае даўжыні русла з 93 вёрст да 66 вёрст, аказваецца магчымым надаць праэктнаму дну рэгуляванай ракі ўклоны, якія вагаюцца ад 0,00006 да 0,00016 (і толькі ў верхней частцы вучастку ніжэй в. Гарэлец—0,00050).

Слабы ўклон рэк, якія працякаюць праз лясныя мясцовасьці, зьяўляецца прычынаю зацярушэньня руслаў рэк калодамі, карчамі, камлямі дрэў і г. д. Акрамя таго штучныя загарадкі—закалы, ямы, плаціны і г. д. перашкаджаюць стоку рачное вады і паніжаюць яго дрэнажнае дзеяньне. На тым жа дэтальна вывучаным Палескаю Дасьледчаю Партыяю у 1914 і 1915 годах вучастку р. Птычы, на працягу 93 вёрст, зарэгістрыравана 260 усякага роду штучных і натуральных перашкод у русле ракі—калод чорнага дзерава, пнёў, караг, дрэў і кустоў, астраўкоў, якія зарасьлі чаротам і лазою, рыбацкіх застаў і

---

[1]) Я. Н. Афанасьеў. Нарысы глебаў па Беларусі. Запіскі Беларускае С.-Г. Акадэміі, том I.

[2]) Материалы по исследованию рек и речных долин Полесья под ред. инж. Е. В. Оппокова, Киев 1915 г.

інш. Сюды ўвайшлі толькі тыя перашкоды, якія былі відны з лодкі. Калі лічыць патануўшыя калоды, то лік іх пабольшыцца. Летам 1914 г., калі ўзровень ракі быў нізкі, рыбакамі па даручэньню тэхніка дасьледчай партыі было зроблена выцяганьне патануўшых калод і карчоў, пры чым на вучастку у 6 вёрст, была выцягнута 508 калод лесу, даўжынею 3—4 саж. а таўшчынёю 4—8 вяршкоў і 15 вялізных карчоў. [1]) Гэта сьведчыць аб вялікай зацяружанасьці русла гэтае ракі; у такім жа становішчы знаходзяцца русла і іншых рэк Палесься.

Слабая дрэніраванасьць мясцовасьці, хоць і парэзанай сеткаю рэк, радам з яе паніжаным роўным рэльефам, які зьяўляецца вынікам геолёгічнага мінулага, і збытак ападкаў, павялі да большае забалочанасьці гэтае часткі Беларусі, да ўтварэньня таго лябірынту балот, аб якім упаміналася вышэй.

В. Г. Касаткін, які вывучаў у 1925 годзе балоты Палесься (некалькі паўднёва—заходней, у басэйне р. Арэсы), злучае тыпы балот [2]) якія яму сустракаліся, у тры групы: 1) адкрытыя травяна-асокавыя балоты („гала“) з зарасьльлю лазьняка і бярэзьніка, 2) „Мшары“, якія толькі яшчэ нараджаюцца і саснова-сфагнавыя балоты і 3) Занятыя мешаным лесам балоты, куды адносяцца тарфяныя балоты пад мешаным лесам і алешнік. Найбольшае распаўсюджваньне ў раёне, які дасьледваў В. Г. Касаткін, маюць травяна-асокавыя балоты. Травяная расьліннасьць гэтых балот вельмі разнастайна. Звычайнымі прадстаўнікамі яе зьяўляюцца: асокі, балотны сабельнік, кіпрэй балотны, капусьніца, падмарэннік і інш.

На паверхні звычайна раўнамерны пакроў гіпнавых мхоў. На некаторых балотах—пятнамі сфагнавыя мхі. Гэтую-ж перавагу гіпнавых балот у Палесьсі адмячае В. С. Дактуроўскі [3]).

Дасьледваньні балот у 1914 годзе (як і дасьледваньні папярэдніх гадоў) працягвалі высьвятляць агульны малюнак расьліннасьці іх і паказалі, што ў Палесьсі значна, пашыраны гіпнавыя балоты. Дасьледчыкі Палесься Г. У. Танфільяў, Г. Пачоскі, высьвятляючы агульны выгляд расьліннасьці, галоўным чынам, па вышэйшым расьлінам, не звярочвалі дастатковае ўвагі на мхі, дзякуючы чаму і маецца у працы Г. У. Танфільева некалькі неправідловае паказаньне на тое, што ў Палесьсі гіпнавыя балоты сустракаюцца толькі па акраінам яго, між тым нават усьцяж залітыя вадою, чаротавыя і чарота-вейнікавыя балоты і тыя у сваім расьлінным пакрову маюць гіпнум.

У прыватнасьці у сярэднім цячэньні р. Птыч пераважваюць, галоўным чынам, гіпневыя балоты (асокавыя, вейнікавыя, метлюковыя і інш.), хоць шмат у некаторых мясцох маецца дастаткова плошчы, якая пакрыта і сфагнумам, большаю часткаю лясныя балоты, апошнія ці толькі часова заліваюцца вадою, ці адсунуты ад разьліваў, знаходзячыся за невысокімі узьбярэжнымі выдмамі.

Асокавыя сенажаці з гіпнавымі мхамі, якія разьмешчаны у балоцістай пойме р. Птыч, па даным таго-ж дасьледваньня, косяцца два, рад-

---

[1]) Там-жа, стар. 38 і далей.

[2]) НКЗБ. Управление Землеустройства и Мелиорации. Научно-исследоват. работы 1925 года. Вып. III-й. В. Г. Касаткин. Почвенная характеристика заболоченных пространств Белорусского Полесья. Минск 1926 г.

[3]) Ботанические исследования по среднему течению р. Птич. В. С. Доктуровского и Н. Н. Жукова в „Материалах по исследованию рек и речных долин Полесья“.

зей адзін раз і даюць у першы ўкос ад 70 да 220 пудоў, у другі—75—100 пудоў сена. А. Чорны і Г. Купчынскі [1]) сярэдні ўкос сена ў пойме р. Птыч вызначаюць у 125 пудоў, сена не высокае якасьці і ацэньваецца ў 15 кап. пуд Толькі невялікая паласа каля самага русла ракі дае ўкосыда 350—400 пудоў даволі добрага сена даваенная цана якога 30 к. Махавыя сфагнавыя балоты скарыстоўваюцца як сенажаці, таксама і ў якасьці выганаў, пры чым у даваенны час, як паведамляецца у памянёнай працы В. Дактуроўскага і Н. Жукава, сяляне плацілі памешчыкам за такія выганы даволі высокую арэндную плату.

На поўнач і паўночна—ўсход ад лініі Бабруйск—Глуск—Любань канчаецца палеская нізіна, мяняецца і характар балот; тут балоты ўжо не ўяўляюць сабою лябірынту, сярод якога ўкроплены астравамі мінеральныя глебы, а наадварот, самі становяцца плямамі, якія часам прыймаюць характар буйных масываў сярод пяскоў і радзей суглінкаў. Дэталёвае геабатанічнае дасьледваньне часткі гэтае паласы, а іменна: тэрыторыі быўш. Рагачоўскага павету, зроблена за апошнія гады Н. М. Савіч [2]). Падагульваючы вывучэньне лугавое і лугава-балотнае фармацый, аўтар гэтае працы прыходзіць да заключэньня, што найбольшае распаўсюджваньне на тарфяніку мае злучнасьць з панаваньнем белае мятліцы, якая дае з дзесяціны каля 107 пудоў добрага сена. Акрамя балот у гэтай частцы набывае вялікае значэньне пойма Дняпра, якая дасягае тут (у граніцах быўш. Рагачоўскага павету) 2—3 кіламэтраў (шырыня поймы р. Птыч па названым вышэй дасьледваньням хістаецца ад $1/2$ да $1 1/2$ верст).

Характарызуючы травяную расьліннасьць поймы, Н. М. Савіч прыходзіць да заключэньня, што найбольш каштоўнымі ў пойме гэтае часткі Дняпра зьяўляюцца лугі сярэдняга ўзроўня, з перавагаю лісахвосту лугавога, дзе па падлікам аўтара атрымоўваецца 300 пудоў сена лепшай якасьці. Побач з гэтым у пойме Дняпра, на розных яе ўзроўнях, сустракаюцца злучнасьці асакі вострае, лісьей асакі, балотнага мятлюка на нізкіх мясцох, ці белае мятліцы—на высокім узроўні са зборам сена ад 275 да 130 пудоў з дзесяціны.

Што датычыцца дрэўнае расьліннасьці, то ў пойме Дняпра яна прадстаўляе высокаствольны лес, дзе дубы дасягаюць у вышыню 16 мэтраў, з невялікаю колькасьцю асіны і ў другім паверсе—трошку ясені і кляноў. Агульны лясны расьлінны пакроў гэтае прыдняпроўскае часткі Бабруйшчыны (быўш. Рагачоўскага павету) разнастайны, У паніжаных мясцох, на ілавата-балотнай ці тарпяна-балотнай глебе. маюць вялікае распаўсюджваньне альшэўнікі. Акрамя альшэўнікаў на торпу, ва ўмовах лішняе вільгаці, расьце таксама бярозава-сасновы лес з соснамі, якія дасягаюць 22 мэтраў (на торпу магутнасьцю 2,6 мэтра) і ў другім паверсе, бярэзіна каля 16 мэтраў вышынёю [3]). Тыпы балоцістых лясоў у басэйне р. Птыч (па В. Дактуроўскаму) наступныя: а) альшэўнікі, б) альшэўніка-бярозавыя па імху (гіпнум і

---

[1]) Там жа.

[2]) Н. М. Савич. Результаты геоботанических исследований в б. Рогачевском уезде· Минск 1926 г.

[3]) Н. М. Савич. Вышэйпамянёная праца.

сфагнум), в) бярозавыя таксама з гіпнумам і сфагнумам, г) сасновабярозавыя і д) чысты сасновы лес з сфагнавым пакровам.

Агульны малюнак прыродных умоў дасьледаваных Бабруйскае і Слуцкае акруг — шматападкаў, раўніны, ці слаба-хвалісты рэльеф, сетка дрэнна дрэнізуючых рэк, з значна забалочанымі поймамі, мінеральныя грунты-пяскі, часам суглінкі і між імі балоты — асокава-хмызьняковыя, хмызьняковыя і лясныя з гіпнавым ці, далей ад рачных далін, сфагнавым махавым пакровам.

На гэтым агульным фоне вылучаецца паўднёвая палеская частка, на захад ад Бярэзіны і на поўдзень ад лініі Бабруйск-Любань ці нават Бабруйск-Слуцак, дзе ўсе гэтыя асаблівасьці выяўлены мацней і паўночная і паўночна-ўсходняя (за Бярэзінаю), дзе яны прадстаўлены слабей.

Такая характарыстыка прыродных умоў дае падставу ў меліарацыйных адносінах выдзяліць на тэрыторыі Бабруйшчыны і Случчыны дзьве паласы ці два буйных раёны—палескі, куды ўвайшлі-б паўднёвазаходнія раёны Бабруйскае акругі і Глускі, і паўднёвыя Слуцкае-Любаньскі і Старобінскі, і пераходнаю палосу—да цэнтральнае часткі Беларусі, куды ўвайшлі-б астатнія адміністрацыйныя раёны вывучаемых акруг.

Такі падзел мы і будзем мець на ўвазе пры далейшым выкладаньні, але абмежавацца ім нельга. Не гаворачы ўжо аб тэй паласе, якую мы назвалі пераходнаю і якая, маючы праця́г з захаду на ўсход па прамой лініі звыш 250 кілёмэтраў, разьмяшчаецца ў шэрагу рачных басэйнаў, глебавых і кліматычных раёнаў, ў розных рыначных умовах і. г. д. меншая і больш аднастайная частка Бабруйска-Слуцкае акругі—Палеская—не аднолькова паміж Бярэзінаю і Птыччу і на захад ад Птычы.

Недахоп маючыхся зьвестак аб мікраклімату, мікрарэльефу і. г. д. і асобны характар нашых задач—разьвязаньне пытаньня аб меліарацыйных раёнах у сувязі з гаспадарчымі ўмовамі, застаўляе нас зыйсьці з грунту прыродна-гістарычнага і пайсьці шляхам статыстыка-эканамічнага аналізу. Тут мы ўладаем вядомым запасам зьвестак, прывязаных да пэўных адміністрацыйна-геаграфічных адзінак і выражаным колькасна, што палягчае задачу прашчупваньня меліарацыйных раёнаў і іх характарыстыку.

Першым пытаньнем, якое мы павінны пры гэтым асьвяціць, і ў каторым самым цесным чынам датыкаюцца прыродныя і эканамічныя фактары—зьяўляецца пытаньне аб зямельных ужытках. Гэтае пытаньне аб зямельных ужытках—у прыватнасьці аб нягожых землях і іх характару, аб плошчы і характару кармовых ужыткаў, зьяўляецца разам з тым адным з найболей важных у меліарацыйных адносінах.

Бяручы за адзінку адміністрацыйныя раёны, пабудуем рэкагнасцыровачную табліцу галоўнейшых ужыткаў.

№№ па парадку	НАЗВЫ РАЁНАЎ	% нягожых зямель па даных Земаддзелаў	% балот		% пяскоў		% сенажаці		У тым ліку: % мурожн.		% балотн.		% заліўн.		% лясоў	Шчыльнасьць насельніцтва на 1 кв. кілёмэтр (бяз акруговых гарадоў)
			Па даных дасьледваньня						Па даных дасьледваньня							
			Падв.	Пасел.	Падв.	Пасел.	Падв.	Пасел.	Падв.	Пасел.	Падв.	Пасел.	Падв.	Пасел.	Падв	
1	Буда-Кашалёўскі	5,14	2,41	5,12	0,26	0,34	**28,86**	**31,39**	**22,24**	**24,44**	6,62	6,44	—	—	32,3	38,9
2	Гарадзецкі	8,46	0,93	0,70	0,26	0,24	**26,42**	**27,24**	**14,67**	**1,59**	9,74	6,76	1,07	1,01	18.2	51,4
3	Стрэшынскі	30,33	**5,45**	**7,80**	2,84	4,70	15,18	13,37	2,02	1,59	5,48	3,57	**7,44**	**7,88**	13,6	41,3
4	Жлобінскі	11,62	**5,63**	**4,37**	6.79	6,42	17,70	18,09	2,95	3,31	9,84	9,81	**4,91**	**4,95**	26,7	46,8
5	Рагачоўскі	14,64	**8,19**	**7,97**	3,99	5,27	17,65	18,73	1,98	2,97	4,18	4,41	**11,49**	**11,34**	22,1	44,6
6	Глускі	23,03	**5,08**	**6,70**	**7,39**	**9,14**	20,70	17,84	2,95	1,76	**13,43**	**11,84**	4,44	3,87	28,7	21,5
7	Парыцкі	30,01	**2,61**	**5,05**	**5,68**	**8.23**	20,15	17,40	1,46	0,64	**14,67**	**11,68**	3,99	5,07	34,8	27,3
8	Бабруйскі I	8,99	2,53	3,33	1,40	1,77	20,00	18,09	8,07	11,39	**11.39**	**6,16**	0,43	0,54	39,1	32,3
9	Бабруйскі II	10.24	1,50	1,28	0,35	0,67	21,99	21,82	2,43	5.28	**18,94**	**14,68**	—	0,63	26,2	39,4
10	Асіповіцкі	13,83	**1,19**	**0,59**	1,19	2,30	18,90	17,84	8,73	6,97	9,18	10,85	—	—	53,0	26,8
11	Сьвіслацкі	11,40	**2,27**	**3,42**	1,11	1,09	26,64	26,77	10,83	9,97	8,46	5,70	7,25	11,06	40,6	27,6
12	Клічаўскі	5,81	**7.05**	**10,41**	4,57	4,07	19,61	20,73	8,80	9,38	6,34	5,95	4,47	5,37	50,6	27,6
13	Стара-Дарозскі	9,99	**5,59**	**9,03**	**1,69**	**3,20**	18,83	18,45	2,28	2,18	**15,35**	**15,58**	1,20	0,68	37,8	24,0
14	Старобінскі	7.50	**2,44**	**3,23**	**9,28**	**7,52**	20,81	21,20	2,84	1,18	**16,53**	**18.60**	1,38	0,96	34,7	29,3
15	Любаньскі	8,41	**1,77**	**1,10**	**15,45**	**10,93**	22,35	13,17	1,03	1,90	**19,74**	**18,16**	1,20	0,40	28,3	19,0
16	Копыльскі	5,39	0,04	—	0,11	—	16,08	15,60	9,94	8,94	**6,00**	**5,87**	0,14	0,19	14,1	52,4
17	Грэскі	7,52	0,10	0,01	0,43	0,75	29,76	28,56	9,12	8,04	**19,00**	**19,50**	1,04	0,49	32,0	31,8
18	Чырвона-Слабодзскі . . .	5,93	0,97	0,63	1,06	0,95	23,63	24,28	0,60	1,58	**23,02**	**24,17**	—	—	17,1	43,3
19	Слуцкі	5,61	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	45,4

Табліца гэтая складзена такім чынам, што у ёй паказаны ў процэнтах ў адносінах да ўсяе зямельнае плошчы адміністрацыйнага раёну галоўнейшыя, якія маюць непасрэдныя адносіны да меліарацыі, ўжыткі—нягожыя землі і іх віды і кармавыя (лугавыя) ўжыткі. Плошча нягожых зямель узята па дадзеных зямельнага вучоту 1925 г. (матар'ялы акруговых зямельных аддзелаў), а плошча асобных відаў нягожых зямель і лугоў—па дадзеных, зробленага экспедыцыяю паселішчнага і падворнага выбарачных дасьледваньняў.

У мэтах параўнаньня дадзеныя падворнага і паселішчнага дасьледваньняў прыведзены раўналежна. Сюды-ж намі далучаны дадзеныя аб плошчы лясоў, якія пакрываюць, як відна з вышэйсказанага, і, як вядома, вельмі часта балоты і пяскі, і дадзеныя аб шчыльнасьці насельніцтва.

Разглядаючы табліцу мы прыкмечаем, што паасобныя віды ўжыткаў больш значна прадстаўлены ў адных раёнах і слабей у другіх.

Пры гэтым калі паглядзець на карту раёнаў, то можна прыкмеціць, што раёны, пахожыя па адносьнай перавазе таго ці іншага віду ўжыткаў разьмяркованы сумежна, групамі. Гэта дае нам магчымасьць выдзяляючы раёны, якія адрозьніваюцца ад другіх па якому-небудзь з узятых намі арыентыровачных прызнакаў і падобныя па гэтым прызнакам з другімі раёнамі, злучыць іх у групы, падобныя па характару ўжыткаў, якія маюць адносіны да меліарацыі, г. зн. іначай кажучы намеціць грунт для высьвятленьня меліарацыйных раёнаў.

У табліцы курсівам набраны лічбы, характэрныя для кожнага з дасьледаваных адміністрацыйных раёнаў. Разглядаючы усю табліцу цалкам і гэтыя падкрэсьленыя лічбы, мы прыходзім да наступнага.

Першых два адміністрацыйных раёны—Буда-Кашалёўскі і Гарадзецкі—выдзяляюцца з усіх астатніх, па-першае, высокім процантам сенажаці наогул і па другое,—высокім процантам мурожных сенажацяў у прыватнасьці. Процант балот, пяскоў і нават забалочаных сенажацяў тут ніжэй, чым-ся ў другіх раёнах. Абодвы гэтыя раёны ляжаць па левы бок Дняпра, да якога не прылягаюць, ня маюць на сваёй тэрыторыі значных рэк (процант заліўных сенажацяў мізэрны), усё гэта разам узятае дае нам магчымасьць выдзяліць у асобны *сенажатна-мурожны* (ці лугава-мурожны) *меліарацыйны раён (I)*.

Наступныя тры адміністрацыйныя раёны—Стрэшынскі, Жлобінскі і Рагачоўскі—прадстаўляюць зусім другі малюнак. Гэтыя раёны, можна сказаць, ляжаць на берагох рачных далін Дняпру, а таксама Бярэзіны і Друці, якія ўліваюцца ў Дняпро, першая—у граніцах Стрэшынскага раёну, а другая—Рагачоўскага. Вышэй ужо гаварылася аб сенажатным значэньні поймы Дняпру. І сапраўды ў ваўсіх трох названых адміністрацыйных раёнах мы бачым найбольш высокі процант балот, у тым ліку, канечна, забалочаных пойменых абшараў. Гэтыя прызнакі, якія падводзяць нас амаль непасрэдна і да часткі меліарацыйных задач—меліарацыі рачных пойм і поймавых прырачных балот, даюць падставу выдзеліць гэтую групу ў асобны *балотна-заліўны* меліарацыйны раён (II).

Далей ідуць два палескія раёны—Глускі і Парыцкі. Самае геаграфічнае становішча гэтых раёнаў, - пачатак палескае нізіны, вызначае характар разглядаемых намі ўжыткаў. Пераважваюць тут балоты, балотныя сенажаці і пяскі, і мы выдзяляем яго, як *балотна-пясчаны* меліарацыйны раён (III).

Вышэй разьмешчаны два адміністрацыйныя раёны Бабруйскі I і Бабруйскі II, якія займаюць цэнтральную частку Бабруйскае акругі (у ранейшых яе межах). Тут балот і пяскоў прыкметна менш, мізэрны

процант заліўных сенажацяў, але процант балотных сенажацяў высокі, вышэй чым у другіх непасрэдна прылягаючых да яго раёнах (ня лічучы палескіх), чаму іх належыць выдзеліць як асобны *лугава-балотны* меліярацыйны раён (IV).

Апошнюю групу ў ранейшых межах Бабруйскае акругі складаюць адміністрацыйныя раёны Асіпавіцкі, Сьвіслацкі і Клічаўскі, якія выдзяляюцца процантам балот (Клічаўскі) і галоўным чынам высокім процантам лясоў. Па ўсёй вывучаемай намі тэрыторыі гэтыя тры раёны адрозьніваюцца найбольшаю лясістасьцю. Па гэтым прыкметам мы выдзяляем іх як *балотна-лясны меліарацыйны раён* (V).

Пераходзячы ў граніцы Слуцкае акругі, мы павінны заўважыць, што тут таксама паўднёвая і паўднёва-ўсходняя частка яго ляжыць ў граніцах палесься, а паўночная і паўночна-заходняя за граніцу яго.

Тры раёны, якія ляжаць значнаю ці большаю сваёю часткаю у граніцах палесься (Стара-Дарожскі, Старобінскі і Любаньскі) характарызуюцца тымі-ж асаблівасьцямі, што і вышэй разгледжаныя палескія Глускі і Парыцкі раёны, г. зн. збыткам пяскоў і балот, але адрозьніваюцца ад іх тым, што ў Любаньскім, Старобінскім і Стара-Дарожскім раёнах некалькі вышэй процант балотнае сенажаці, чаму мы гэту групу адміністрацыйных раёнаў будзем зваць *пясчана-балотна-лугавым* меліарацыйным раёнам (VI).

Напасьледак апошняя група раёнаў—Слуцкі, Чырвонаслабадзкі, а таксама Грэскі і Капыльскі, якія адыйшлі цяпер да Менскае акругі, у меліарацыйным адношаньні ўяўляюць сабою асабісты малюнак. Тут мала балот, мала пяскоў, але даволі шмат балотных сенажацяў, якія ўяўляюць сабою важны аб'ект для інтэнсыўных меліарацый, тым болей, што гэта раён інтэнсыўнае гаспадаркі з значным распаўсюджваньнем травасеяньня.

Выдзяляючы яго ў асобны меліарацыйны раён, абазначым яго як *балотна-лугавы*, *інтэнсыўна-травапольны*, ці проста *інтэнсыўна-травапольны* меліарацыйны раён (VII).

Карта меліарацыйных раёнаў.



Такім чынам усю тэрыторыю Бабруйска-Слуцкае акругі можна падзяліць на сем меліарацыйных раёнаў. Зразумела, што параўнальна буйныя разьмеры адміністрацыйных раёнау, па якім мы намячалі мелія-

рацыйныя, прыводзяць да таго, што ўнутры намячаемых намі меліарацыйных раёнаў, няма поўнае аднастайнасьці. Як прыклад, можна паказаць на Грэскі раён, які ўсходняю сваёю часткаю прадстаўляе малюнак забалочанага Палесься, слаба насялёнага і. г. д., а заходняю—густанасялёны, малазабалочаны раён.

Але выходзіць з болей дробных адміністрацыйных адзінак мы не маглі з-за адсутнічаньня адпаведных дадзеных, вядомая-ж умоўнасьць у намячэньні межаў якіх бы та ня было раёнаў няўхільна.

Далей, мы паклалі у грунт намячэньня меліарацыйных раёнаў тыпы пераважных ужыткаў, а іменна тых з іх, якія маюць адносіны да меліарацыйных задач. Зразумела, што гэтым разнастайнасьць умоў, якія маюць значэньне для меліарацыі, не вычэрпваецца. Больш таго, быць можа прыметы гэтыя і не ахопліваюць самага галоўнага ў гэтым напрамку, але яны даюць першую арыентыроўку, падыход да таго, каб так ці іначай схэматызаваць акружаючую разнастайнасьць і мець для далейшага дасьледваньня да некаторай ступені абгрунтаваныя напрамкі.

Самыя назвы раёнаў, якія прыведзены вышэй, ня прэтэндуюць на поўнае адбіцьце меліарацыйных асаблівасьцяў кожнага раёну і дадзены толькі для таго, каб фіксыраваць тыя прыкметы, па якім тая ці іншая група адміністрацыйных раёнаў выдзяляецца у асобны меліарацыйны раён.

II.

Намеціўшы схэму меліарацыйных раёнаў, пярэйдзем зараз да характарыстыкі іх, якая дае нам магчымасьць болей выразна уявіць сабе іх асаблівасьці, зьвязаныя з паказанымі вышэй прыкметамі, іх адзнакі і падобнасьці з другімі меліарацыйнымі раёнамі акругі. У аснову гэтае характарыстыкі мы паложым табліцы, якія прыводзяцца ў 2-й частцы гэтае працы, разглядаючы пераважна наступныя пытаньні: а) арганізацыю ральніцтва, б) арганізацыю жывёлагадоўлі, в) здабываньне кармоў, г) меліарацыі, д) характарыстыку выдаткаў (капіталу) і прыбыткаў у сялянскай гаспадарцы.

I. Сенажатна-(лугава)-мурожны-меліарацыйны раён. У склад яго ўваходзяць, як паказана вышэй, Буда-Кашалёўскі і Гарадзецкі адміністрацыйныя раёны.

Паляводзтва ў гэтым раёне характарызуецца параўнальна высокім процантам узворанасьці зямлі (пахаці 38—39%). Па проценту залежы, папару і пасеву да пахаці гэты раён не выдзеляецца з другіх намечаных намі (гл. табліцу).

Трохпалевая сыстэма ральніцтва ў 59,8% апытаных гаспадарак; азімае жыта (па дадзеным вясеннега абсьледаваньня Ц. С. У. 1925 году) займае ў пасеве менш, чым у суседніх раёнах, якія ляжаць заходней, а іменна ўсяго 38,9%. З яравых галоўнае месца належыць аўсу (12,4%) другое—грэчцы (10,8%). Пад бульбаю—15,9%—вышэй, чым у ваўсіх другіх раёнах. Травасеяньне распаўсюджана слаба (пад канюшынаю 1,9%). Вываз гною найбольшы сярод усіх другіх раёнаў і дасягае 1500 пудоў на дзесяціну, сярэдні ураджай вышэй чым у другіх раёнах (за выключэньнем Заходняе часткі Слуцкае акругі) і раўняецца для жыта 43,6 пудоў, для бульбы 479,2 пудоў.

Жывёлагадоўля. Па колькасьці буйнае рагатае жывёлы (на 100 душ насельніцтва 46,4 галавы) раён можа быць аднесены да маласкотных і сярэдня-кароўных; сьвіней больш чым у другіх раёнах, авец больш чым у сумежным II раёне, але аднолькавая колькасьць ці нават менш, чым у другіх раёнах. Такое-ж прыблізна месца займае гэты раён і па колькасьці розных відаў жывёлы на 100 дзесяцін сельска-гаспадарчай

плошчы (пахаці і сенажаці). Па складу стада буйнае рагатае жывёлы раён выдзяляецца высокім працантам кароў (63,1). Сярэдняя жывая вага каровы 12,9 пудоў, сярэдні гадавы ўдой 20,2 пудоў.

Кармавое пытаньне. Сенажаць займае у раёне да ўсяе яго плошчы (па дадзеным зямельнага кіраўніцтва) 18,4%, ў адносінах да плошчы дасьледаваных сялянскіх гаспадарак і паселішч г. зн. фактычна плошчы бяз лесу—28,30%—вышэй чым у другіх раёнах, пры гэтым 2/3 усяе сенажаці—мурожная, чым гэты раён выразна выдзяляецца з другіх. Сярэдні ўкос мурожнага сена тут таксама найбольшы—84,5 пудоў з дзесяціны, арэндная плата амаль самая высокая (24 р. 07 к.). Пасьба жывёлы па сенажаці тут, як і ўсюды, пашырана, але ўсё-ж меней, чым у другіх раёнах.

Двароў з штагоднаю бязкорміцай, а таксама двароў, якія купляюць корм, каля паловы з усяго ліку дасьледаваных.

Меліарацыі. Плошча нягожых зямель па дадзеным зямельнага вучоту 6,3%, у дасьледваных экспэдыцыяю паселішчах 3,2%. Плошча балот (у тым ліку і такіх, што скарыстоўваюцца) у тых-жа паселішчах —12%, г. зн. менш чым у ваўсіх другіх меліарацыйных раёнах (акрамя IV, дзе прыблізна столькі-ж). З усей плошчы зарэгістрыраваных балот пад лесам і хмызьняком 11,8%, пад хмызьняком і асокаю 42,4%, травяных 26,5%. Высокі працант асокава-травяных балот вядзе да таго, што 54,2% іх плошчы, г. зн. больш чым, амаль, у ваўсіх другіх раёнах скарыстоўваецца, як сенажаць, 9,3% як выган і 5,1% як сенажаць і выган. Трэцьцяя частка ўсей балотнай плошчы не скарыстоўваецца. Працант мокрых сенажацяў [1]) нізкі, усяго 10,4, працант выгану непрыступнага вясною для жывёлы 34,0%, працант вымакаючых пасеваў—3,58. Асушальныя меліарацыі ў раёне распаўсюджаны: асушальныя канавы маюцца ў ваўсіх дасьледаваных паселішчах, на землях паловы ўсіх апытаных двароў. Агульны прыбытак асушанае дзесяціны па ацэнцы сялян (па азначэньню зьмены колькасьці і якасьці зьбіраемага сена [2]) падняўся з 6 р. 48 к. да 26 руб. 14 кап. Лічбы гэтыя, як да асушэньня, так і пасьля, ніжэй чым у другіх раёнах, але ступень павышэньня агульнага прыбытку—вышэй. Зрэзка купья на сенажацях утваралась 16,9% двароў, значыцца гэты від паверхоўных палепшаньняў сустракаецца тут часьцей, чым у другіх раёнах. У палове даследаваных паселішч прымаюць меры супроць вымачак пасеваў—галоўным чынам, як і ў другіх раёнах, шляхам праворваньня глыбокіх раз'емных баразён. Страты ад заносу пасеваў пяском нязначныя.

Капітала-інтэнсыўнасьць і прыбытковасьць сялянскае гаспадаркі. Кіруючыся сабранымі экспедыцыяю бюджэтнымі дадзенымі, можна даць наступную характарыстыку выдаткаў (укладзеных капіталаў) і агульнае прыбытковасьці сялянскае гаспадаркі. Па разьмеру капіталаў як усіх, так і сельска-гаспадарчых, I меліарацыйны раён стаіць на першым мейсцы, нароўне і, нават, часткова перавышае VII (інтэнсыўна-травапольны). Разьмер грунтоўных выдаткаў (без будынкаў) на 1 дз. усей зямлі тут дасягае 77 руб. 35 к., на 1 дзесяціну гожай плошчы—80 руб. 42 кап. Першае месца раён займае і па разьмеру агульнага прыбытку, які дасягае на 1 дз. усяе зямлі—107 р. 11 к., на 1 дз. гожае—111 р. 36 к. Па складу агульнага прыбытку першае месца, як і

[1]) Пад мокрымі сенажацямі разумеліся такія, дзе ў час уборкі пад нагою праступае вада.

[2]) Ацэнка якасьці сена высьвятлялася шляхам пастаноўкі пытаньня, колькі каштуе пуд такого сена, якое было-б на балоце да яго асушэньня (па цэнам 1926 г.) і якое есьць цяпер (па цэнам гэтага-ж году).

ў другіх раёнах, займае ральніцтва (56,9%), затым буйная рагатая жывела (15,7%)—менш, чым у другіх раёнах, (акрамя II); лугаводзтва дае тут усяго 6,9% агульнага прыбыту, ніжэй, чым у ваўсіх другіх раёнах акрамя VII (у бюджэтных гаспадарках сенажаць займала 23,4% плошчы).

Шчыльнасьць насельніцтва ў раёне 45 душ на 1 кв. вярсту.

Заключэньне. Падводзячы вынік зробленаму апісаньню I меліярацыйнага раёну заключаем, што ён адносіцца да аднаго з найболей інтэнсыўных раёнаў і, маючы меншую, параўнаўча з другімі раёнамі, плошчу, якая патрабуе асушэньня, зьяўляецца болей падрыхтаваным да вытварэньня інтэнсыўных меліярацый з культуртэхнічнымі паляпшэньнямі, хоць, параўнаўча, кармамі ён забясьпечаны лепей за другія раёны.

II. Балотна-заліўны меліярацыйны раён. (Прыдняпроўскія адміністрацыйныя раёны—Стрэшынскі, Жлобінскі і Рагачоўскі).

Ральніцтва. Па прыметах, якія характарызуюць арганізацыю ральніцтва (процант распашкі, папару, засеву ад пахаці) раён гэты блізкі да папярэднега. Тут толькі вышэй процант азімага жыта (42,4) і процант гаспадарак з трохпалёўкаю (65,2). З яравых авёс і грэчка займаюць, прыкладна, роўную плошчу (9—10%). Колькасьць вывазімага гною ніжэй (975 пудоў), ніжэй таксама і сярэднія ўраджаі жыта (35,8 п.) і бульбы (431,4 пуда). Па разьмерах ураджаю гэты раён стаіць на апошнім месцы сярод усіх другіх.

Жывёлагадоўля. Колькасьць усіх відаў жывёлы на 100 душ насельніцтва тут таксама ніжэй, чым у I раёне і чым у ваўсіх другіх раёнах. Па колькасьці буйнае рагатае жывёлы, кароў і авец на 100 дз. сельска-гаспадарчай плошчы раён гэты стаіць вышэй I-га, па колькасьці авец—нароўне з ім. Таксама як і ў першым раёне процант кароў тут высокі (62,8), але па сярэдней жывой вазе (12,5 пуд.) і сярэднему гадавому ўдою ён стаіць на апошнім мейсцы.

Кармавое пытаньне. Процант сенажацяў тут ніжэй, чым у большасьці астатніх раёнаў (11,6% да ўсяе плошчы і 17—18% да плошчы дасьледаваных паселішч).

Палова ўсяе сенажаці (48,8%)—заліўная ў пойме Дняпра і яго прытокаў, 37,8%—балотная і мурожная—ўсяго 13,5%. Высокі процант заліўное сенажаці складае асаблівасьць, якая выдзяляе раён гэты з другіх меліярацыйных раёнаў. Сярэдні збор сена з заліўных сенажацяў дасягае тут 130 пудоў, арэндная плата за дзесяціну лугу 29,4 руб.

Тым ня менш, становішча з кармамі тут цяжкае. Тры чверці ўсіх двароў убіраюць сваю сенажаць у вадзе, у 58% усіх апытаных двароў частка сена гніе ў пакосах. Няма ні воднага паселішча, у каторым хапала-б кармоў; на недахоп кармоў скардзяцца 70% апытаных двароў. Цэны на сена вясною 1926 году параўнаўча з другімі раёнамі былі высокія. Выганаў параўнаўча шмат (3,9% па дадзеным землекіраўніцтва), але у ⅔ дасьледаваных паселішч выганы балотныя.

Меліярацыі. Па проценту нягожых зямель (16,6) і забалочанасьці (20,8%) раён гэты стаіць на адным з першых месц. Але з балот 28,1%, вышэй, чым у дасьледаваных паселішчах другіх раёнаў, пакрыты лесам і хмызьняком. Чацьвертая частка балотнае плошчы зусім не скарыстоўваецца. 26,1% скарыстоўваецца пад выган, 14,4%—пад выган і сенажаць. Такім чынам, тут у параўнаньні з папярэднім раёнам, значная частка балот скарыстоўваецца пад выпас жывёлы. Процант засеву, які страдае ад вымачак—2,9, мокрае сенажаці—29,1, непрыступнага вясною для жывёлы выгану—16,0; чверць ўсіх дасьледаваных паселішч маюць дарогі, па якіх ня ва ўсякі час году можна праехаць. Пры ўсім

тым мы тут сустракаемся з фактам меншага распаўсюджваньня меліарацый, што знаходзіцца ў сувязі з большаю складанасьцю іх ажыцьцяўленьня (недасяжнай для сялян без тэхнічнай дапамогі) у пойменых і каля пойменых балотах. Выкапаныя асушальныя канавы маюцца толькі ў пятай частцы дасьледаваных паселішч і ў чвэрці апытаных у іх двароў. У тых выпадках, калі мелі месца асушальныя меліарацыі, агульная даходнасьць асушаных балот паднялася з 29,29 руб. да 37,1 руб. на дзесяціну. Значныя страты прычыняюцца ад заносу засеву пяском.

Па падворнаму апытаньню за два апошнія гады занесена пяском 2,3%, а па паселішчнаму нават 9,0% засеўнае плошчы. Апошняя лічба відавочна павялічана, але калі нават выходзіць з болей праўдападобнай (і па мэтаду апытаньня) падворнае лічбы, дык убачым, што гэты раён зьяўляецца адным з тых, дзе заносы пяском прычыняюць найбольшыя няшчасьці.

Капітала-інтэнсыўнасьць і даходнасьць. Па капіталаінтэнсыўнасьці і агульнаму прыбытку на адзінку плошчы раён гэты далёка ўступае папярэднему і зьяўляецца ў гэтым сэнсе адным з бедных раёнаў. Сярэдні разьмер с/гасп. капіталаў на адну дзес. ўсёй зямлі—47,60 руб.; на 1 дзес. удобнае плошчы—53,4, агульнага даходу на 1 дзес. ўсей зямлі—71,68 руб., на адну дзес. удобнае зямлі—80,48 руб. Па складу агульнага прыбытку тут узмацняецца значэньне лугаводзтва (11,64%) і сьвінагадоўлі (10,76%) і паслабляецца значэньне ральніцтва (54,08%).

Заключэньне. Раён гэты вастрэй папярэдняга нуждаецца ў меліарацыях, правядзеньне якіх тут прадстаўляе болей складаную тэхнічную задачу; па тыпу жыцьцёвай тут меліарацыі больш экстэнсыўнага характару, з некаторым узмацненьнем увагі ў бок палепшаньня пашы, галоўным чынам, у бок меліарацыі рачных пойм.

III. Балотна-пяшчаны меліарацыйны раён (палескія адміністрацыйныя раёны—Глускі і Парыцкі).

Ральніцтва ў гэтым раёне мае меншае значэньне чым у раней разгледжаных. Пахаць тут займае ўсяго 20% тэрыторыі (на землях дасьледаваных паселішч, значыцца, ня лічучы лясоў, 36,4%). Гаспадаркі з трохпалёваю сыстэмаю ральніцтва складаюць ўсяго 11,7% апытаных двароў, у 78,7% назіраецца няправільнае (не ўстаноўленае) чаргаваньне культур. Процант папару ўсяго 13,5, процант залянжы—14,1'—вышэй чым у ваўсіх другіх раёнах. Такім чынам, мы тут сустракаемся з паласою, дзе пачынаюцца характэрныя для Палесься захаваўшыяся астаткі пераложнае сыстэмы. Сярод культур першае месца займае жыта (46,6%, вышэй чым у ваўсіх астатніх раёнах) далей сьледуюць тыя-ж і у тым-жа проценту, што і ў папярэднім раёне, авес і грэчка. Вываз гною такі-ж, які і ў папярэднім раёну, ураджай некалькі вышэй (38,1 пуд. жыта і 485,7 пуд. бульбы).

Жывёлагадоўля. Па колькасьці жывёлы на 100 душ насельніцтва гэты раён зьяўляецца шматскотным, па ліку галоў на 100 дз. с. г. плошчы блізкі да папярэдняга, толькі сьвіней тут, а таксама авец на адзінку плошчы менш. Буйнае рагатае жывёлы на 100 дзес. с. гаспад. плошчы столькі-ж (39,4 галоў), але склад яе іншы: тут каровы складаюць ужо толькі 59,2% і процант рагатага маладняку старэй 1 году ўзрастае (25,1%). Сярэдняя вага каровы (14,2 пуд.) і сярэдні ўдой (21,5 пуд.)—некалькі вышэй.

Кармавое пытаньне. Процант сенажацяў тут (па зямельнаму вучоту)—13,9, выгану 1,7, г. зн. параўнальна высокі, аднак тут, у большай, быць можа ступені, чым у другіх раёнах, як для сенажаці, так, галоўным чынам, для выпасу жывёлы скарыстоўваюцца балоты і лясы.

Сенажаць тут, галоўным чынам, балотная 66,9%, затым заліўная—20,9% і мурожная—11,9%. Сярэдні збор на балотнай сенажаці—81 пуд., заліўной—137 пуд. і мурожнай—65 пудоў. У параўнаньні з другімі раёнамі збор балотных і заліўных сенажацяў тут высокі. Арэндныя цэны на сенажаці нізкія—11,60 руб., што тлумачыцца, канечна, перавагаю балотных сенажацяў; сярэдняя арэндная цана на заліўныя і мурожныя сенажаці тут—28,8 руб., а на балотныя—8,3 руб. з дзес. Больш паловы ўсіх сенажацяў мокрых, у 56,5% апытаных гаспадарак частка сена гніе ў пакосах, пры чым гібель сена пры гэтым дасягае ў сярэднім 26 пудоў на гаспадарку. Недахоп кармоў адмячаецца ўваўсіх паселішчах, але процант гаспадарак, у каторых не хапае сена параўнаўча, нізкі (44,4). Выпас жывёлы на сенажаці мае распаўсюджваньне, амаль у ваўсіх мясцох (91% дасьледаваных паселішч). Каштоўнасьць выпасу аднэй галавы маладняку пры аддачы на старану—4 рублі, ніжэй чым у першым раёне (4,65 р.) і вышэй, чым у другім (2,19 руб.).

Меліарацыі. Па дадзеным зямельнага вучоту чацьвертая частка ўсяе тэрыторыі прадстаўляе нягожыя землі, процант забалочанасьці ў дасьледаваных паселішчах—33,3, 16,4% балот у гэтых паселішчах пакрыты лесам, 21% хмызьняком і асакою, 44,9%—травою.

Пад сенажаць скарыстоўваецца трошку больш чвэрці ўсіх балот, пад выган і не скарыстоўваемых столькі-ж, і пятая частка балот скарыстоўваецца мешана пад выган і сенажаць.

Высокі процант забалочанасьці, а таксама мокрых сенажацяў складаюць прадпасылкі для распаўсюджваньня меліарацый. Сапраўды, асушальныя канавы маюцца ў 28% дасьледаваных паселішчах і ў 59% апытаных у іх двароў. Павышэньне агульнае прыбытковасьці асушаных балот з 25,13 руб. да 38,68 рублёў. Зрэзка купья і кустоў, як і ў папярэднім раёне, мае невялікае распаўсюджаньне. Значныя папсаваньні (2,48% засяўное плошчы па падворнаму апытаньню) прычыняюць пяскі.

Капітала-інтэнсыўнасць і даходнасьць. Па разьмерам капіталаў на 1 дзес. усей зямлі (51,26 руб.) і на адну дзесяціну гожае плошчы (55,05 руб.), раён гэты стаіць трошку вышэй папярэдняга. Па разьмеру агульнага прыбытку нароўне з ім. У складзе агульнага прыбытку мы тут прыкмячаем далейшае і сільнае зьніжэньне долі ральніцтва (45,9%), некаторае павялічэньне прыбытку ад лугаводзтва (12,8%) і значнае ад жывёлагадоўлі (21%).

Шчыльнасьць насельніцтва нізкая—24 душы на 1 кв. вярсту.

Заключэньне. Па ўсяму сказанаму раён гэты характарызуецца як экстэнсыўны з параўнаўча вялікім значэньнем жывёлагадоўлі (мяснoе). Патрэба ў меліарацыях, у сілу значнай забалочанасьці і зацікаўленасьці гаспадаркі ў паляпшэньні кармавое базы дзеля жывёлаводзтва, вялікая, але пры наяўнасьці слабай капіталаінтэнсыўнасьці гаспадаркі, нізкае прыбытковасьці адзінкі плошчы і абшырнасьці забалочаных прастораў, у меліарацыях экстэнсыўных.

IV. Лугава-балотны меліарацыйны раён. (I і II Бабруйскія адміністрацыйныя раёны).

Ральніцтва. Па арганізацыі ральніцтва раён гэты блізкі да прыдняпроўскіх і задняпроўскіх частак акругі, якія ляжаць на ўсход ад яго (I і II меліорацыйныя раёны) Тут той-жа процант пахаці, папару і засеву ў адносінах да пахаці. Сыстэма ральніцтва пераважна трохпалёвая (59,2% дасьледаваных гаспадарак). У засеве жыта—44,8%, з яравых—авёс—11% і грэчка—9,8%. Бульба займае некалькі меншую плошчу, чым у раней разгледжаных раёнах, а іменна 14,6%. Па ўраджайнасьці стаіць на адным з апошніх месц.

Жавёлагадоўля. Па колькасьці жывёлы на 100 душ насельніцтва раён адносіцца да маласкотных. У адносінах адзельных відаў жывёлы да сельска-гаспадарчай плошчы, наадварот, раён выдзяляецца параўнаўча вялікімі лічбамі. У гэтых адносінах ён складае працівалегласьць папярэднему раёну, дзе жывёлагадоўля носіць экстэнсыўны характар, з вялікім лікам жывёлы на гаспадарку, але малым на адзінку плошчы. Процант кароў тут ніжэй чым у I і II раёнах (60,90) але гадавы ўдой некалькі вышэй (23,5 пудоў).

Кармавое пытаньне тут стаіць больш войстра, чым ува многіх другіх раёнах. Плошча сенажаці прыблізна такая, як і ў папярэднім (на дасьледаваных сялянскіх землях 18—20%, да ўсяе тэрыторыі—13,9%), але сенажаці пераважна балотныя (68,8), пры мізерным проценту заліўных (1,3%). Балотныя сенажаці нізкае якасьці, са зборам з дзесяціны ўсяго 52 пуды, прычынаю чаго часткова служыць амаль сплашное скарыстоўваньне балотных сенажацяў і для выпасу жывёлы. У выніку тут найбольшы процант гаспадарак, у каторых не хапае кожны год свайго корму (73,7). Арэндныя цэны на сенажаць, ня глядзячы на тое, што процант балотных сенажацяў тут такі-ж як і у папярэднім раёне (яны горшае якасьці), высокія і дасягаюць 23,27 руб., у прыватнасьці за балотную сенажаць тут плацяць 17,4 руб. за дзесяціну. Цэны на сена часткова, напэўна дзякуючы блізкасьці гораду таксама, найбольш высокія і дасягалі пры пакупцы кармоў вясною 1926 году 2 руб. 06 кап. за пуд заліўнога сена, 1 р. 63 к. балотнага і 1 рубля за яравую салому. Мокрыя сенажаці тут займаюць хоць параўнальна невялікі процант (21,7%), але ўборка адымае ў параўнаньні з другімі раёнамі больш часу (15,8 дён на дзесяціну), з прычыны складанасьці сушкі сена. Плошча выганаў, па дадзеным зямельнага вучоту невялікая (1,7%) і пасуць, як адзначана вышэй, па сенажаці, пахаці і балотам (трэцьцяя частка ўсіх дасьледаваных паселішч). За выпас жывёлы на старане бяруць найбольш высокую плату: за галаву рагатага маладняку—6,12 руб., аўцы—1,86 руб.

Меліарацыі. Процант нягожых зямель (9,7) і забалочанасьць (11,9) тут параўнаўча не высокая. З балот толькі 7,1 пакрыты лесам, 4%,—хмызьняком-асакою і 80,4%—адкрытыя балоты. Нескарыстоўваемых балот 25,8%, астатнія скарыстоўваюцца переважна пад сенажаць і менш пад выпас жывёлы. Вельмі высокі процант выганаў, якія вясною не дасягаемы для жывёлы (у 63% дасьледаваных паселішч), процант вымачкі засеваў параўнаўча нізкі (1,2).

Асушальныя канавы маюцца на землях паловы (51,3%) апытаных двароў. Але тут мы сустракаем адзінічны выпадак, калі правядзеньня асушальных канаў павяло не да павышэньня, а да некаторага зьніжэньня агульнага прыбытку з 40,20 руб. да 37,78 руб. на дзесяціну, у выніку памяншэньня колькасьці накошваемага сена (з 80,4 да 50 пудоў; якасьць сена на асушаных балотах палепшылася, што відаць з таго, што па ацэнцы сялян сена, якое зьбіралася да асушэньня, ацэньваецца па 56,4 кап. за пуд, а пасьля асушэньня—67 кап. Бяручы пад увагу паказаны вышэй характар скарыстоўваньня балотных сенажацяў (выпас жывёлы), характар саміх балот (адкрытыя качкарніка—травяністыя), сьледуе прызнаць, што экстэнсыўнае асушэньне, без наступных палепшаньняў, тут магло павясьці да паказаных вынікаў, ці у ваўсякім выпадку да малое зьмены прыбытковасьці асушаных балот. Тут часьцей, чым у другіх раёнах, адмячаюцца выпадкі павярхоўных паляпшэньняў: зрэзка куп'я (6% дасьледаваных гаспадарак) і баранаваньне (0,7%).

Капітала-інтэнсыўнасьць і даходнасьць. Па капіталаінтэнсыўнась-

ці раён стаіць на апошнім месцы (34,01 руб. на 1 дз. ўсёй зямлі і 37,19 руб. на 1 дз. удобнае плошчы), па агульнай даходнасьці (67,5 руб. на 1 дз. ўсёй зямлі і 73,8 руб. на 1 дз. гожае плошчы)—таксама на адным з апошніх месц. Асабліва ў гэтых адносінах выдзеляецца II-гі Бабруйскі раён, дзе мы сустракаемся з самаю нізкаю прыбытковасьцю на адзінку плошчы. Найбольш значнае месца ў прыбытковасьці, вышэй чым у ваўсіх другіх раёнах, належыць тут ральніцтву (58%).

Заключэньне. Ня гледзячы на слабую капіталаінтэнсыўнасьць гаспадаркі гэтага раёну, меліарацыі тут патрабуюць больш значных укладаў сродкаў, *неабходны больш інтэнсыўнага тыпу.* У гэтым нас пераконвае высокая агульная прыбытковасьць балотных сенажацяў, высокія цэны на сена, параўнаўча інтэнсыўны напрамак жывёлагадоўлі, сільная нужда ў кармох, блізкасьць гораду, а таксама слабая рэзультаціўнасьць экстэнсыўных асушальных меліарацый, якія вытвараліся да гэтага часу.

V. Балотна-лясны меліарацыйны раён. (Асіпавіцкі, Сьвіслацкі і Клічаўскі адміністрацыйныя раёны).

Ральніцтва. Раён гэты, разьмешчаны у басэйне р. Сьвіслачы і Бярэзіны, хоць і выходзіць за край палескай нізіны, але, як паказвае назва, адрозьніваецца высокім процантам балот і лясоў. Забалочанасьць ўсяго гэтага меліарацыйнага раёну 17,3%, процант лясоў па дадзеным зямельнага вучоту ў Асіпавіцкім—58,0, Сьвіслацкім—40,6, Клічаўскім—50,6, больш чым у ваўсіх другіх раёнах Бабруйскае і Слуцкае акруг. Лясная плошча займае значыцца палову ўсяе тэрыторыі раёну. Плошча пахаці ўсяго 17—20%. Аднак, калі узяць толькі сялянскія гаспадаркі, дык у дасьледаваных паселішчах разворанасьць дасягае 47,4%—ніжэй, чым у другіх раёнах пераходнае паласы, але больш чым у палескіх раёнах (III і VI), Жыта займае 39%, пад аўсом вялікая частка пасеву (18,6%), грэчка-ж займае ўсяго 5,6%. Пачынаючы адсюль на захад процант грэчкі ў пасеву ўсё ўбывае. Пануючая сыстэма ральніцтва (у 58,8% дасьледаваных гаспадарак)—трохпалёўка, пасевы канюшыны некалькі вышэй, чым у другіх, раней апісаных раёнах (3,5%) ураджаі жыта таксама некалькі вышэй (39 пудоў), бульбы—нізкія (422 пуда).

Жывёлагадоўля. Па колькасьці буйнае рагатае жывёлы, а таксама кароў і сьвіней на 100 душ насельніцтва, раён гэты стаіць вышэй папярэдняга IV (Бабруйскага 1-га і 2-га). Па колькасьці розных відаў жывёлы на 100 дз. с. г. плошчы, а таксама па складу буйнае рагатае жывёлы, жывой вазе і ўдойлівасьці кароў—блізкі да яго.

Кармавое пытаньне. Плошча сенажаці, як і пахаці ў адносінах да ўсяе тэрыторыі раёну тут ніжэй чым у другіх мясцох і дасягае ўсяго 8,6%; у адносінах-жа да плошчы дасьледаваных паселішч сенажаць займае 21-22%. Большая частка гэтае сенажаці—мурог (43,8%), затым балотная—(38%) і на апошнім месцы заліўная (16,1%). Ураджайнасьць заліўных сенажацяў найбольш высокая сярод усіх другіх раёнаў: 140 пуд. мурожнага і балотнага—67 пуд.; цэны на сена вясною 1926 году, параўнаучa з другімі раёнамі, былі нізкія, арэндныя цэны на сенажаць—18,70 руб., за выпас галавы маладняку 1 руб. 90 кап.

Меліарацыі. Забалочанасьць раёну, як паказвалася вышэй—17,3%. Трэцьцяя частка ўсіх балот занята лесам, або хмызьняком з асакою, палова-адкрытых травяных і мохавых балот. Галоўным чынам балоты скарыстоўваюцца пад сенажаць і выган (35,5%), не вялікая частка (4,7%) толькі пад выган, чвэрць усяе плошчы—толькі пад сенажаць і чвэрць зусім не скарыстоўваецца. Параўнальна з другімі раёнамі тут высокі процант вымачак пасеваў (7,0). Асушальныя канавы

маюцца ў чвэрці ўсіх дасьледаваных паселішч і на зямлі 47% апытаных двароў.

Агульная прыбытковасьць асушаных балот па ацэнцы сялян паднялася з 27,51 руб. да 33,41 руб. Параўнаўча часты выпадкі гаспадарак, якія ўжываюць павярхоўныя паляпшэньні.

Капітала-інтэнсыўнасьць і даходнасьць. Па разьмеру капіталаў на адзінку плошчы раён гэты значна вышэй папярэдняга (47,03 руб. на 1 дзес. усёй зямлі і 51,23 руб. на 1 дзес. удобнай плошчы), па разьмерам і складу прыбытку блізкі да яго, з той розьніцаю, што частка ральніцтва ў V раёне вышэй, чым у IV, а частка жывёлагадоўлі ніжэй.

Заключэньне: Апісаны раён, як бачым, блізкі да папярэднега, але істотна адрозьніваецца ад яго вялікім збыткам балот і, галоўнае, лясоў. Больш абшырная плошча балотных зямель, больш нізкая даходнасць абсушаных балот і параўнаўча нізкая валавая прыбытковасьць сельскае гаспадаркі дапушчаюць менш інтэнсыўны тып меліарацыі, чым у папярэднем выпадку, але наяўнасьць выпадкаў прымяненьня павярхоўных паляпшэньняў дае магчымасьць чакаць вядомага распаўсюджваньня культур-тэхнічных мерапрыёмстваў.

Побач з гэтым тут большае значэньне чым у другіх раёнах, атрымоўвае асушэньне лясоў.

VI. Пяшчана-балотна-лугавы меліарацыйны раён. (Старадарожскі, Старобінскі і Любанскі адміністрацыйныя раёны).

Ральніцтва. Усе тры адміністрацыйныя раёны, якія ўваходзяць у VI меліарацыйны раён, значнай часткаю сваёй тэрыторыі ляжаць у граніцах палескай нізіны, таму ў характару, як ральніцтва, так і другіх галін гаспадаркі, шмат агульнага з апісаным вышэй III меліарацыйным раёнам, таксама палескім. Плошча пахаці на землях дасьледаваных паселішч займае 32,3% (у III раёне - 36,4%)—ніжэй, чым ваўсіх другіх раёнах. Трохпалёвая сыстэма ральніцтва маецца толькі у 17,9% апытаных гаспадарак (у III раёне—11,7%) і пераважвае неправільнае чаргаваньне культур. Але плошча папару тут вышэй і дасягае 22,1%, як і ў другіх непалескіх раёнах, плошча залежы наадварот мізэрна. Гэтым ральніцтва дадзенага раёну адрозьніваецца ад таго, што мы бачылі ў III раёне.

У пасевах жыта займае 40,5%, авес—16,4%, грэчка 8,5. Пад бульбаю тая-ж плошча, што і ў другіх, раней апісаных раёнах,—14,7%.

Колькасьць вывазімага гною (1007 пудоў на дзесяціну) тут вышэй, чымся ў шэрагу другіх раёнаў, па вышыне ўраджаяў ён стаіць на другім месцы, уступаючы толькі VII інтэнсыўна-травапольнаму раёну: ураджаі жыта тут дасягаюць у сярэднім 49,8 пудоў, бульбы 572,4 пуды на дзесяціну.

Жывёлагадоўля. Па колькасьці ўсіх відаў жывёлы на 100 душ насельніцтва апісваемы раён займае першае месца, па колькасьці жывёлы на 100 дзес. с.-гасп. плошчы ён, наадварот, стаіць на апошнім месцы. Найбольш нізкі, у параўнаньні са ўсімі другімі раёнамі, процант кароў і наадварот, высокі процант маладняку падкрэсьлівае экстэнсыўны характар і мясны напрамак мывёлагадоўлі гэтага раёну.

Аднак, па сярэдней вазе кароў і ў асаблівасьці ўдойнасьці ён стаіць далёка не на апошнім месцы.

Кармавое пытаньне. Плошча сенажаці займае ў раёне 20—22%, выганаў 6%. Сенажаці па свайму характару на 84,2% балотныя, 6% заліўныя і 9% мурожныя. Ураджайнасьць балотных сенажацяў 63 пуды. Процант двароў, якія адчуваюць штогодна недахоп кармоў, тут найбольш нізкі—38,0. Цэны на сена вясной 1927 году яшчэ ніжэй,

чым у папярэднім раёне (60 кап. балотнае сена і 1 р. 20 коп. мурожнае), арендная плата за сенажаць найбольшь нізкая—7 р. 60 к.

Меліарацыі. Процант забалочанасьці раёну высокі—27,9%. Балоты пераважна адкрытыя махавыя, травяныя (69,6%) і за выключэньнем 27% скарыстоўваюцца пад сенажаць і выган. Акрамя таго, тут найбольш высокі, у параўнаньні з другімі раёнамі, процант мокрых сенажацяў (70,4), процант двароў, якія косяць сена ў вадзе (88,3).

Процант вымачак пасеваў—3,41, выганаў, недаступных жывёле вясною—20,3; 19% усіх абсьледаваных паселішч маюць дарогі, па якім нельга праехаць часьць году. Асушальныя канавы маюцца на землях 40% абсьледаваных паселішч і ў 57% апытаных двароў. Прыбытковасьць балотных сенажацяў да асушэньня—13,82 руб.; пасьля асушэньня—23,37 руб.—найбольш нізкая ў параўнаньні са ўсімі другімі раёнамі.

Капітала-інтэнсыўнасьць і прыбытковасьць. Па капіталаінтэнсыўнасьці раён стаіць на адным з апошніх месц (36,18 руб. на 1 дзес. ўсёй зямлі і 40,66 руб. на 1 дзес. удобнай плошчы); па разьмерам валавой прыбытковасьці на дзесяціну—на апошнім месцы (54,52 руб. на 1 дзес. ўсёй зямлі і 61,27 р. на 1 дзес. удобнай плошчы).

Па складу валавога прыбытку, ральніцтва ў параўнаньні з другімі раёнамі, займае невялікае месца (43,7%), наадварот, частка прыбытку ад буйнае рагатае жывёлы (23,4%), а таксама ад сьвінагадоўлі (17,3%) вышэй чым у ваўсіх другіх раёнах.

Заключэньне. Апісваемы раён зьяўляецца адным з самых экстэнсыўных, з параўнальна разьвітым мяса-жывёлагадоўчым напрамкам гаспадаркі. У кармавых адносінах ён знаходзіцца у ўмовах найбольш добрых, чым другія раёны, аднак ўмовы уборкі сенажаці, характар іх і. г. д. патрабуюць правядзеньня экстэнсыўных меліарацый. Трэба аднак, сказаць, што часткі гэтага раёну ў напрамку на Слуцак, асабліва часткі Старадарожскага і Старабінскага раёнаў, прадстаўляюць малюнак больш інтэнсыўнай гаспадаркі і падрыхтаваны да правядзеньня больш інтэнсыўных меліарацый.

VII. Балотна-лугавы, інтэнсыўна-травапалёвы мэліарацыйны раён. (Слуцкі, Копыльскі і Грэскі адміністрацыйныя раёны).

Ральніцтва. VII Меліярацыйны раён, які займае паўночна-заходнюю частку Слуцкае акругі (цяпер большай сваёй часткаю, акрамя Слуцкага раёну, знаходзіцца у граніцах Менскае акругі), зьяўляецца адным з найбольш інтэнсыўных па арганізацыі сваей гаспадаркі, у прыватнасьці ральніцтва. Колькасьць ворнай зямлі тут даволі высокая, хоць не найбольш высокая сярод другіх разгледжаных намі ўжо раёнаў (да 50%).

Трохпалёвая сыстэма ральніцтва ў дасьледваных гаспадарак адсутнічае, пад папаром ўсяго 5,8%, пад канюшынаю—17,4%. Усё гэта паказвае на наяўнасьць зусім правільнае многапалёвае сыстэмы, а калі яна яшчэ і не ўстанавілася, то на пераход да яе. Процант пасеваў к пахаці больш высокі—82,0, жыта займае ўсяго 35,1%. Вялікі процант аўса (20,4), грэчкі мала (3,4) бульбы таксама некалькі менш, чым у другіх раёнах (11,4%) Вываз гною—1049 пудоў, ураджай жыта найбольш высокі ў параўнаньні з ўсімі другімі раёнамі—56,3 пуды, бульбы 597 пудоў.

Жывёлагадоўля. Арганізацыя жывёлагадоўлі носіць больш экстэнсыўны характар. Колькасьць розных відаў жывёлы, акрамя авец і на 100 душ насельніцтва і на 100 дзесяцін с. гасп. плошчы ніжэй, чым у шэрагу другіх раёнаў. Процант кароў у гурце (57,5) таксама ніжэй, чым, напрыклад, у прыдняпроўскіх раёнах. Але жывая вага каровы (15,6 пуда) і гадавыя ўдоі (31,1 пуд.) самыя высокія, такім чынам якасна жывёла вышэй.

Кармавое пытаньне. Плошча сенажаці займае 20—25%, выганаў—4,5%. Сенажаці на ²/₃ балотныя, адна трэць мурожных. Збор сена

балотных сенажацяў нізкі—52 пуды, з мурожных—67 пудоў. Арэндныя цэны на сенажаці таксама не высокія—12 р. 50 к., цэны на сена вясной 1926 года ў параўнаньні з другімі раёнамі самыя нізкія (балотнае—44 кап., мурожнае—1 руб.).

Меліарацыі. Плошча нягожых зямель невысокая (22,6%): Балоты амаль усьцяж прадстаўляюць адкрытыя травяна-махавыя, пры чым за выключэньнем 3,7% яны ўсе скарыстоўваюцца, галоўным чынам, як сенажаць (64,5%). Такого вялікага скарыстаньня балот мы ў другіх раёнах не сустракалі. Процант мокрых сенажацей—28,5 па вадзе ўбіраюць сена—38,8% апрошаных двароў. У трэцьцяй частцы паселішч маюцца канавы (ў 52,4% апрошаных гаспадарак). Валавая прыбытковасьць балотных сенажацяў да асушэньня 20,09 р., пасьля асушэньня—29,15 руб.

Капітала-інтэнсыўнасьць і прыбытковасьць. Па капіталаінтэнсыўнасьці раён уступае першае месца толькі I (лугава-мурожнаму) раёну. Разьмер капіталаў на 1 дзес. усей зямлі тут 65,31 руб. на 1 дзес. удобнай плошчы—65,68 руб.

Па прыбытковасьці ён стаіць нароўне з першым раёнам 110,46 р. на 1 дзес. усей зямлі і 111,09 на 1 дзес. удобнай плошчы. Па складу прыбытку ён таксама сходны з I раёнам з той розьніцаю, што тут частка прыбытку ад буйнае рагатае жывёлы і сьвінагадоўлі вышэй.

Заключэньне. Характарыстыка раёну як інтэнсыўна травапалёвага паказвае, што тут вырашэньне кармавога пытаньня ідзе ў значнай меры па шляху палявога травасеяньня. Аднак наяўнасьць балот, якія амаль цалкам скарыстоўваюца пад сенажаці і выганы, і высокая, параўнальна, інтэнсыўнасьць гаспадаркі, паказваюць на рацыянальнасьць разьвіцьця тут інтэнсыўных меліарацый з культуртэхнічнымі мераприёмствамі і на дастатковую падрыхтаванасьць гаспадаркі раёну да правядзеньня такіх меліарацый.

III.

Азнаёміўшыся з асаблівасьцямі аддзельных меліарацыйных раёнаў у адносінах пытаньняў арганізацыі сельскае гаспадаркі, зьвязаных так ці іначай з меліарацыяй зямель, зробім вынік характарыстыкі галоўных галін гаспадаркі па ўсіх меліарацыйных раёнах у цэлым.

Ральніцтва. Параўнальнае значэньне ральніцтва ў гаспадарцы асобных раёнаў можна бачыць па-перш усяго з наступных лічбаў, якія паказваюць ступень разворанасьці ў гэтых раёнах.

ПРОЦАНТ ПАХАЦІ	Меліярацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Па зем. вучоту 1925 г.	38	35	18	40	17	26	43
Па с. г. перапісу 1917 г.	39	35	23	30	23	25	42
У паселішчах дасьледаваных экспэдыцыяю	57,5	51,1	36,4	55,5	47,9	32,3	49,9

У табліцы гэтай прыведзены дадзеныя аб проценту пахаці з трох крыніц: а) зямельнага вучоту, які быў праведзен у 1925 г. Акрземуправленьнямі, б) даных сельска-гаспадарчага перапісу 1917 году, пералічаных у межах акруг, в) матар'ялаў экспэдыцый (паселішчнага апросу). Апошняя крыніца дае больш высокія лічбы воранае зямлі, што нату-

ральна, калі прыняць пад увагу, што тут процант пахаці вылічан да земляў дасьледаваных паселішч у склад якіх не ўвайшла лясная (дзяржаўныя лясы) плошча. Аднак, калі мы ўгледзімся ў хістаньне лічбаў па аддзельных раёнах, то ўбачым, што яно больш ці менш аднолькава ў ваўсіх трох радох, што між іншым даказвае дастатковую рэпрэзантаціўнасьць даных экспэдыцыі (якія носяць выбарачны характар, у той час, як першыя два рады адносяцца да ўсяе тэрыторыі.)

Разглядаючы прыведзеную табліцу прыкмячаем, што найбольш высокі процант воранае зямлі ў I, II, IV і VII раёнах, якія займаюць пераходную ад Палесься да центральнае Беларусі паласу Бабруйскае і Слуцкае акруг. Асобае становішча займае V раён, дзе па даным Акрза і перапісу 1917 году процант пахаці нізкі, па матар'ялам экспэдыцыі—высокі. Тлумачыцца гэта большаю лесістасьцю раёну (50%), на што паказвалася вышэй. Такім чынам, што ясна відна на картаграме I, раёны якія займаюць паўночную палосу Бабруйскае і Слуцкае вакруг і заходнюю, прдняпроўскую частку, маюць высокі процант разворанасьці сялянскіх зямель (50-60%). Наадварот паўднёвыя, палескія III і IV раёны маюць нізкі процант разворанасьці сялянскіх зямель (каля трэцьцяе часткі).

Картаграма 1.



Процант разворанасьці сялянскіх зямель.

Арганізацыя ральніцтва характарызуецца наступнаю табліцаю:

Прыметы арганізацыі ральніцтва	Меліярацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Процант засеву да пахаці	74,0	73,5	70,1	74,0	74,0	76,0	82,0
Процант папару	22,7	24,8	13,5	22,7	23,7	22,1	16,7
Процант залажы	1,74	7,0	17,1	5,1	8,4	14,7	10,9
Процант гаспадарак з трохпалёўкаю .	59,8	65,2	11,7	59,2	58,8	17,9	—

У гэтай табліцы першыя тры рады лічбаў вылічаны па матар'ялам вясеньняга выбарачнага дасьледваньня Ц. С. У. 1925 году [1]), апошняя строчка—па матар'ялах падворнага апросу, экспэдыцыі. Прыведзеныя лічбы паказваюць, што процант пасеву у ваўсіх раёнах амаль аднолькавы і хістаецца ад 73 да 76 процантаў ад плошчы пахаці; выключэньне састаўляюць III раён (палескі) з пасевам 70% ад пахаці і VII інтэнсыўна-травапалёвы, дзе пасеў займае 82% пахаці. У ваўсякім выпадку мы бачым, што ў большасьці раёнаў пасевам заняты 3/4 пахаці. Такім чынам клясычнага трохпольля мы нідзе не сустракаем. Сапраўдная плошча папару ў большасьці раёнаў займае 22—25%. У III раёне процант папару нізкі, але ён кампэнсыруецца высокім процантам залежы, ў VII раёне наадварот процант папару нізкі і залежы мала; тут мы маем раён, які цалкам ужо мінаваў стадыю трохпалёвай папаровай сыстэмы і які знаходзіцца ў працэсе складваньня новых устойчывых сыстэм. Апошняя строчка паказвае ступень распаўсюджваньня трохпольля. Лічбы гэтыя паказваюць, што трохпалёвая сыстэма земляробства ахватвае тут ў лепшым выпадку 2/3 дасьледаваных гаспадарак (II раён) і апускаецца ў трэцьцім раёне да 11,7%, а ўVII да 17,9%.

Наступнае пытаньне, якое мы разгледзім ў гэтым аддзеле—прапорцыя культур. Беручы галоўныя культуры, атрымоўваем наступнае:

РАЁНЫ	Процант да пасяўной плошчы				
	Жыта зім	Авёс	Грэчка	Бульба	Канюшына
I	38,9	12,4	10,8	15,9	1,9
II	42,4	9,5	10,5	15,2	2,3
III	46,6	9,5	10,3	14,7	1,2
IV	44,8	11,0	9,8	14,6	2,0
V	39,0	18,6	5,6	14,6	3,5
VI	40,5	16,4	8,5	14,7	2,6
VII	35,1	20,4	3,4	12,4	17,4

У гэтай табліцы ў сувязі з сказаным вышэй, трэба падкрэсьліць высокі процант канюшыны ў VII раёне; ў астатніх раёнах травасеяньне пакуль што ня мае значнага распаўсюджваньня. Астатнія культуры распаўсюджаны больш-менш аднолькава, але на гэтым агульным фоне зьвяртае ўвагу паніжэньне проценту жыта ў VII раёне, а таксама павялічэньне проценту аўса і зьмяншэньне грэчкі па напрамку к захаду.

У заключэньне застановімся на дадзеных, якія сабраны экспэдыцыяй, аб увале гною і ўраджаях.

		Меліарацыйныя раёны						
		I	II	III	IV	V	VI	VII
Вывезена пудоў гною ў сярэднім на 1 дзес. усіх культур		1510	975	987	1050[2])	948	1008	1050
Ураджаі ў пуд. з дзес.	Жыта	43,6	35,8	38,1	37,3	39,0	49,8	56,3
	Бульбы	479	431	481	454	422	572	497

[1]) Толькі процант пералогу ў VI раёне ўзяты з матар'ялаў паселішчнага дасьледваньня экспэдыцыі, з-за малое праўдападобнасьці лічбы ЦСУ для гэтага раёну (0,3%), адпаведным чынам патрэбна панізіць процант пасеву ці папару у гэтым раёне.

[2]) Па Бабруйскаму I раёну.

Тут мы і ў адносінах вывазу гною і ў адносінах ураджаяў прымячаем характэрны малюнак. Крайнія флангі—самы ўсходні і самы заходні раён зьбліжаюцца і даюць найбольш высокі выvаз гною (калі нават лічыць лічбу I раёну некалькі павялічанай) і самыя высокія ўраджаі. Калі падзяліць усе раёны па вялічыне ураджаю на тыя, якія даюць ураджай жыта менш 40 пудоў, ад 40 да 50 пудоў і 50 і больш, то акруга падзеліцца, як гэта мы бачым на картаграме 2, на тры няроўных часткі з найбольш інтэнсыўнай ахварбоўкай на захадзе, а таксама і ў паўднёва-ўсходнім кутку.

Картаграма 2.

Сярэдні ураджай жыта з дзесяціны.

Жывёлагадоўля. У характарыстыцы жывёлаводзтва мы перш за ўсё, застановімся на колькасьці розных відаў жывёлы на 100 чалавек насельніцтва (карыстаючыся для гэтага дадзенымі падворнага выбарачнага дасьледваньня экспэдыцыі).

№№ меліарацыйных раёнаў.	Па падворнаму апытаньню экспэдыцыі. На 100 душ насельніцтва				
	Коняй працоўных	Буйнае рагатае жывёлы	Кароў	Сьвіней усіх	Авечак усіх
I	24,0	46,4	31,3	68,0	74,7
II	20,2	41,2	28,5	49,8	58,4
III	20,4	66,3	42,3	55,0	87,2
IV	19,8	46,7	30,7	56,8	73,0
V	19,7	52,8	34,7	63,0	72,0
VI	20,4	74,7	44,1	70,5	80,4
VII	20,7	52,8	36,4	66,2	81,4

Табліца гэта выдзеляе, як шматскотныя, палескія III і VI раёны, дзе колькасьць буйнае рагатае жывёлы, кароў і авечак на 100 душ насельніцтва найбольш высокая. Калі мы параўнаем гэтую табліцу з

дадзенымі аб сярэдняй колькасьці жывёлы на 1 двор, у пераводзе на буйную, нанесенымі на картаграму 3. (па матар'ялам атрыманым у Ц.С.У. БССР), то убачым, што гэтыя-ж раёны выдзеляюцца колькасьцю і ўсяе жывёлы пры ўмоўным пераводзе на 1 гаспадарку.

Раўняючы картаграму 3 з картаграмаю 1 прыкмечаем, што шматскотныя раёны займаюць як раз тую частку Бабруйска-Слуцкае акругі, дзе найменшая развoранасьць.

Картаграма 3.



Колькасьць усяе жывёлы ў пераводзе на буйную на 1 гаспадарку.

Склад буйнае рагатае жывёлы (па дадзеным вясеньняга выбарачнага дасьледваньня Ц.С.У.) вылічаны па меліарацыйным раёнам, паказан у наступнай табліцы.

Меліарацыйныя раёны.	Процант у стадку		
	Кароў	Маладняку больш 1 году	Цялят
I	63,1	23,3	13,3
II	62,8	21,2	15,0
III	59,2	25,1	13,4
IV	60,0	24,4	15,0
V	60,0	25,1	13,3
VI	53,9	26,0	13,5
VII	57,5	27,2	14,5

Табліца гэта паказвае, што шматскотныя раёны III і VI па складу жывёлы, адрозьніваюцца адносна высокім процантам маладняку і нізкім процантам кароў.

Урэшце аб прадукцыйнасьці жывёлы дае ўяўленьне наступная табл.

	Меліарацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Жывая вага каровы пудоў	12,9	12,5	14,2	12,5	12,5	13,5	15,6
Гадавы ўдой каровы (у пудох)	20,2	18,6	21,5	23,5	21,9	27,9	31,1

Прадукцыйнасьць жывёлы хістаецца па асобным раёнам у незначных граніцах і толькі ў VII і часткаю VI яна значна паднімаецца. *Кармавое пытаньне.* Для параўнаньня меліарацыйных раёнаў у адносінах кармавога пытаньня правядзем перш-заўсё даныя аб адносных разьмерах сенажаці.

Процант сенажаці	Меліарацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Па зямельному вучоту	18,4	11,6	13,9	12,1	8,6	22,4	19,5
Па паселішчнаму дасьледваньню экспэдыцыі	30,4	18,2	18,0	20,3	22,1	20,8	24,2

Тут, як і ў табліцы, якая датычыцца проценту пахаці, разыходжаньне паміж верхнім і ніжнім радам лічбаў тлумачыцца тым, што ў першым выпадку адносіны сенажаці вылічаны да ўсяе тэрыторыі раёну (уключаючы і дзяржаўныя лясы), у другім толькі да плошчы зямель, якія знаходзяцца ў карыстаньні дасьледаваных зямельных вобчастваў паселішч. Натуральна, што другі рад дае больш высокія лічбы. Параўнаючы паміж сабою асобныя раёны прыкмечаем, што найбольш забясьпечанымі сенажацьцю, як і найбольш разворанымі, зьяўляюцца раёны, якія знаходзяцца на крайніх флангах. Вельмі характэрныя рады атрымоўваем пры параўнаньні прыведзеных вышэй дадзеных аб увале гною і процантах сенажаці.

	Меліарацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Процант сенажаці	30,4	18,2	18,0	20,3	22,1	20,8	24,2
Вывезена гною на 1 дзес. пудоў . . .	1510	975	987	1050	948	1008	1050

Калі прыняць пад увагу, што на колькасьць вывазімага на дзесяціну гною робіць уплыў разьмер засеву на гаспадарку, колькасьць і склад жывёлы і інш. фактары, то мы павінны будзем прызнаць, што тут мы маем усё ж даволі падобную зьмену крывой, якая паказвае процант сенажаці і угнойваньня.

Адносныя разьмеры другога віду кармавых угодзьдзяў—выганаў—прыводзяцца ў наступнай табліцы:

Процант выганаў	Меліарацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Па зямельному вучоту	1,3	3,9	1,7	1,2	1,2	6,2	4,5
Па матар'ялам экспэдыцыі паселішч. дасьледваньня	2,4	7,9	11,8	3,1	3,4	19,0	10,5

Прычына больш высокіх лічбаў у другім радзе растлумачана вышэй. Найбольш высокі процант выганаў у палескіх раёнах (па матар'ялах экспэдыцыі). Трэба, аднак, сказаць, што процант выганаў недастаткова яскрава адбівае разьмеры плошчы, якая служыць выпасам для жывёлы, бо, як паказвалася ўжо вышэй, і як відаць з грунтоўных табліц, якія зьмяшчаюцца ў гэтым выпуску, побач з выганамі для выпасу жывёлы ўсюды шырока скарыстоўваюцца сенажаці, пахаць, а таксама лясы і хмызьнякі.

Разгледзім далей склад сенажаці па відах (выдзеляючы тры асноўных яе віды—заліўныя, мурожныя і балотныя).

Меліярацыйныя раёны	Віды сенажаці ў процантах		
	Заліўныя	Мурожныя	Балотныя
I	2,4	64,2	31,2
II	48,8	13,5	37,3
III	20,9	11,9	66,9
IV	1,3	28,4	68,8
V	16,1	43,8	38,0
VI	6,0	8,9	84,2
VII	2,5	31,7	64,3

Табліца гэта паказвае, што за выключэньнем I, II і V раёнаў, дзе пераважваюць мурожныя (I і V), або заліўныя сенажаці (II), у ваўсіх астатніх раёнах галоўнае месца займаюць сенажаці балотныя.

Нанясёныя на карту дадзеныя аб распаўсюджваньні балотных сенажацяў (картаграма 4) паказваюць, што галоўную перавагу балотныя сенажаці маюць у паўднёва-заходняй палове акругі.

Картаграма 4.



Процант балотных сенажацяў.

Зьвесткі аб сбору сена з розных сенажацяў прыведзены ў наступнай табліцы.

Меліарацыйныя раёны	Сярэдні збор сена ў пудах з дзесяціны		
	Заліўнога	Мурожнага	Балотнага
I	136	84	90
II	130	54	64
III	137	65	81
IV	75	58	52
V	140	67	67
VI	125	93	63
VII	101	67	52

Можна заўважыць, што па ўсіх відах сенажацяў, сярэдні збор з дзесяціны памяншаецца, хоць і не зусім правідлова, на захад.

У прыватнасьці балотныя сенажаці, калі не лічыць III раёну, які прадстаўляе выключэньне, даюць найбольш высокія ўкосы, там дзе іх менш, што як відаць, сьведчыць аб наяўнасьці сувязі паміж ступеньню распаўсюджаньня балотных сенажацяў, ці, што тож, ступеньню забалочанасьці сенажацяў і іх якасьцю.

Далей мы сапаставім рад лічбаў, якія паказваюць сярэднія цэны вясной 1926 году на кармы, арэндную плату за сенажаці (у сярэднім усякай якасьці—дэталёва па асобных відах у асноўных табліцах) і процант двароў, у каторых кожны год не хапае корму.

Меліарацыйныя раёны.	Пакупная цана кармоў вясною 1926 г.			Сярэдняя арэндная плата за дзесяціну сенажаці (руб.)	Процант двароў, у якіх не хапае кармоў кожны год.
	Заліўное сена	Балотнае сена.	Салома яравая		
I	1,48	0,85	0,64	24,07	51,2
II	1,7	1,44	0,79	29,40	70,6
III	1,83	1,60	1,04	11,60	44,4
IV	2,06	1,63	1,0	23,27	73,7
V	1,3	1,16	0,9	18,70	72,4
VI	1,2	0,92	0,6	7,60	38,0
VII	1,0	0,74	0,44	12,50	48,1

Ня цяжка заўважыць, што паміж гэтымі паказальнікамі ёсьць вядомая сувязь. Найбольш высокі процант гаспадарак, якія маюць штогодна недахоп кармоў, у IV, V, II і I раёнах, тут жа мы сустракаемся з найбольш высокімі арэнднымі цэнамі на сенажаць, і з больш высо-

кімі цэнамі на кармы. Наадварот, у раёнах VI VII і Ш процант двароў, ў якіх не хапае кармоў—меншы і тут самыя нізкія арэндныя цэны і кармы таней.

Геаграфічна патрэба ў кармох, калі аб ёй судзіць па проценту гаспадарак, ў якіх не хапае кармоў, найбольш рэзка выяўлена ў паўночнаўсходняй палове акругі (гл. картаграму 5), г. зн. зусім наадварот таму, дзе найбольш высокі процант балотных сенажацяў. (Карт. 4).

Картаграма 5.



Процант гаспадарак, у якіх не хапае кармоў.

Урэшце застановімся на пытаньні аб каштоўнасьці выпасаў жывёлы, пры аддачы яе на старану, г. зн. на чужым выпасу.

Плата за выпас галавы (руб.)	Меліарацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Рагатага маладняку	4,65	2,9	3.97	6.12	3,95	4,90	6,0
Авечкі	1,28	0,86	1.24	1,86	1,90	1,14	1,31

Якой небудзь ясна выяўленай правільнасьці хістаньня платы за выпас па асобных раёнах заўважыць нельга, хоць выдзеляюцца I, IV і VII, г. зн. раёны з найбольш высокім процантам сенажаці і разворнасьці (і прыгагодны IV) і значыцца з меншым процантам лясоў.

Меліярацыі. Патрэба асобных раёнаў у меліярацыі зямель перш за ўсё можа быць характэрызована наяўнасьцю нягожых зямель і балот. Што датычыцца нягожых зямель, то гэта рубрыка выдзеляецца пры ўсякіх зямельных перапісах і дасьледваньнях. Плошча балот, наадварот, звычайна не выдзеляецца і веды аб ёй у статыстычных даных аб ужытках адсутнічаюць. У даным выпадку, у ніжэйдаданай табліцы мы пазычаем веды аб проценту нягожых зямель з дадзеных зямельнага вучоту, якія адносяцца, значыцца, да ўсёй тэрыторыі раёна, а веды аб плошчы балот, ці правільней забалочанасьці, як ня раз мы азначалі вышэй, з матар'ялаў экспэдыцыі (паселішчнага апытваньня). Правільней назваць прывадзімыя ніжэй дадзеныя процантам забалоча-

насьці таму, што сюды ўключана ўся зарэгістраваная плошча балот, у тым ліку скарыстоўваемых як сенажаць, выпас і нявыкарыстоўваемыя ў сельска-гаспадарчых мэтах.

	Меліярацыйныя раёны						
	I	II	III	IV	V	VI	VII
Процант нягожых зямель	6,3	16,6	25,9	9,7	10,2	8,8	6,1
Процант забалочанасьці	12,0	20,8	33,3	11,2	17,3	27,9	22,6

Лічбы першага і другога раду ня зусім параўнальны, таму што у першым выпадку ў іх уходзяць плошчы ня толькі балот, але і др. відаў нягожых зямель (галоўным чынам пяскоў), а таксама таму, што яны датычацца да ўсёй тэрыторыі, ў другім-жа выпадку маюцца на ўвазе толькі балоты (скарыстоўваемыя і не скарыстоўваемыя) і аднесяны яны да плошчы зямель, якія знаходзяцца ў карыстаньні дасьледаваных зямельных грамад.

Тым ня менш з параўнаньня гэтых радоў, мы можам зрабіць некаторыя вывады. Па-перш, мы бачым, што процант забалочанасьці ўнутры зямель, якія знаходзяцца ў карыстаньні селян, вышэй проценту нягожых зямель, па-другое, процант забалочанасьці, будучы вышэй проценту нягожых зямель, за выключэньнем VII і часткова VI раёнаў паднімаецца і апускаецца раўналежна з павялічэньнем або памяншэньнем проценту нягожых зямель. Урэшце, мы бачым, што гэты процант забалочанасьці высокі ў ваўсіх раёнах і асабліва III і VI (палескіх).

Разглядаючы картаграму 6, мы можам убачыць, што найменшы процант забалочанасьці (20 і ніжэй) у паўночна-ўсходніх раёнах Бабруйскае акругі, больш высокі (болей 20%) у паўднёва-заходніх.

Картаграма 6.



Процант забалочанасьці зямель.

Матар'ялы экспэдыцыі даюць магчымасьць некалькі асьвятліць пытаньне і аб характару балот — па пераважнаму расьлінnаму пакрову.

У ніжэйпрыведзенай табліцы выдзеляны балоты трох тыпаў: а) пакрытыя лесамі і хмызьняком, б) пакрытыя хмызьняком і асакой, в) пакрытыя мохам, травою і купь'ем.

У процантных адносінах да агульнае плошчы балот суадносіны гэтых відаў балот прадстаўляюцца ў наступным відзе.

Меліарацыйныя раёны	Пакрытых лесам і хмызьняком	Пакрытых хмызьняком і асакою	Пакрытых мохам і травою
I	11,8	42,4	26,5
II	28,1	26,1	30,6
III	16,4	21,0	44,9
IV	7,2	4,0	80,4
V	10,9	24,5	54,2
VI	14,4	18,6	69,6
VII	4,0	0,3	92,8

Зразумела тут ні падзел балот, ні мэтад атрыманьня зьвестак (апытальны) не даюць магчымасьці лічыць гэту табліцу зусім яснай. Тым ня менш, вядомае прадстаўленьне аб пераважным характару балот мы з яе можам атрымаць. Галоўную масу прадстаўляюць, на сялянскіх землях, балоты адкрытыя, нават без хмызьняку, асока-травяныя і мохавыя.

Гэта саўпадае з тою характарыстыкаю балот, якая была дадзена раней на падставе маючыхся матар'ялаў, іх прыродна—гістарычнага вывучэньня. Але па асобным раёнам гэты малюнак вар'іруе. Мы бачым, што галоўным чынам адкрытыя, махавыя і асакава-травяністыя балоты распаўсюджвны на захадзе. На ўсход жа адносна больш хмызьняковых і лясных. Наступнае пытаньне, якое вывучала экспэдыцыя ў адносінах балот, — пытаньне аб іх скарыстаньні. Вынікі, зьведзеныя па маліарацыйных раёнах атрымаліся наступныя:

Меліарацыйныя раёны	Балот			
	Скарыстоўваемых:			Нескарыстоўваемых
	Пад сенажаць	Пад выган	Пад выган і сенажаць	
I	54,2	9,3	5,1	31,3
II	22,5	26,1	14,4	25,8
III	27,0	26,8	19,1	27,1
IV	48,0	7,7	13,0	25,8
V	27,4	4,7	35,3	24,4
VI	40,4	7,0	32,5	27,6
VII	64,5	7,7	24,0	3,7

Тут зьвяртае ўвагу ўстойчывасьць лічбаў ў апошнім раду. У ваўсіх раёнах процант нескарыстоўваемых (для сельскае гаспадаркі) балот вар'іруе ў невялікіх граніцах ад 24 да 27%. Толькі ў I раёне ён некалькі вышэй і ў VII—рэзка падае. Болей высокі процант нескарыстоўваемых балот у I раёне знаходіцца відавочна з перавагаю тут сухадольных сенажацяў, займаючых тут параўнальна вялікую плошчу. У VII раёне, наадварот, пераважваньне маюць балотныя сенажаці і высокі процант скарыстоўваемых балот знаходіцца тут у безумоўнай сувязі з параўнальна высокай інтэнсыўнасьцю гаспадаркі наогул. Што датычыца характара скарыстоўваньня балот, то як відаць з табліцы, галоўным чынам, імі і карыстаюцца як сенажацямі, радзей як выганамі, пры чым часта той і другі від карыстаньня на адным і тым жа балоце існуе адначасова і падразьдзяліць іх нельга. Акрамя балот, паказальнікамі ўшчэрбу які прычынаецца гаспадарцы збыткам вільгаці, могуць служыць наступныя прыметы: процант вымакаемага пасеву, процант мокрых сенажацяў, процант выганаў недаступных вясною для жывёлы. Аб ступені шкоды, якая прыносіць гаспадарцы забалочанасьць сенажацяў, можна судзіць па распаўсюджанасьці выпадкаў, калі сенажаць убіраецца на вадзе.

У асноўных табліцах, у сувязі з гэтым, асьвятлён шэраг дадатковых пытаньняў аб умовах уборкі такіх пакрытых вадою і мокрых сенажацяў, тут мы абмяжуемся тым, што прывядзём процант гаспадарак (з апытаных), якія ўбіраюць сенажаць па вадзе і колькасьць сена, якое гніе на лугу. Наступнае пытаньне, якое адносіцца сюды-ж – пытаньне аб шляхох зносін. Ніжэй мы прыводзім зьвесткі аб проценту паселішч, з ліку дасьледаваных, у якіх прасёлачныя дарогі частку году бываюць непраезжымі.

У рэшце, сюды-ж мы далучым дадзеныя аб проценту пасеваў, якія заносяцца пяскамі, прычыняючымі сельскай гаспадарцы не малую шкоду. У выніку табліца пералічаных паказацеляў шкоды, якая прычыняецца сельскай гаспадарцы балотамі і пяскамі, па меліярацыйных раёнах прыме наступны від.

Меліярацыйныя раёны	Процант пасеву		Процант мокрых сенажацяў	Процант двароў у якіх частка сена гніе ў пакосах	У сярэднім прападае пудоў на двор	Процант выганаў, якія недаступны вясною для жывёлы	Процант паселішч з непраезжымі частку году дарогамі
	Які вымакае	Які занесяны пяском (за 2 г.)					
I	3,58	0,13	10,4	22,1	18,0	34,0	14,3
II	2,91	2,31	29,1	58,5	16,2	16,0	25,9
III	2,60	2,48	55,5	56,5	26,1	4,5	13,0
IV	1,20	0,39	21,7	13,8	19,5	63,3	6,7
V	7,0	0,33	36,0	24,1	16,0	30,1	5,9
VI	3,41	3,32	70,4	44,8	30,9	20,3	19,3
VII	1,06	—	28,0	24,5	17,5	3,9	—

У сувязі з раней сказаным, зьвернем у гэтай табліцы ўвагу перш за ўсе на процант мокрых сенажацяў, які зьяўляецца даволі паказальным для ступені забалочанасьці раёнаў наогул.

Калі нанесьці гэтыя дадзеныя на карту (картаграма 7), атрымаем адначасова даволі ясны малюнак забалочанасьці раёнаў, у прыватнасьці сенажацяў, найбольш высокую ў палескіх і заходніх раёнах. Наступны рад, які паказвае процант двароў, якія убіраюць сенажаць па вадзе, мае даволі блізкую раўналежнасьць з процантам мокрых сенажацяў.

Прападаньне сена ад вады, паказанае далей у табліцы, як бачым даволі высокае, асабліва ў палескіх раёнах, дзе яна дасягае 26-30 пудоў на двор.

Картаграма 7.



Процант мокрых сенажацяў.

Высьвятленьне проценту вымачак і заносаў пяском, прадстаўляе складаную задачу, з прычыны цяжкасьці адказаць на гэтае пытаньне для саміх сялян. Тым ня менш, атрыманыя лічбы даюць уяўленьне аб значнасьці зробленае такім шляхам шкоды ральніцтву і ўсей сельскай гаспадарцы.

Далей разгледзім лічбы, якія сьведчаць аб разьмеру праведзеных меліярацый.

Меліарацыйныя раёны	Процант паселішч з асушальнымі канавамі	Процант двароў з асушальнымі канавамі	Процант плошчы на якой праводзіліся канавы да плошчы маючыхся балот
I	100,0	49,7	53,31
II	19,0	24,6	40,24
III	28,0	59,0	24,41
IV	12,0	51,3	44,93
V	26,0	47,2	59,34
VI	40,0	57,0	32,05
VII	30,0	52,3	54,43

Табліца гэтая сьведчыць аб даволі значным распаўсюджваньні меліарацый, праўда, экстэнсыўных, якія ажыцьцяўлены, пры тым, як відаць з асноўных табліц, у значнай меры сялянствам.

Тут прыведзены тры паказальнікі ступені распаўсюджанасьці меліарацыі: а) процант паселішч, у якіх маюцца асушальныя канавы, б) процант двароў (з апытаных) на зямельных вучастках каторых маюцца такія канавы і нарэшце в) процантная адносіна плошчы, на якой пракопаны канавы, да агульнае плошчы маючыхся балот.

Найбольш цікавым і паказальным зьяўляецца апошні прызнак. Даволі цяжка назваць плошчу, на якой пракопаны канавы, асушанаю, таму што гэта не заўсёды мае месца і вельмі часта плошча з асушанымі канавамі лічыцца, і праўдзіва, балотам.

Па гэтаму адносіны плошчы, на якой маюцца канавы да агульнае плошчы балот, сьледуе разумець не як адносіну асушанае да не асушанае плошчы, а як нейкі ўмоўны коэфіцыэнт, які паказвае адносіну плошчы, на якой праводзілася асушэньне да ўсяе наяўнае балотнае плошчы. Адносіна гэта зьяўляецца для паасобных раёнаў вельмі характэрнаю. Нанесяныя на карту (Картаграма 8) адпаведныя лічбы да вядомай ступені паказваюць распаўсюджваньне асушальных меліарацый па асобных раёнах.

Картаграма 8.



Процант плошчы, на якой праводзіліся канавы да плошчы ўсіх балот.

У заключэньне застановімся на пытаньні аб выніках праведзеных меліарацый у сэнсе падняцьця прыбытковасьці асушаных балот (балотных сенажацяў). Пытаньне гэтае вельмі вялікае і складае задачу спэцыяльных дасьледваньняў, якія выконваюцца на падставе сабраных экспэдыцыяю матар'ялаў. У даным выпадку мы застановімся на ім так, як яно адбіваецца сабраным статыстычным матар'ялам, не падлягаючы яго ні якому аналізу ў мэтах некаторага параўнаньня меліарацыйных раёнаў ў гэтых адносінах. Прывадзімыя ніжэй лічбы атрыманы шляхам множаньня атрыманых у выніку апытаньня лічбаў аб укосах сена з адзельных балот, да і пасьля асушэньня на цану іх. Пры ўстанаўленьні цаны ставілася пытаньне, як тлумачылася вышэй, аб тым, колькі, па цэнам 1926 году (момант апытаньня), каштаваў пуд такога сена, якое накошвалася на балоце да яго асушэньня, і колькі каштуе пуд такога сена,

якое накошваецца цяпер. Вынікі, якія паказваюць агульную прыбытковасьць дзесяціны атрымаліся наступныя:

Меліярацыйныя раёны	Агульная прыбытковасьць дзесяціны асушанае балотнае сенажаці (руб.)	
	Да асушэньня	Пасьля асушэньня
I	6,41	26,14
II	29,29	37,10
III	25,13	38,68
IV	40,20	37,78
V	27,51	33,41
VI	13,82	23,37
VII	20,09	29,15

Табліца гэта сьведчыць аб тым, што паўсюды (за выключэньнем IV раёну, што адмячалася пры апісаньні гэтага раёну), агульная прыбытковасьць на большую ці меншую вялічыню паднялася. Наносячы лічбы, якія паказваюць высату агульнае прыбытковасьці дзесяціны асушаных балот (сенажаць), на карту, атрымоўваем картаграму 9, якая паказвае, што найбольш высокая прыбытковасьць атрымоўваецца з гэтых плошчаў у групе цэнтральных раёнаў Бабруйскае акругі.

Картаграма 9.



Прыбытковасьць дзесяціны балотнае сенажаці пасьля асушкі.

Капітала-інтэнсыўнасьць і прыбытковасьць. Нам застаецца разглядзець апошні аддзел з намечаных, а іменна аддзел аб выдатках і прыбытках сельскае гаспадаркі.

Тое, што мы ў даным выпадку бяром за паказальнік разьмеру выдаткаў, а іменна разьмеры капіталаў на гаспадарку і адзінку плош-

чы, ў сапраўднасьці ўсіх выдаткаў не ахоплівае, але адбівае хістаньні іх па аддзельных раёнах і характарызуе ступень інтэнсыўнасьці гаспадарак. Бяром мы гэты паказальнік таму, што разьмяркоўваем ім, па параўнаўча большаму ліку гаспадарак. Параўнаючы раёны па разьмерах ўсіх капіталаў на гаспадарку і адзінку плошчы, атрымоўваем наступную табліцу:

Меліярацыйныя раёны	Лік гаспадарак	Усіх капіталаў прыходзіцца на:		
		Адну гаспадарку	Адну дзесяціну ўсяе зямлі.	Адну дзесяціну гожае зямлі.
I	9	1109,84	130,34	135,51
II	28	881,99	94,15	105,70
III	18	860,83	96,22	103,32
IV	12	906,50	81,80	89,45
V	25	827,83	89,86	96,65
VI	14	780,10	65,93	74,08
VII	8	1196,56	119,83	120,51

Праглядаючы гэтую табліцу замячаем, што як адмечалася ужо, пры апісаньні асобных раёнаў, найбольш высокі разьмер грунтоўных выдаткаў як на адзінку плошчы, так і на гаспадарку ў I і VII раёнах. Тое-ж самае атрымаецца, калі мы выключым з грунтоўных выдаткаў каштоўнасьць будынкаў.

Меліярацыйныя раёны	Капіталаў без будынкаў прыходзіцца на:		
	Адну гаспадарку	Адну дзесяціну ўсей зямлі	Адну дзесяціну гожае зямлі
I	658,66	77,35	80,42
II	445,92	47,60	53,44
III	458,61	51,26	55,05
IV	376,92	34,01	37,19
V	438,85	47,63	51,23
VI	428,20	36,18	40,66
VII	652,20	65,31	65,68

У гэтай табліцы таксама выдзяляюцца I і VII раён, акрамя таго, тут ясьней абазначана слабая капіталаінтэнсыўнасьць палескіх раёнаў (III і IV), што можна бачыць на картаграме 10.

Картаграма 10.

Капіталаў (без будынкаў) прыходзіцца на 1 дзесяціну ўсёй зямлі.

У заключэньні застановімся на характарыстыцы разьмераў і складу агульнае прыбытковасьці.

Меліарацыйныя раёны	Усяго агульнага прыбытку прыходзіцца на: 1 гаспадарку	1 дз. ўсяе зямлі	1 дзес. гожае зямлі	На 100 рублёў ўсяго агульнага прыбытку прыходзіцца рублёў ад:Ральніцтва	Лугаводзтва	Буйнае рагатае жывёлы	Аўчарства	Сьвінагадоўлі	Лік гаспадарак
I	912,04	107,11	111,36	56,94	6,91	15,73	2,54	8,61	9
II	671,51	71,68	80,48	54,08	11,64	15,54	2,60	10,76	28
III	651,38	72,80	78,19	45,96	12,83	20,98	2,09	9,50	18
IV	748,20	67,51	73,82	58,08	7,86	19,43	2,76	6,13	12
V	609,96	66,21	71,21	54,05	10,44	15,74	3,33	10,27	25
VI	645.18	54,52	61,27	43,68	11,61	28,39	1,57	17,32	14
VII	1108,0	110,46	111,09	54,05	7,25	19,82	1,87	11,25	8

Табліца гэта паказвае, што найбольш высокая агульная прыбытковасьць на адзінку плошчы атрымоўваецца ў раёнах з найбольшаю капіталаінтэнсыўнасьцю (I і VII, гл. картаграму II).

Картаграма 11.



Усяго прыбытку на 1 дзес. гожае зямлі.

Што датычыцца складу прыбытку, то ў ваўсіх раёнах галоўнае месца займае ральніцтва, але у палескіх яно дае менш паловы ўсяе агульнае прыбытковасьці, а ў ваўсіх астатніх—болей паловы (картаграма 12).

Картаграма 12.



Прыбытак ад ральніцтва ў процантах да ўсяго прыбытку.

Наадварот доля лугаводзтва і буйнае рагатае жывёлы ў агульным прыбытку палескіх раёнаў вышэй, чым у другіх; акрамя таго доля лугаводзтва пераўнаўча высокая ў II раёне прыдняпроўскім і V (гл. картаграму 13).

Картаграма 13.



Прыбытак ад лугаводзтва ў процантах да ўсяго.

Наадварот доля буйнае рагатае жывёлы, акрамя палескіх, найбольш высокая ў IV і VII (інтэнсыўна-травапольным; гл. картаграму 14).

Картаграма 14.



Прыбытак ад буйнае рагатае жывёлы ў %% ад усяго

Што датычыцца аўчарства і сьвінагадоўлі, то можна замеціць да некаторай ступені абаротны напрамак значэньня гэтых галін гаспадаркі ў агульным прыбытку па раёнах: аўчарства, якое наогул гаворачы, дае невялікую долю прыбытку, мацней прадстаўлена у ўсходніх раёнах, сьвінагадоўля, якая, наадварот, дае значную долю прыбытку, мацней прадстаўлена ў заходніх раёнах.

На гэтым мы скончым характарыстыку меліарацыйных раёнаў Бабруйска-Слуцкае акругі і характарыстыку паасобных галін гаспадаркі па гэтых раёнах. Па характару задачы, якая адносіцца толькі да аднаго з відаў, хоць і важных, мерапрыемстваў па разьвіцьцю вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы, а таксама па мэтаду дасьледваньня, якое насіла выбарачны характар, характарыстыка гэтая не магла быць вычэрпываючаю. Для поўнага меркаваньня аб задачах у галіне меліярацый і найбольш рацыяльнальных спосабах іх разьвязваньня па меліарацыйных раёнах і іх злучнасьцям, неабходна прыцягненьне ўсіх матэр'ялаў, сабраных экспэдыцыяю, а таксама распрацоўкі пытаньня аб рэнтабельнасьці меліарацый па раёнах, што будзе зроблена пасьля распрацоўкі ўсіх матар'ялаў, сабраных экспэдыцыяю па Беларусі, бо відавочна, што рашэньне гэтых пытаньняў можа мець параўнальны характар, але на падставе ўжо выкладзенага, мы лічым магчымым прапанаваць рашэньне аднаго пытаньня—іменна аб ступені інтэнсыўнасьці меліарацый па раёнах Бабруйска-Слуцкае акругі. Калі злучыць ўсе віды асушальных меліарацый ў тры групы, а іменна:

I. Слаба-інтэнсыўныя (экстэнсыўныя)—рэгуляваньне рэк і праложваньне магістральных асушальных канаў.

II. Сярэдня-інтэнсыўныя—праложваньне асушальнае сеткі з павярхоўнымі палепшаньнямі.

III. Сільна-інтэнсыўных—устройства деталёвае асушальнае сеткі з правядзеньнем каранных культур-тэхнічных палепшаньняў, то ўсе раёны па патрэбе і гаспадарчай падрыхтованасьці іх да правядзеньня тых ці іншых меліарацый, могуць быць падзелены наступным чынам (картаграма 15).

Картаграма 15.



Групы раёнаў па ступені інтэнсыўнасьці мэліарацый.

I група—III і VI раёны.
II група—II, IV і V раёны.
III група—I і VII раёны.

Само сабою разумеецца, што аднясеньне таго ці іншага раёну да аднае з паказаных груп не выключае магчымасьці і неабходнасьці правядзеньня ў кожным з іх усіх відаў меліарацыйных мерапрыемстваў але адмячае пераважнае значэньне тае ці іншае групы мерапрыемстваў ў асобных частках вывучаемых намі акруг.

Проф. Н. С. Фролов

Мелиоративные районы Бобруйского округа.

Установление мелиоративных районов представляет одну из задач предпринятых НКЗ БССР экспедиционных обследований по вопросам экономики мелиораций. Потребность в таком районировании вытекает из необходимости с одной стороны вести дальнейшую разработку материалов экспедиции в пределах территорий более или менее однообразных в мелиоративном отношении, с другой—связана с вопросом об организации районной мелиоративной службы и имеет практическое значение.

Вопрос о методологии мелиоративного районирования в литературе не разработан, но очевидно, что особенности в задачах и характере мелиораций по отдельным частям территории зависят от таких природных факторов, как климатические и гидрологические условия и характер неудобных земель с одной стороны, и от таких экономических признаков, как интенсивность хозяйства—в первую очередь—с другой.

Общая картина природных условий Бобруйского и б. Слуцкого округов—много осадков, равнинный (или слабо волнистый) рельеф, сеть плохо дренирующих рек, с значительными заболоченными поймами, минеральные грунты—пески, иногда суглинки и между ними болота осоково-кустарниковые, кустарниковые и лесные с гипновым, или дальше от речных долин, сфагновым моховым покровом. На этом общем фоне выделяется южная полесская часть, к западу от Березины и к югу от линии Бобруйск-Любань или даже Бобруйск-Слуцк, где все эти особенности выражены сильнее, и северные и северо-восточная (за Березиной), где они представлены слабее. Такая характеристика природных условий, основанная на разборе имеющихся литературных данных, (Е. В. Оппоков, Я. Н. Афанасьев, В. Г. Касаткин, В. С. Доктуров, Н. Н. Жуков, Н. М. Савич и др.), позволяет и в мелиоративном отношении выделить на территории Бобруйского округа две полосы или два крупных района: Полесский, куда входят юго-западные административные районы Бобруйского округа (Паричский и Глусский) и южные районы Слуцкого округа—Любаньский и Старобинский и переходную полосу к центральной части Белоруссии, охватывающую остальные административные районы округа.

Обе эти части, из которых северная имеет протяжение с запада на восток по прямой линии свыше 250 километров, делятся на несколько речных бассейнов, расположенных в разных климатических и почвенных районах и неоднородных на своем протяжении в экономическом отношении. Недостаток сведений о микро-климате и микро-рельефе вынуждает нас в дальнейшем перейти к изучению отдельных административных районов, входящих в ту и другую часть, исключительно по признакам хозяйственно-экономическим. Пользуясь материалами, собранными при экспедиционном обследовании, вычисляем следующие показатели:

I. **Полеводство:** процент пашни, посева к пашне, залежи, процент хозяйств с трехпольем, пропорция главнейших культур (рожь озимая, овес, гречиха, картофель, клевер), вывоз навоза, высота урожаев ржи и картофеля.

II. Животноводство: количество разных видов скота на 100 душ населения, состав стада, живой вес и удой коров.

III. Кормовой вопрос: процент сенокоса и выгона, состав сенокоса по видам, сбор с сенокосов разного вида, цены на корма, арендные цены на сенокос, стоимость выпаса скота.

IV. Мелиорации: процент неудобных земель, процент заболоченности, состав болот по растительному покрову, виды использования болот, вымочки, заносы песком, гниение сена на покосах, недоступность пастбищ, распространенность осушения, валовой доход с осушенных сенокосов.

V. Капитало-интенсивность и доходность: размер капиталов на хозяйство и на площадь, размер валового дохода на хозяйство и на площадь, состав валового дохода по отраслям хозяйства.

Сравнивая полученные показатели (см. таблицы и картограммы в тексте) получаем возможность разделить весь Бобруйский (и б. Слуцкий) округа на следующие семь мелиоративных районов.

I. Сенокосно-суходольный: куда входят Буда-Кошелевский и Городецкий административные районы.

II. Болотно-заливной: Стрешинский, Жлобинский и Рогачевский районы.

III. Болотно-песчаный: Глусский и Паричскй районы.

IV. Сенокосно-болотный: 1 и 2 Бобруйские районы.

V. Болотно-лесной: Осиповичский, Свислочский и Кличевский районы.

VI. Песчано-болотно-сенокосный: Старо-Дорожский, Старобинский и Любаньский районы.

VII. Болотно-сенокосный, интенсивно-травопольный: Слуцкий, Копыльский, Гресский районы

Анализируя хозяйственно-экономические признаки характеризующие каждый из этих районов, степень распространения и характер мелиораций в них, интенсивность хозяйства (капитало-интенсивность и доходность), получаем возможность дать следующее заключение о подготовленности отдельных мелиоративных районов к проведению в них различных (по степени интесивности) мелиораций.

III и IV районы—слабо-интенсивные (экстенсивные мелиорации, регулирование рек и прокладка магистральных осушительных каналов).

II, IV и V районы—средне-интенсивные—прокладка осушительной сети с поверхностными улучшениями.

I и VII районы—сильно-интенсивные—устройство детальной осушительной сети, с проведением культур-технических улучшений.

Отнесение того или иного района к одной из указанных групп не исключает возможности и необходимости проведения в каждом из них всех видов мелиоративных мероприятий, но отмечает преобладающее значение той или иной группы мероприятий в отдельных частях изучаемого округа.

Professor N. S. Frolow

Die Meliorations—Bezirke des Bobruiskischen Kreises.

Eine der Hauptaufgaben bei der Sichtung der Frage über wirtschaftliche Unternehmungen, die von dem Volkskommissariat für Landwirtschaft der Belarussischen Sowetschen Socialistischen Republik geplant worden sind, bestand darin, Meliorations-Besirke auszuscheiden. Dies erwies sich als durchaus notwendig, sowohl deswegen, damit eine spätere Verarbeitung des sich ansammelnden umfangreichen Materiales über die Oekonomik von Meliorationen in den Grenzen mehr der weniger einheitlicher Bezirke, die annähernd gleichartig meliorative Anlagen beanspruchen, ausgeführt werden könnten, ferner auch aus praktichen Gründen bei einer Organisation der Meliorationsarbeiten innerhalb der einzelnen Bezirke. Eine Methodologie für eine meliorative Bezirkseinteilung ist bislang noch nicht ausgearbeitet worden in der zuständigen Literatur. Da eine richtige Lösung dieser Frage nur möglich ist, wenn solche Merkmale, wie klimatische Verhältnisse, Verhältnisse des Bodens und Wasserstandes einer Seits, andrerseits aber ökonomische Verhältnisse berückrichligtn werden, hält es Verfasser vorliegender Arbeit für notwendi, diese natürlichen und ökonomischen Faktoren als Grundlage für eine Einteilung des Gebietes in einzelne Bezirke in Anrechnung zu bringen. Fussend auf diesen Erwägungen teilt der Verfasser den Bobruisk—Slutzkischen Bezirk von Belarussj nach seinen natürlichen Merkmalen in zwei Teile oder grosse Bezirke ein: 1) in den Poless'schen Bezirk, welcher den südwestlichen Teil des früheren Bezirkes einnimmt und 2) in einen Uebergangs—Bezirk zum Zentral—Gebiet von Belarussj, welcher alle übrigen nördlichen und nord-östlichen Teile des früheren Bezirkes umfasst. Weiterhin zerteilt der Verfasser obige zwei neue Bezirke auf Grundlage ihrer wirtschaftlichen Eigenheiten in besondere Abteilungen und bildet auf diese Weise sieben besondere Meliorations—Bezirke.

Im zweiten Kapitel giebt der Verfasser eine Zurammenfassung vergleichender statistischer Angaben dieser Bezirke in Bezug auf Organisation des Ackerbaues, der Viehzucht des gegenwärtigen Standes der Fütterungsfrage, der Meliorationen, und desgleichen der Kapital-Intensität und der Höhe der Einnahmen der bäuerlichen Wirtschaften.

Im dritten Kapitel stellt der Verfasser eine vergleichweise Schilderung einzelner zweige der Landwirrschaftsbetriebe zusammen und desgleichen der weliorativen Arbeiten in den einzelnen Bezirken.

Am Schlusse des Artikels giebt der Verfasser in übersichtlicher Form eine Zusammenfassung über den Grad, in welchem die bäuerlichen Wircschaften der einzelnen Bezirke sich als für die Neuordnung vorbereitet erwiesen, in Bezug auf die eine oder andere Form von Meliorationen, hierbei ergab sich Folgendes (s. die Karte).

Schwach intensive (extensive) Melioration, Flussregulirungen und Durchführung magictraler Entwässerungs—Kanäle sind durchführbar in den Bezirken III und VI.

Eine mittel-intensive Durchführung von Entwässerungs—Linien mit oberflächlichen Verbesserungen in den Bezirken II, IV und V.

Eine stark intensive Einrichtung detail-ausgeführter Entwässerungslinien mit einer Durchführung gründlicher Verbesserung des Geländes in den Bezirken I und VII.

Professor N. S. [illegible]

Die Meliorations—Bezirke des Bobruiskischen Kreises.

Eine der Hauptaufgaben bei der Stellung der Frage über wirtschaftliche Unternehmungen, die von dem Volkskommissariat für Landwirtschaft der Belarussischen Sowetischen Sozialistischen Republik geplant worden sind, bestand darin, Meliorations-Bezirke auszuscheiden. Dies erwies sich als durchaus notwendig, sowohl deswegen, damit eine spätere Verarbeitung des sich ansammelnden umfangreichen Materiales über die Oekonomik von Meliorationen in den Grenzen mehr der weniger einheitlicher Bezirke, die annähernd gleichartig meliorative Anlagen beanspruchen, ausgeführt werden könnten, ferner auch aus praktischen Gründen, bei einer Organisation der Meliorationsarbeiten innerhalb der einzelnen Bezirke. Eine Methodologie für eine meliorative Bezirkseinteilung ist bisher noch nicht ausgearbeitet worden in der zuständigen Literatur. Da eine richtige Lösung dieser Frage nur möglich ist, wenn solche Merkmale, wie klimatische Verhältnisse, Verhältnisse des Bodens und Wasserstandes einer Seite, andrerseits aber ökonomische Verhältnisse; berücksichtigt werden, hält es Verfasser vorliegender Arbeit für notwendig, diese natürlichen und ökonomischen Faktoren als Grundlage für eine Einteilung des Gebietes in einzelne Bezirke in Anrechnung zu bringen. Fussend auf diesen Erwägungen teilt der Verfasser den Bobruisk—Sluzkischen Bezirk von Belarussi nach seinen natürlichen Merkmalen in zwei Teile oder grosse Bezirke ein: 1) in den Poless'schen Bezirk, welcher den südwestlichen Teil des früheren Bezirkes einnimmt und 2) in einen Uebergangs—Bezirk zum Zentral—Gebiet von Belarussi, welcher alle übrigen nördlichen und nord-östlichen Teile des früheren Bezirkes umfasst. Weiterhin zerteilt der Verfasser obige zwei neue Bezirke auf Grundlage ihrer wirtschaftlichen Eigenheiten in besondere Abteilungen und bildet auf diese Weise sieben besondere Meliorations—Bezirke.

Im zweiten Kapitel giebt der Verfasser eine Zusammenfassung vergleichender statistischer Angaben dieser Bezirke in Bezug auf Organisation des Ackerbaues, der Viehzucht des gegenwärtigen Standes der Fütterungsfrage, der Meliorationen, und desgleichen der Kapital-Intensität und der Höhe der Einnahmen der bäuerlichen Wirtschaften.

Im dritten Kapitel stellt der Verfasser eine vergleichsweise Schilderung einzelner zweige der Landwirtschaftsbetriebe zusammen und desgleichen der meliorativen Arbeiten in den einzelnen Bezirken.

Am Schlusse des Artikels giebt der Verfasser in übersichtlicher Form eine Zusammenfassung über den Grad, in welchem die bäuerlichen Wirtschaften der einzelnen Bezirke sich als für die Neuordnung vorbereitet erwiesen, in Bezug auf die eine oder andere Form von Meliorationen. Hierbei ergab sich Folgendes (s. die Karte).

Schwach intensive (extensive) Melioration, Flussregulirungen und Durchführung magistraler Entwässerungs—Kanäle sind durchführbar in den Bezirken III und VI.

Eine mittel-intensive Durchführung von Entwässerungs—Linien mit oberflächlichen Verbesserungen in den Bezirken II, IV und V.

Eine stark intensive Einrichtung detail-ausgeführter Entwässerungslinien mit einer Durchführung gründlicher Verbesserung des Geländes in den Bezirken I und VII.

К. С. Загоркі.

Сярэдні прыбытак сялянскай гаспадаркі ў сувязі з забалочанасьцю і абсушэньнем зямель.

Працамі экспэдыцыі па пытаньнях эканомікі мэліарацый у 1925—1926 годзе на прыкладзе Мазырскага Палесься было вызначана, [1]) што большая ці меншая колькасьць нягожых зямель—з аднаго боку і большая ці меншая адлегласьць зямель селішча ад абсушвальных каналаў—з другога, адбіваюцца на некаторых статыстычна выяўленых элемэнтах сельскай гаспадаркі.

Найбольшая правільнасьць была адзначана для такіх паказальнікаў, як забясьпека насельніцтва зямельнай плошчай (у прыватнасьці—сельска-гаспадарчай плошчай), і, асабліва,—быдлам. У мэтах высьвятленьня залежнасьцяў рабіліся групіроўкі дасьледаваных селішч, з аднаго боку, па азнаке як бы адмоўнай—проценту нягожых зямель, і, з другога, становучай—адлегласьці селішч ад абсушальных каналаў.

Абедзьве групіроўкі былі вытвараны кожная самастойна, незалежна адна ад другой. У сапраўднасьці-ж абедзьве паказаныя азнакі (нягожыя землі і абсушальныя работы) відавочна павінны быць так ці інакш зьвязаны паміж сабою, бо забалочанасьць зямель зьяўляецца прадпасылкай для правядзеньня абсушыцельнай сеці, а павялічэньне колькасьці балот, відавочна, будзе падвышаць неабходнасьць і імкненьне да абсушэньня іх. Гэтая праца і зьяўляецца спробай выдзяліць, па меры магчымасьці, дзеяньне кожнае з узятых азнак паасобна, шляхам камбінацыйных падлікаў, пры чым за чыннасьць, за паказальнік дзеяньня абодвых чыньнікаў быў узяты сярэдні прыбытак гаспадаркі па галоўным галінам: сельска-гаспадарчай плошчы (пахаць, сенажаць і выган) і быдлу (каровы і маладняк больш 1 году).

У якасьці выходнага матар'ялу былі ўзяты 160 селішч Бабруйскай і Слуцкай акруг, якія былі апісаны па праграме паселішчнай карткі экспэдыцыі, пры чым толькі тыя селішчы, якія маюць балотныя землі. Узяты лік селішч у адносінах да ўсіх селішч названых акруг складае 3,8%, а ў адносінах да ўсіх дасьледваных селішч—91,5%.

Для вызначэньня прыбытковасьці паасобных галін гаспадаркі паселішчнае апісаньне бязумоўна даць нічога не магло, чаму і прышлося скарыстаць апублікаваныя Бабруйскім і Слуцкім Акрвыканкомамі „Средние нормы доходности об'ектов обложения единым с.-х. налогом в 1925/26 году".

У гэтых нормах дадзена прыбытковасьць аднае дзесяціны пахаці, сенажаці, аднае галавы быдла і г. д., пры чым прыбытковасьць пахаці паасобных селішч значна зьмяняецца (ад 22 да 40 рублёў з дзе-

---

[1]) Н. С. Фролов. „Вопросы экономики мелиораций в Мозырском Полесье", Минск, 1926. НКЗБ.

сяціны) ня толькі ў межах вакругі ці раёну, але і сельсавету, г. зн. норма паказваецца амаль што паасобку для кожнага селішча. Для сенажаці і быдла адменьнікаў менш, але ўсё-ж, як паказала распрацоўка матар'ялаў экспедыцыі, нормы ў значнай ступені адбіваюць розпасьці ў мясцовых прыродна-гістарычных і эканамічных умовах гаспадаркі, што будзе паказана ніжэй.

Узятыя селішчы былі разгрупіраваны ў двух напрамках адначасова, пры чым у якасьці паказальніка галоўнае азнакі групіроўкі—забалочанасьці—быў узяты процант балотных зямель ад усяе зямельнае плошчы селішча, і ў якасьці паказальніка другое азнакі—ступені абсушэньня—колькасьць дзесяцін абсушанае плошчы, якая прыходзіцца на 100 дзесяцін балотных зямель. Апрача таго, паасобна былі падлічаны селішчы, якія маюць балотныя землі, але без мэліарацый і селішчы, якія таксама маюць балотныя землі, але з мэліарацыяй. Была, таксама, зроблена спроба згрупіраваць селішчы ў залежнасьці ад часу правядзеньня мэліарацыйных работ, але, якая, на вялікі жаль, не дала вынікаў, за недахопам і непаўнатой матар'ялаў.

Далей трэба тут-жа зрабіць абмоўку, што прадстаўляюць сабой узятыя для асноўнае групіроўкі азнакі. Што датычыцца першага—проценту балотных зямель, то ўзяты ён таму (у адзнаку ад прац 1925 году), што, па-першае, у нягожыя землі вельмі часта, апрача балот, могуць уваходзіць, і іншыя віды няўдобіцы, што затушэвала-б уплыў забалочанасьці, а па-другое, балотныя землі ў сувязі з мэліарацыяй (больш дакладна—абсушэньнем) прадстаўляюць найбольшую цікавасьць, як непасрэдны аб'ект гэтых мэліарацый.

Пры вылічэньні проценту балотных зямель, прымалася пад увагу агульная забалочанасьць зямель селішча, г.-зн. да балотных былі аднесены ня толькі „нягожыя“, вярней нескарыстоўваемыя землі, але і балотная сенажаць і выган.

Адносна другой азнакі—абсушанае плошчы на 100 дзесяцін балотных зямель—трэба сказаць, што ўзята яна таму, што была адзіна магчымай, бо ня было ні карты з нанясёнымі каналамі (для выяўленьня адлегласьці ад іх), ні іншых паказальнікаў абсушэньня. Аднак і без таго, падобнае мераньне ступені мэліараванасьці ў мэтах групіроўкі статыстычных матар'ялаў зьяўляецца даволі добрым. Пад абсушанай плошчай разумелася плошча, па якой праходзілі абсушальныя канавы. З таго, што выходным матар'ялам было паселішчнае апісаньне, сьледуе, што, як колькасьць балотных зямель, так і абсушаная плошча вызначаліся з дакладнасьцю адноснай, шляхам апытваньня гаспадароў і мясцовых працаўнікоў. Прамежкі для абедзьвёх азнак у нашай групіроўцы спачатку былі ўзяты даволі дробныя, але з прычыны невялікай колькасьці выпадкаў назіраньня, ў выніку трэба было застанавіцца на меншай колькасьці прамежкаў, але з большым лікам селішч у кожным з іх.

Для першае азнакі былі ўзяты тры групы: I-я—да 5% балотных зямель, II-я—ад 5 да 15% і III-я—больш 15%. Для другога—(ступень абсушэньня) таксама тры: I-я без асушэньня (0 дзес. абсушаных на 100 дзес. балот), 2-я да 40 дзесяцін абсушаных на 100 дзес. балотных і 3-я больш 40 дзес., пры чым кожная з груп па проценту балотных зямель была разьбіта на падгрупы па ступені абсушэньня. Апрача таго другая і трэцья падгрупы (па ступені абсушэньня) былі падлічаны разам, і такім чынам былі атрыманы ўнутры кожнае аснаўнае групы па ступені забалочанасьці дзьве новыя падгрупы: „без мэліарацый“ і „з мэліарацыяй“.

Узятыя 160 селішч, калі іх разьнесьці па адпаведных групах і падгрупах, дадуць наступную табліцу разьмяркаваньня:

Табл. № 1. Лік селішч—выпадкаў:
Tab. № 1. Anzahl der Siedelungs—Fälle:

	На 100 дзес. балотных прыходзіцца абсушаных: Auf 100 Dessjatinen Sumpfland entfallen an entwässertem: / % балотных зямель: % der Sumpfländereien	I да 5 bis 5	II 5—15 5--15	III >15 >15	Разам Im Ganzen
1	0 дзес. ... 0 Dessj.	10	15	18	43
2	Да 40 дзес. ... Bis zu 40 Dessj.	—	10	37	47
3	> 40 дзес. ... 40 und mehr Dessj.	7	24	39	70
	Разам ... Im Ganzen	17	49	94	160
А	Без мэліар. ... Ohne Meliorationen	10	15	18	43
Б	З мэліарац. ... Mit Meliorationen	7	34	76	117

Як відаць з табліцы, у ніжэйшыя групы па плошчы балот пападае пераважная колькасьць селішч без мэліарацый, і, наадварот, селішча з вялікім процантам балотных зямель знаходзяцца ў групах з мэліарацыяй, што яшчэ больш бачна з наступнага:

Табл. № 2. Процант селішч—выпадкаў:
Tab. № 2. Prozent-gehalt der Siedelungs—Fälle:

	Па % забалочанасьці: % der Sumpf-ländereien: / Па мэліарацыях: Vorkommen von Meliorationen	Без мэліарацый Ohne Meliorationen	З мэліарацыяй Mit-Meliorationen	Разам Im Ganzen
I	Да 5% ... Bis 5%	58,8	41,2	100
II	5—15 „ ...	30,6	69,4	100
III	> 15 „ ...	19,1	80,9	100
	Разам ... Im Ganzen	26,9	73,1	100

Наогул з узятых 160 селішч, якія маюць балотныя землі, толькі 26,9% ня маюць на гэтых землях мэліарацыі, пры чым, у першай групе, з ніжэйшай колькасьцю балот, процант гэты павялічваецца да 58,8, а ў селішчах многабалотных падае да 19,1, г. зн. з павялічэньнем проценту балотных зямель, з павялічэньнем забалочанасьці, павялічваецца лік селішч, якія маюць на сваіх землях мэліарацыі.

Што датычыцца да сувязі паміж забалочанасьцю зямель і ступеньню іх абсушэньня, то характар яе іншы, што можна бачыць з наступных табліц:

Табл. № 3. Сярэдні % балотных зямель:

	На 100 дзесяцін балотных прыходзіцца абсушаных \ % балотных зямель	I Да 5	II 5—15	III > 15	Разам
1	0	0,8	8,3	30,1	16,3
2	Да 40 дзес.	—	10,5	26,2	22,3
3	40 і больш	3,1	10,8	26,5	18,4
	Разам	1,6	10,2	26,9	19,0
А	Без мэліар.	0,8	8,3	30,1	16,3
Б	З мэліар.	3,1	10,6	26,3	20,4

Табл. № 4. У сярэднім на 100 дзес. балотных зямель абсушана дзесяцін:

	На 100 дзесяцін балотных прыходзіцца абсушаных \ % балотных зямель	I Да 5	II 5—15	III > 15	Разам
1	0	—	—	—	—
2	Да 40 дзес.	—	10,6	18,2	17,3
3	40 і больш	147,7	97,2	77,2	82,6
	Разам	121,8	50,5	35,2	—
А	Без мэліар.	—	—	—	—
Б	З мэліар.	147,7	59,7	42,7	46,3

Як відаць з гэтых табліц, з павялічэньнем процанту балотных зямель амаль што правільна падаеадносная колькасьць дзесяцін плошчы абсушанай (у тым сэнсу „абсушанай“, як было абгаворана вышэй), г.-зн. назіраецца як бы адваротная залежньсьць паміж дзьвума азнакамі.

Каэфіцыент карэляцыі, які вылічаны па формуле Бравэ, роўны— —0,33 ± 0,07 для нашага ліку выпадкаў (160).

Вялічыня каэфіцыенту і колькасьць пракарэліраваных выпадкаў не настолькі вялікі, каб гаварыць аб якіх небудзь вывадах наогул, але ўсё-ж і групіроўка і каэфіцыент карэляцыі паказваюць на наяўнасьць некаторай сувязі, і сувязі адмоўнай, адваротнай, гэта значыць з павялічэньнем процанту балотных зямель, зьмяншаецца адносная колькасьць зямель абсушаных. Да некаторай ступені сувязь

гэтая магла знайсьці тлумачэньне ў тым, што ў прыродзе, у сапраўднасьці, як нешта дадзенае, ужо існуючае раней,—ёсьць балотная плошча, а плошча абсушаная—ёсьць вынік першай, г.-зн. абсушэньне ідзе ўсьлед за забалочанасьцю. Адмоўны-жа знак карэляцыі (—) гаворыць аб тым, што, як відаць, значнае павялічэньне забалочанасьці зямель не заўсёды цягне за сабой павялічэньне ў тэй-жа ступені і абсушанай, або абсушаемай плошчы, г.-зн. патрэба ў мэліарацыях пры малай, параўнальна, колькасьці балотных зямель, пакрываецца лягчэй, здавальняецца з большай паўнатой, чым пры вялікіх балотных плошчах, што, бязумоўна, патрабуе праверкі на большай колькасьці аб'ектаў назіраньня, якія адносяцца да большай, чым дзьве вакругі, тэрыторыі.

Далей, падыходзячы, да высьвятленьня ўплыву забалочанасьці, і абсушэньня зямель на прыбытак гаспадаркі, трэба спыніцца некалькі на крыніцах гэтага прыбытку, на паасобных (галоўных) галінах сельскай гаспадаркі, бо зьмена іх у натуральных вымерах бязумоўна павінна адбіцца і на разьмерах прыбытку ў грашовым выразе. Галоўнай крыніцай прыбытку у большасьці сялянскіх гаспадарак Бабруйскае і Слуцкае вакруг, як і наогул у БССР, галоўнай падставай існаваньня сялянскай гаспадаркі зьяўляецца зямля, сельска-гаспадарчая плошча, чаму ў першую чаргу і трэба на ёй спыніцца. Па дадзеным Экспедыцыі 1925 году, з павялічэньнем працанту балот у селішчах павялічылась сярэдняя забясьпека ўсёй зямлёй аднаго двара, і слаба, без асобнай правільнасьці зьмянялася яна з павялічэньнем адлегласьці селішч ад абсушальных канаў (гл. справаздачу Экспэдыцыі) [1]). Выходзячы з гэтага, можна было дапусьціць, што тоя-ж паўтарыцца і для Бабруйскай і Слуцкай вакруг. Наколькі гэтае дапушчэньне апраўдалася відаць з наступнага.

Найперш за ўсё пры папярэдняй працы, у мэтах арыентыроўкі, была вытворана наступная групіроўка селішч:

Табл. № 5.

№ па чарзе	Групы па колькасьці ўсёй зямлі на 1 двор (у сярэднім па селішчах).	Лік селішч у групе	У сярэдн. па групе зямлі на 1 двор	% балотн. зямель ад усей зямлі	На 100 дзес. балотн. прыходзіцца абсушаных зямель
1	Да 5 дзес.	21	4,16	16,62	43,0
2	Ад 5 да 7 дз.	36	6,02	16,66	43,0
3	» 7 » 9 »	37	8,07	23,37	39,0
4	» 9 » 11 »	24	9,86	23,89	24,0
5	» 11 » 13 »	18	12,04	23,10	55,0
6	Больш 13 »	24	17,55	24,00	36,0

З гэтае табліцы можна бачыць, што, па меры павялічэньня зямлі на 1 двор (у сярэднім), амаль што правільна ўзрастае процант балотных зямель з аднаго боку і прыметна тэндэнцыя да паніжэньня адноснай колькасьці абсушанай плошчы—з другога; выключэньне складае пятая група з найменшай колькасьцю выпадкаў у ёй, дзе па тым ці іншым прычынам значна падвышана абсушаная плошча. Даныя гэтай групіроўкі з аднаго боку пацьвярджаюць простую сувязь паміж землязабясьпекай (усёй зямлі на 1 двор) і колькасьцю балот (а зна-

[1]) Названая раней праца.

чыцца і адваротна), а з другога—тое, што гаварылася вышэй аб адваротнай сувязі паміж колькасьцю балотных і абсушаных зямель.

Тут само сабой паўстае пытаньне, якіж характар гэтага павялічэньня землязабясьпекі? Калі павышэньне забалочанасьці зямель ідзе роўналежна з павялічэньнем сярэдняй колькасьці ўсёй зямлі на 1 двор, то ці адбіваецца гэта на разьмерах і складзе сельска-гаспадарчай плошчы і як адбіваецца? Да разьгляду гэтых пытаньняў і трэба цяпер зьвярнуцца для чаго перш за ўсё прыводзіцца наступная табліца:

Табл. № 6. Зьмена сярэдняй забясьпекі 1-го двара зямлёй па ўжытках:
Tab. № 6. Veränderang der mittleren Sicherstellung einer Wirtschaft mit Land nach:

№ групы. № der Gruppe	Група селішч па % балотных зямель: Gruppe der siedelungen nach den % Gehalt an Sumpfländereien:	Падгрупа. Untergruppe	Падгрупа селішч па ступені абсушэньня (на 100 дзесяцін балотных абсушана дзесяцін): Untergruppe der Siedelungen nach dem Grade der Entwässerung (Auf 100 Dessj. Sumpfland sind entwässert Dessjatinen):	У сярэднім на 1 гаспадарку прыходзіцца дзесяцін: Im Durchschnitt entfallen auf 1 Wirtschaft an Dessjatinen:						
				Пахаці Ackerland	Кармовай плошчы Fläche unter Futterkräntern	У тым ліку: darunter: Сенажаці Heuschlog	Выгану Weidetrift	Усёй с/г. плошчы Gesammte landwirtschaftlich genutzte Fläche	Нескарыстоўваемых зямель Ungenutzte Sumpfländereien	Усяго. Im Ganzen (9+10)
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
I	да 5% bis 5%	A	0 дзес. (без мэліар.) . . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	4,01	1,67	1,44	0,23	5,68	0,02	5,70
			да 40 дзес. . . . . . bis 40 Dessj.	—	—	—	—	—	—	—
			> 40 дзес. . . . . . > 40 Dessj.	4,17	1,81	1,54	0,27	5,99	0,05	6,04
		B	Усяго з мэліар. . . . im Ganzen mit Meliorat.	4,17	1,81	1,54	0,27	5,99	0,05	6,04
II	5—15%	A	0 дзес. (без мэліар.) . . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	3,41	1,59	1,36	0,23	5,00	0,25	5,25
			да 40 дзес. . . . . . bis 40 Dessj.	3,88	2,30	1,95	0,35	6,18	0,25	6,43
			> 40 дзес. . . . . . > 40 Dessj.	3,99	1,74	1,41	0,33	5,73	0,13	5,86
		B	Усяго з мэліар. . . . . im Ganzen mit Meliorat.	3,94	1,95	1,61	0,34	5,89	0,18	6,07
III	> 15%	A	0 дзес. (без мэліар.) . . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	3,45	2,68	1,78	0,90	6,13	1,31	7,44
			да 40 дзес. . . . . . bis 40 Dessj.	3,51	3,24	1,94	1,30	6,75	0,51	7,26
			> 40 дзес. . . . . . > 40 Dessj.	3,47	3,37	2,29	1,08	6,84	0,34	7,18
		B	Усяго з мэліар. . . . . im Ganzen mit Meliorat.	3,49	3,29	2,08	1,21	6,78	0,44	7,22
	Разам im Ganzen	A	0 дзес. (без мэліар.) . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	3,61	2,01	1,54	0,47	5,62	0,56	6,18
			да 40 дзес. . . . . . bis 40 Dessj.	3,59	3,02	1,94	1,08	6,61	0,45	7,06
			> 40 дзес. . . . . . > 40 Dessj.	3,74	2,59	1,88	0,71	6,33	0,23	6,56
		B	Усяго з мэліар. . . im Ganzen mit Meliorat.	3,67	2,80	1,91	0,89	6,47	0,34	6,81
I	Да 5% bis 5%		Па ўсім падгрупам . . in allen Untergruppen	4,07	1,73	1,49	0,24	5,80	0,03	5.83
II	5—15		" " "	3,81	1,85	1,54	0,31	5,66	0,20	5,86
III	> 15		" " "	3,48	3,21	2,04	1,17	6,69	0,57	7,26

Прывадзімая табліца характарызуе колькасны бок зьмены ў забясьпецы зямлёй сялянскае гаспадаркі. Пры разглядзе гэтай табліцы можна бачыць, як, перш за ўсё, з павялічэньнем забалочанасьці зямель селішча, павялічваюцца агульныя разьмеры землекарыстаньня ў сярэднім на адзін двор (графа 11), што відаць ня толькі ў падрахункавай зводке па проціанту балотных зямель, але і па кожнай групе ў паасобнасьці, калі параўнаць аднолькавыя па ступені абсушэньня селішчы першай групы з гэткімі-ж другой і трэцьцяй. Гэтае павялічэньне агульных разьмераў землекарыстаньня адносіцца ў аднолькавай ступені як да селішч, якія ня маюць мэліарацый, так і з мэліарацыямі. Але наяўнасьць мэліарацый (як відаць з параўнаньня падгруп) у роўных умовах забалочанасьці, яшчэ больш павышае сярэднюю колькасьць усёй сельска-гаспадарчай плошчы на 1 двор, што робіцца ясным пры разглядзе графы 9 табліцы. Пры адным і тым-жа проціанту балотных зямель наяўнасьць мэліарацый правільна павялічвае сярэднюю забясьпеку двара сельска-гаспадарчай плошчай, пры чым, ва ўмовах найбольшай забалочанасьці зямель павялічэньне гэтае ідзе раўналежна ступені абсушэньня: чым больш проціант абсушаных зямель, тым больш значна павышаецца разьмер сельска-гаспадарчай плошчы ў сярэднім на гаспадарку.

Далей цікава прасачыць зьмену разьмераў паасобных відаў ужыткаў, якія складаюць сельска-гаспадарчую плошчу. Перш за ўсё— пахаць.

З павышэньнем забалочанасьці зямель сярэдняя колькасьць пахаці (гр. 5) на 1 гаспадарку правільна падае незалежна ад ступені абсушэньня балотных зямель, пры чым, пры аднолькавых умовах забалочанасьці, павялічэньне ступені абсушэньня павышае разьмеры пахаці ў сярэднім на 1 двор. Як відаць, ужо на пахатных землях часткова сказваецца станоўчае дзеяньне мэліарацый, але, як і трэба чакаць, ва ўмовах беларускага абсушэньня зямель, якое ў галоўнай сваёй масе—абсушэньне экстэнсыўнае, асабліва выразна яго вынікі павінны адбіцца на больш экстэнсыўных ужытках сельска-гаспадарчай плошчы, на кармовай плошчы, на сенажацях, выганах. Па меры павялічэньня проціанту балотных зямель, кармовая плошча вядзе сябе адваротна ў параўнаньні з пахатнай. Калі колькасьць пахаці на 1 двор падае, то кармовая плошча павялічваецца, але што цікава тут, дык гэта ўплыў мэліарацыі.

Абсушэньне яшчэ больш павялічвае, яшчэ больш пашырае кармовую плошчу гаспадаркі пры чым найбольш значны гэты ўплыў мэліарацый ва ўмовах павышанага проціанту балотных зямель, дзе розьніца паміж колькасьцю кармовае плошчы на 1 двор у селішчах без мэліарацый і ў селішчах, якія маюць мэліарацыі дасягае найбольшай вышыні. Калі прыняць сярэднюю колькасьць кармовай плошчы на 1 двор у селішчах без мэліарацый за 100 проціантаў, то ў селішчах з забалочанасьцю больш за 15%, абсушэньне да 40% балотных зямель павышае гэтую лічбу да 121%, а абсушэньне больш 40% дае ужо 126% у параўнаньні з селішчамі без мэліарацый. Усё сказанае аб кармовай плошчы адносіцца ў роўнай меры і да сенажаці і выгану, пры чым павялічэньне забясьпекі гаспадаркі сенажацьцю ідзе так: у селішчах без мэліарацый (пры 15% балотных зямель)—100%, пры абсушэньні да 40%—109 і больш 40%—129, а для выгану тыя-ж лічбы будуць: 100%, 144 і 120. З гэтага відаць, што пры меньшай ступені абсушэньня колькасьць выгану ў сярэднім на двор павялічваецца хутчэй, больш, чым сенажаці, і наадварот—павышэньне ступені абсушэньня ў першую чаргу павялічвае забясьпеку двара сенажацьцю і

потым выганам. Цяпер застаецца адзначыць характарную зьмену сярэдняй колькасьці балот на 1 двор, балот зусім нескарыстоўваемых, нягожых у поўным сэнсе гэтага слова.

Ясна, што з павялічэньнем агульнай забалочанасьці зямель павышаецца і колькасьць нягожых, нескарыстоўваемых балот у сярэднім на 1 гаспадарку, што відаць з наступнага:

Табл. № 7. У сярэднім на 1 гаспадарку прыходзіцца нескарыстоўваемых балот дзесяцін:

Tab. № 7. Im Durchschnitt entfallen auf eine Wirtschaft an ungenutzten Sümpfen in Dessjätinen:

Па ступені абсушэньня (на 100 дз. балотных абсушана): Grad der Entwässerung (auf 100 Dessj. Sumpfland sind entwässert.): / Па % балотных зямель: % Gehalt der Sumpfländereien:		I Да 5% bis	II 5—15	III > 15	Разам Im Ganzen
1	Без мэліярац. ohne Melioration	0,02	0,25	1,31	0,56
2	Да 40 дзес. абсушана bis 40 Dessj. entwas.	—	0,25	0,51	0,45
3	> 40 „ „	0,05	0,13	0,34	0,23
	Разам Im Ganzen	0,03	0,20	0,57	—

Але з гэтай-жа таблічкі відаць, што з павялічэньнем агульнай забалочанасьці зямель селішча колькасьць нягожых балотных зямель больш прыметна павышаецца—у селішчах без мэліярацый, ці, інакш кажучы, наяўнасьць мэліярацый на землях селішча памяншае колькасьць нескарыстоўваемых балот, і чым больш мэліярыравана балотная плошча, тым больш пашыраюцца магчымасьці яе скарыстаньня для патрэб сельскай гаспадаркі.

Тоя-ж, яшчэ больш відавочна бачыць з наступнага:

Табл. № 8. Нескарыстоўваемыя балоты ў % да ўсёй балотнай плошчы:

Tab. № 8. Genutztes Sumpfland in % des gesammten Sumpflandes.

На 100 дзес. балотных прыходзіцца абсушаных: Auf 100 Dessj. Sumpfland entfallen an entwässertem: / % балотных зямель: % der Sumpfländereien:		I Да 5% bis	II 5—15	III > 15	Разам Im Ganzen
1	0 дзес 0 Dessj.	40,0	42,8	38,1	38,8
2	Да 40 дзес. bis 40 Dessj.	—	20,6	18,2	18,5
	> 40	14,4	13,6	12,1	12,4
	Разам Im Ganzen	18,9	20,7	19,6	19,8
А	Без мэліяр. ohne Melioration	40,0	42,8	38,1	38,8
Б	З мэліяр. mit Melioration	14,4	16,6	15,6	15,8

Чым больш абсушаны балотныя землі, тым меншы процант іх застаецца для гаспадаркі нескарыстоўваемым, тым большая частка іх пападае ў кармавыя ўжыткі.

Дагэтуль увесь час гаварылася аб сярэдняй землязабясьпецы гаспадаркі. Цяпер цікава некалькі спыніцца на зьменах у складзе зямельнай плошчы ў сувязі з ступеньню забалочанасьці і абсушэньня (гл. табл. № 9).

Табл. № 9. Зьмена складу галоўных ужыткаў у процантах:
Tab. № 9. Veränderungen im Bestande der hauptsächlichsten ldw. Nutzungsflächen in %:

№ групы. № der Gruppe	Група селішч па % балотных зямель: Gruppe der Siedelungen nach dem % Gehalt der Sumpfländereien:	Падгрупа. Untergruppe	Падгрупа селішч па ступені абсушэньня (на 100 дзесяцін балотных абсушана дзесяцін): Untergruppe der Siedelungen nach dem Grade der Entwässerung (auf 100 Dessj. Sumpfland sind entwässert Dessjatinen):	Склад галоўнейшых ужыткаў у процантах: Bestand der hauptsächlichsten ldw. Nutzungsflächen in %:						
				Пахаці Ackerland	Кармовай плошчы Flächeunter Futterkräntern	У тым ліку: darunter Сенажаці Heuschlag	Выгану Weidetrift	Усёй с/г. плошчы Der gesammten ldw. genutzten Fläche	Нескарыстоўваемых зямель Ungenutzter Sumpfleidereien	Разам. Im Ganzen (9+10)
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
I	Да 5% bis 5%	A	0 дзес. (без мэліар.) . . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	70,4	29,2	25,2	4,0	99,6	0,4	100
			да 40 дзес. . . . . . . bis 40 Dessj.	—	—	—	—	—	—	—
			> 40 дзес. . . . . . . > 40 Dessj.	69,2	30,0	25,5	4,5	99,2	0,8	100
		B	Усяго з мэліар. . . . im Ganzen mit Meliorat.	69,2	30,0	25,5	4,5	99,2	0,8	100
II	5—15%	A	0 дзес. (без мэліар.) . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	65,0	30,4	26,0	4,4	95,4	4,6	100
			да 40 дзес. . . . . . . bis 40 Dessj.	60,3	35,7	30,3	5,4	96,0	4,0	100
			> 40 дзес. . . . . . . > 40 Dessj.	68,1	29,7	24,1	5,6	97,8	2,2	100
		B	Усяго з мэліар. . . . im Ganzen mit Meliorat.	64,9	32,1	26,5	5,6	97,0	3,0	100
III	> 15%	A	0 дзес. (без мэліар.) . . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	46,4	36,0	23,9	12,1	82,4	17,6	100
			да 40 дзес. . . . . . . bis 40 Dessj.	48,4	44,6	26,7	17,9	93,0	7,0	100
			> 40 дзес. . . . . . > 40 Dessj.	48,3	47,9	32,9	15,0	96,2	4,8	100
		B	Усяго з мэліар. . . . im Ganzen mit Meliorat	48,3	45,6	28,8	16,8	93,9	6,1	100
	Разам Im Ganzen	A	0 дзес. (без мэліар.) . . 0 Dessj. (ohne Meliorat.)	58,4	32,5	24,9	7,6	90,9	9,1	100
			да 40 дзес. . . . . . . bis 40 Dessj.	50,9	42,8	27,5	15,3	93,7	6,3	100
			> 40 дзес. . . . . . > 40 Dessj.	57,0	39,5	28,7	10,8	96,5	4,5	100
		B	Усяго з мэліар. . . . im Ganzen mit Meliorat.	53,9	41,1	28,0	13,1	95,0	5,0	100
I	Да 5% bis 5%		Па ўсім падгрупам . . in allen Untergruppen	69,9	29,7	25,6	4,1	99,6	0,4	100
II	5—15		" " "	65,0	31,6	26,3	5,3	96,6	3,4	100
III	> 15		" " "	47,9	44,2	28,1	16,1	92,1	7,9	100

У адзнаку ад вышэйразгледжанай, дадзеная табліца характарызуе якасны бок зьмен у зямельнай плошчы.

Перш за ўсё, можна бачыць, як, разам з павялічэньнем проценту балотных зямель, скарачаюцца адносныя разьмеры сельска-гаспадарчай плошчы і, як, разам з тым, з павялічэньнем ступені абсушэньня балот, адносная колькасьць нягожых балотных зямель зьмяншаецца, і пашыраецца прыгодная для сельскай гаспадаркі плошча (параўнаць гр. 9 і 10).

Далей, зьмяняецца таксама і склад сельска-гаспадарчай плошчы. З павялічэньнем ступені забалочанасьці, процант кармовае плошчы заметна павышаецца і ў першую чаргу за кошт павялічэньня выганоў, пры чым ва ўмовах аднолькавай забалочанасьці правядзеньне мэліарацый яшчэ больш пашырае стасунак кармовай плошчы да пахатных зямель. Гэта можна бачыць і на наступных лічбах:

Табл. № 10. Прыходзіцца сенажаці на 100 дзесяцін пахаці:

На 100 дзесяцін балотных прыходзіцца абсушаных: \ % балотных зямель		I Да 5%	II 5—15	III > 15	Разам
1	0 дзес.	35,4	39,9	51,3	42,6
2	Да 40 дзес.	—	50,2	55,2	54,0
3	40 і больш	35,9	36,9	66,0	50,3
	Разам	35,7	40,4	58,6	49,9
А	Без мэліар.	35,4	39,9	51,3	42,6
Б	З мэліар.	35,9	40,8	59,6	52,0

Усё вышэйсказанае аб зьменах разьмеру і складу землекарыстаньня (у сярэднім на гаспадарку) гаворыць аб тым, што павялічэньне забалочанасьці вядзе, галоўным чынам, да таго, што зьмяняецца склад сельска-гаспадарчай плошчы ў бок адноснага і безадноснага павялічэньня кармовай плошчы і што нескарыстоўваемыя балоты адаймаюць значную частку ўсіх зямель у селішчах з найбольшай агульнай забалочанасьцю. З павышэньнем-жа ступені абсушэньня балотных зямель у роўных умовах забалочанасьці, пашыраецца сельска-гаспадарчая плошча за кошт зьмяншэньня нягожых балот, склад сельска-гаспадарчай плошчы зьмяняецца ў бок адносна большай забясьпекі гаспадарцы сенажацямі і выганамі.

Такім чынам, роля мэліарацый зводзіцца да пашырэньня кармовай базы гаспадаркі, да разьвязаньня ў станоўчы бок кармовага пытаньня.

Павялічэньне кармовай плошчы ў сваю чаргу, відавочна, служыць прадпасылкай да пашырэньня жывёлаводзтва. Большая кармовая плошча дае магчымасьць утрымоўваць большую колькасьць жывёлы.

Што гэта так, можна бачыць з наступнай табліцы, пры чым у ёй (як і надалей) бярэцца толькі адна галоўная галіна жывёлаводзтва—быдла (каровы і маладняк старэйшы 1-го году).

Табл. № 11. Быдла ў сярэднім на 1 двор прыходзіцца галоў:
Tab. № 11. Von Rindviel entfällt im Durchschnitt auf einen Hof an Kopfzahl:

На 100 дзес. балотных прыходзіцца абсушаных: Auf 100 Dessj. Sumpfland entfallen entwässrter: / % балотных зямель: % der Sumpfländereien:		I Да bis 5%	II 5—15	III > 15	Разам Im Ganzen
1	0 дзес. 0 Dessj.	2,24	2,34	2,73	2,45
2	Да 40 дзес. bis 40 Dessj.	—	2,55	2,70	2,66
3	40 і больш дзес. 40 und mehr Dessj.	2,34	2,58	3,01	2,78
	Разам Im Ganzen	2,28	2,49	2,81	2,66
A	Без мэліар. ohne Melioration	2,24	2,34	2,73	2,45
B	З мэлі'ар. mit Melioration	2,34	2,57	2,83	2,72

Сярэдняя колькасьць галоў быдла на 1 двор узрастае, такім чынам, па меры павялічэньня ступені як забалочанасьці, так і абсушэньня, што, відавочна, трэба паставіць у сувязь з роўналежна ўзрастаючай сярэдняй землязабясьпекай гаспадаркі. Зьмена складу сельска-гаспадарчай плошчы ў бок аднoснага пашырэньня кармовай плошчы ў сваю чаргу адбіваецца на колькасьці быдла.

Наступная табліца сьведчыць як раз аб гэтым:

Табл. № 12. Быдла на 100 дзесяцін сельска-гаспадарчай плошчы ў сярэднім прыходзіцца галоў:

На 100 дзес. балотных прыходзіцца абсушаных. / % забалочанасьці зямель.		I Да 5	II 5—15	III > 15	Разам
1	0 дзес.	42,8	47,4	52,1	47,6
2	Да 40 дзес.	—	43,7	49,5	48,1
3	40 і больш дзес.	41,0	47,8	52,4	49,4
	Разам	42,1	46,5	51,0	48,5
А	Без мэліар.	42,8	47,4	52,1	47,6
Б	З мэліар.	41,0	46,3	50,7	48,8

Гэта табліца сьведчыць аб нечаканым, на першы погляд, павялічэньні, разам з ростам забалочанасьці, колькасьці быдла на 100 дзесяцін с.-г. плошчы, што, відавочна, знаходзіцца ў сувязі з паказаным вышэй павялічэньнем адносных разьмераў выгану і сенажаці, якія ўваходзяць у склад сельска-гаспадарчай плошчы; зьмена апошняй у бок аднoснага росту кармовай плошчы вядзе да таго, што на 1 дзесяціну сельска-гаспадарчай плошчы гаспадарка ў селішчах з большай забалочанасьцю ў сярэднім мае магчымасьці ўтрымоўваць большую колькасьць галоў быдла.

Падыходзячы непасрэдна да нашае тэмы, трэба сказаць, што разгляд вышэйпрыведзеных характарыстык арганізацыі сялянскай гаспадаркі (разьмераў пахаці, кармовых ужыткаў, складу і суадносін іх,

разьмеру жывёлаводзтва і г. д.) неабходны быў для большай яснасьці далейшага аналізу зьмен прыбытку ў сувязі з забалочанасьцю і абсушэньнем. Ужо са сказанага раней можна бачыць, што і забалочанасьць, і ступень абсушэньня зямель, сказваючыся на галоўных галінах гаспадаркі, так ці інакш павінны адбіцца і на прыбытку ад гэтых галін, бо прыбытак зьяўляецца канцовым вынікам гаспадарчай дзейнасьці ў тых ці іншых прыродна-гістарычных і эканамічных умовах.

Як вышэй адзначалася, пры выяўленьні прыбытку асобных галін гаспадаркі, намі былі прыняты за падставу „нормы доходности об'ектов обложения с.-х налогом“.

Маючы колькасьць дзесяцін пахаці, сенажаці, і г. д. па кожнаму з узятых 160 селішч, і ведаючы норму прыбытку на адну дзесяціну гэтых ужыткаў для кожнага селішча, простым перамножаньнем лёгка атрымаць па кожнаму з селішч прыбытак ад усёй пахаці селішча, ад усёй сенажаці, ад усяго ліку галоў быдла і г. д.; толькі для выгану, на жаль, нормы прыбытковасьці няма, бо выган у аб'екты абкладаньня с.-г. падаткам не ўваходзіў.

Каб прадставіць удзел выгану ў агульным прыбытку гаспадаркі, намі ўмоўна для ўсіх селішч прыбытковасьць яго была прынята роўнай 3 рублям з дзесяціны, што ў сярэднім складае каля 1/5 прыбытковасьці 1 дзесяціны незаліўнога лугу (15—18 руб.).

Такім чынам быў вылічаны ўвесь прыбытак для кожнага селішча, а шляхам сумаваньня паасобных селішч і для кожнай групы і падгрупы. Значыцца, тый „прыбытак“ аб якім гаворыцца, у значнай ступені прыбытак „вылічаны“, а не рэальны, не сапраўды атрыманы гаспадаркамі селішч, якія ўваходзяць у тую ці іншую групу альбо падгрупу. Больш, бязумоўна, ад узятага за падставу матар'ялу па яго характару атрымаць было і немагчыма, паколькі ўсё вылічэньне мае нарматыўны характар і ня ўсе крыніцы прыбытку ў гаспадарцы падлічаны.

Створанае, такім чынам, „вылічэньне“ прыбытку мела сваёй мэтай знайсьці сярэднія вялічыні, значыцца таксама свайго роду нормы, прыбытковасьці ў асобных, устаноўленых намі групах селішч для таго, каб прасачыць уплыў забалочанасьці і абсушэньня на „агульны“ прыбытак сельскай гаспадаркі, хоць бы і вылічаны з той ступеньню дакладнасьці, якая была дастатковай для працы мясцовых падатковых устаноў. Тая акалічнасьць, што „нормы“ прыбытковасьці вылічаліся аднымі і тымі-ж установамі, у вадных і тых-жа мэтах і па аднолькавым інструкцыям дапушчае іх аднолькавую дакладнасьць і рабіць іх прыгоднымі для мэты параўнаньня.

На жаль, такі мэтад вылічэньня прыбытку не дае магчымасьці у гэтай працы прасачыць, ці зьмяняецца і як зьмяняецца сапраўдная прыбытковасьць (а не „норма“) асобных ужыткаў і відаў жывёлы па меры павялічэньня забалочанасьці зямель і абсушэньня балот. Для гэтага неабходным быў-бы спэцыяльна пастаўлены бюджэтны досьлед.

Вышэй быў апісаны спосаб вылічэньня агульнага прыбытку асобных галін сельскай гаспадаркі селішч, якія ўвайшлі ў тую ці іншую групу нашай групоўкі і там жа была зроблена абмоўка, што вылічаны такім спосабам прыбытак ня можа быць прыняты за сапраўдны, за рэальны прыбытак таго ці іншага селішча, альбо групы селішч.

Так ці інакш, але ўсё-ж, калі не ў бязумоўных значаньнях, дык у адносных, можна ўстанавіць некаторыя тэндэнцыі ў зьменах сярэдняга прыбытку сялянскіх гаспадарак у сувязі са ступеньню забалочанасьці, з аднаго боку, і абсушэньня—з другога.

Наступная табліца гаворыць аб удзельнай ваге ў агульным прыбытку сельскай гаспадаркі паасобных яе галін, пры чым узяты толькі важнейшыя галіны, так што „агульны“ прыбытак трэба разумець умоўна, як суму прыбыткаў вылічаных для разглядаемых галін.

У мэтах параўнаньня прыводзяцца аналёгічныя даныя па бюджэтах Ц. С. У. для сярэдняй гаспадаркі па БССР („Бюллетень Ц. С. У. Бел., выпуск 3 за май—іюнь 1925 г.“).

Табл. № 13. Удзел асобных галін у агульным прыбытку гаспадаркі:
Tab. № 13. Der Anteil der einzelnen ldw Betriebszweige an der Gesammteinnahme der Wirtschaft:

№ групы № der Gruppe	Групы селішч па % балотных зямель / Gruppen der siedelungen nach dem % Gehalt der sumpflandereien	Падгрупа Untergruppe	Падгрупы па ступені абсушэньня (на 100 дзес. балотных абсушана) / Untergruppen nach dem Entwässerung (auf 100 Dessj. Sumpfland sind entwässert	% вылічанага прыбытку ад: % gehatt des errechneten Ertroges von						
				Пахаці Ackerland	Кармовай плошчы Flächeunter Futterkräntern	У тым ліку darunter: Сенажаці Heuschlag	Выгану Weidetrift	Усей с.-г. плошчы Gesammte ldw nutzbare Fläche	Быдла Rindviehbestand	Усяго Im Ganzen
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
I	Да 5% bis 5%	A	0 (без мэліар.) . 0 (ohne meliorirt.	66,2	16,6	16,3	0,3	82,8	17,2	100
			Да 40 дзес. . . . . bis 40 dessj.	—	—	—	—	—	—	—
			> 40 дзес. . . . > 40 dessj.	64,4	17,2	16,8	0,4	81,6	18,4	100
		B	Усяго з мэліар. . . Im Ganzen meliorirt	64,4	17,2	16,8	0,4	81,6	18,4	100
II	5—15%	A	0 (без мэліар.) . . 0 (ohne meliorirt.)	62,7	17,2	15,8	0,4	79,9	[20,1	100
			Да 40 дзес. . . . . bis 40 dessj.	62,2	18,0	17,5	0,5	80,2	19,8	100
			> 40 дзес. . . . . > 40 dessj.	65,1	14,1	13,6	0,5	79,2	20,8	100
		B	Усяго з мэліар. . Im Ganzen meliorirt	64,0	15,6	15,1	0,5	79,6	20,4	100
III	> 15%	A	0 (без мэліар.) . . 0 (ohne meliorirt.)	59,2	19,3	17,8	1,5	78,5	21,5	100
			Да 40 дзес. . . . . bis 40 dessj.	59,8	18,3	16,2	2,1	78,1	21,9	100
			> 40 дзес. . . . . > 40 dessj.	55,9	21,7	19,9	1,8	77,6	22,4	100
		B	Усяго з мэліар. . Im Ganzen meliorirt	58,3	19,6	17,7	1,9	77,9	22,1	100
	Па ўсім групам in allen gruppen	A	0 (без мэліар.) 0 (ohne meliorirt.)	62,6	17,8	17,0	0,8	80,4	19,6	100
			Да 40 дзес. . . . . bis 40 dessj.	60,4	18,3	16,5	1,7	78,7	21,4	100
			> 40 дзес. . . . . > 40 dessj.	60,2	18,4	17,3	1,1	[78.6	21,4	100
		B	Усяго з мэліар. . . Im Ganzen meliorirt	60,2	18,4	16,9	1,5	78,6	21,4	100
I	Да 5% bis 5%		Па усім групам . In allen gruppen	65,5	16,9	16,5	0,4	82,4	17,6	100
II	5—15%		„ „ .	63,7	16,0	15,5	0,5	79,7	22.3	100
III	> 15%		„ „ .	58,4	19,6	17,8	1,8	78,0	20,0	100
			Р а з а м . . . . . im Ganzen	61,3	17,8	16,6	1,2	79,1	20,9	100
	Валавы прыбытак у % селянскіх гаспадарак БССР па бюджэтах Ц. С. У. за 1924-25 г. . . . . Der Rohertrog bäuerlichen Wirtschaften von Belarusi in % nach Budgetaufnahmen der Zentralen Ldw.-Behörde für das Jahr 1924-25.			63,1	—	15,4	—	—	21,5	100

Перш за ўсё можна бачыць, што вылічаны намі прыбытак, будучы выяўлены ў процантах па галінах, амаль што не адрозьніваецца ад дадзеных бюджэтнага досьледу Ц. С. У., калі і тыя і іншыя зьвесткі ўзяць для ўсіх селішч і гаспадарак у сярэднім. Гэта гаворыць аб тым, што „вылічэньне" прыбытку спосабам, паказаным вышэй, адносна дакладна адбівае сапраўдную прыбытковасьць паасобных галін, не кажучы аб безадносных вялічынях, вядома.

Далей, з разгляду проценту прыбытку па асобных галінах, відаць, што галоўную долю ўсяго прыбытку ад сельскай гаспадаркі дае паляводзтва (пахаць)—61,3%, потым ідзе быдла—21% і лугаводзтва—16,6%. Калі прасачыць зьмену гэтых лічбаў па нашай групоўцы селішч, дык можна назіраць значныя розьніцы.

Па меры павялічэньня ступені забалочанасьці зямель селішча, адносны разьмер прыбытку ад паляводзтва правільна падае, пры чым з павялічэньнем ступені абсушэньня балотных зямель селішча, спад гэты яшчэ больш значны. Тлумачэньне такога спаду прыбытку ад паляводзтва з аднаго боку, хаваецца ў некаторым зьмяншэньні сярэдняй забясьпекі гаспадаркі пахацьцю, а з другога—у пашырэньні іншых галін гаспадаркі, як гэта было паказана раней. Больш значная забалочанасьць зямель селішча таксама, як і павялічэньне абсушкі іх пры адным і тым-жа проценту балотных зямель, як была адзначана вышэй, павялічваюць забясьпеку (у сярэднім) гаспадаркі кармовай плошчай што ў сваю чаргу павялічвае колькасьць быдла.

Гэта і сказваецца ў нашай табліцы на памяншэньні адноснага прыбытку ад паляводзтва. Апрача таго, вельмі цікава было-б прагледзіць і якасны бок пытаньня. Павялічэньне быдла у гаспадарцы на 1 дзесяціну сельска-гаспадарчай плошчы і роўналежнае зьмяншэньне пахаці на 1 гаспадарку, відавочна, даюць магчымасьць гаспадарцы разьмяркоўваць больш значнай колькасьцю угнаеньня, гною на кожную дзесяціну пахаці, а з другога боку—большая колькасьць галоў жывёлы, відавочна, патрабуе і больш значных запасаў тых відаў кармоў, якія гаспадарка атрымоўвае ад паляводзтва. Усё гэта ў той ці іншай ступені павінна адбіцца на адпаведнай арганізацыі паляводзтва, на ступені ўгнайваньня пахаці, на прапорцыі культур і, ў выніку, на сярэдняй прыбытковасьці 1 дзесяціны пахаці.

Як ужо адзначалася вышэй, тый факт, што пахаць зьяўляецца крыніцай больш чым паловы ўсяго прыбытку ў гаспадарцы, адбіўся на працы мясцовых падатковых установ у тым сэнсе што нормы прыбытковасьці для пахаці значна зьмяняюцца па асобным селішчам (у межах, нават, сельсавету). Відавочна пры гэтым ігралі значную ролю мясцовыя прыродна-гістарычныя і эканамічныя (якасьць і скарыстаньне пахаці, ў прыватнасьці) умовы.

Калі падлічыць прыбытак ад пахаці па селішчах, якія ўваходзяць у адну групу, альбо падгрупу нашае групоўкі, і, потым, падзяліўшы на лік дзесяцін пахаці ў гэтых падгрупах, атрымаць сярэднюю (узважаную) прыбытковасьці 1 дзесяціны пахаці, то атрымоўваецца наступная табліца:

Табл. № 14. Сярэдняя (узваж.) прыбытку ад 1 дзес. пахаці ў рублёх:

% балотных зямель. / Па мэліарацыях.		I	II	III	Разам
		Да 5	5—15	>15	
А	Без мэліар.	33,1	31,2	31,0	31,8
Б	З мэліар.	29,0	30,1	31,8	31,0

Перш за ўсё відаць па ўсім групам разам і па кожнай паасобку (акрамя найбольш забалочанай III-й), што сярэдняя прыбытковасьць пахаці ў селішчах, якія маюць мэліарацыі ніжэй, чым тая-ж прыбытковасьць у селішчах без мэліарацый, якія знаходзяцца ў больш ці менш аднальковых умовах забалочанасьці з першымі, што на першы погляд здаецца некалькі нечаканым. Далей, у селішчах без мэліарацый прыметна некаторае зьніжэньне прыбытковасьці 1 дзесяціны пахаці па меры павышэньня процанту балотных зямель.

У селішчах-жа, землі якіх больш ці менш мэліарырваны, сярэдняя прыбытковасьць пахаці па меры павялічэньня забалочанасьці не падае (у адзнаку ад не-мэліарыраваных селішч), а наадварот, нават некалькі павышаецца. Для тлумачэньня адзначаных зьяў успомнім наступныя дадзеныя.

Табл. № 15. Сярэдні процант балотных зямель:

% балотных зямель. / Па мэліарацыях.		I	II	III	Разам
		Да 5	5—15	>15	
А	Без мэліар.	0,8	8,3	30,1	16,3
Б	З мэліар.	3,1	10,6	26,3	20,4

Калі супаставіць гэтыя лічбы з прыбытковасьцю 1 дзесяціны пахаці, то ўбачым, што ў селішчах з мэліарацыямі сярэдні процант балотных зямель у падрахунку 20,4, сярэдняя прыбытковасьць пахаці—31,0 руб.; у селішчах без мэліарацый процант балотных зямель—16,3, прыбытковасьць—31,8. Праводзячы такое-ж супастаўленьне па кожнай групе селішч, якія знаходзяцца у розных умовах забалочанасьці, можна бачыць, што зьмяншэньне сярэдняй прыбытковасьці аднае дзесяціны пахаці ў селішчах з мэліарацыямі супадае з павялічэньнем у гэтых селішчах сярэдняга процанту балотных зямель, у параўнаньні з аналёгічнымі селішчамі, але без мэліарацый. Тоя-ж можна бачыць, калі параўняць (у паземным напрамку) дадзеныя абедзьвых табліц для селішч без мэліарацый: % балотных зямель I гр.—0,8, II—8,3 і III—30,1, сярэдняя прыбытковасьць (адпаведна)—33,1, 31,2 і 31,0.

Такім чынам усе прыведзеныя дадзеныя, як быццам гавораць аб тым, што павышэньне агульнай забалочанасьці зямель вядзе да зьмяншэньня сярэдняй прыбытковасьці пахаці, таксама як і павышэньне процанту нягожых зямель, якое разгледжана вышэй. Ня зусім ясным застаецца павялічэньне сярэдняй прыбытковасьці, якое ідзе не адваротна, а роўналежна павышэньню процанту балотных зямель для селішч з мэліарацыямі. Тут, відавочна, сказваецца якасны бок дзеяньня абсушэньня балотных зямель, якое апроч павялічэньня кармовай плошчы, апроч павялічэньня колькасьці быдла (у параўнаньні з селішчамі не мэліарыраванымі), яшчэ, відавочна, паляпшае і якасьць быдла, што ў сваю чаргу адбіваецца на прыбытковасьці паляводзтва. Бязумоўна, гэтыя дапушчэньні патрабуюць значнай праверкі на больш канкрэтных матар'ялах. Большага ад нашага матар'ялу, па самаму яго характару (паселішчныя дадзеныя) чакаць і не прыходзіцца.

Пераходзячы, далей, да наступнай галіны гаспадаркі—кармовай плошчы, можна назіраць, што па меры павялічэньня ступені забалочанасьці зямель селішча, а таксама і ступені абсушэньня іх, процант прыбытку ад кармовай плошчы некалькі павышаецца, пры чым асабліва рэагуе пры гэтым процант прыбытку ад выгану, што тлумачыцца пашырэньнем гэтае часткі сельска-гаспадарчай плошчы.

Найбольш-жа цікава супаставіць з аднаго боку прыбытак (у процантах) ад сельска-гаспадарчай плошчы, і з другога—ад быдла, бо як раз у гэтае частцы нашае табліцы трэба было чакаць найбольш прыметных зьмен. Калі для большай навочнасьці дадзеныя, якія атрыманы ў гр. гр. 9 і 10 табліцы № 13, паказаць у відзе крывых, то атрымаем наступны малюнак (дыягр. № 1 і 2):

Дыяграма № 1.

Прыбытак ад сельска-гаспадар. плошчы ў процантах да ўсяго прыбытку:



Склад сярэдняга прыбытку гаспадаркі ад галоўных яе галін зьмяняецца.

На прадстаўленых дзьвёх дыяграмах (кар. № 1 і 2) можна бачыць, як па меры павялічэньня процанту балотных зямель, зьніжаецца ўдзельная вага прыбытку ад паляводзтва і лугаводзтва (разам узятых) і адначасова ўзрастае ад жывёлаводзтва, больш правільна—галоўнай яго галіны-быдла. Асабліва правільна (амаль што ў відзе простай лініі) ідзе гэтая зьмена складу ўсяго прыбытку гаспадаркі ў селішчах, якія маюць мэліарацыі. Крывая, якая паказвае спад процанту прыбытку ад сельска-гаспадарчай плошчы, займае при ўсех ступенях забалочанасьці, больш нізкае палажэньне, праходзіць ува ўсіх сваіх кропках пад аналёгічнай крывой для селішч, якія мэліарацый ня маюць, і, наадварот, лінія, якая паказвае павышэньне ўдзельнай вагі прыбытку ад быдла пры павялічэньні ступені забалочанасьці ў селішчах якія маюць мэліарацыі, ідзе над такой жа лініяй для селішч без мэліарацый. Гэтае сьведчыць аб тым, што абсушэньне балотных зямель дзейнічае ў тым жа напрамку, г.-зн. яшчэ больш павялічвае ролю жывёлаводзтва, як крыніцу прыбытку ў гаспадарцы, дзякуючы пашырэньню гэтае галіны за кошт пашырэньня лугаводзтва і выгану і адносна скарачэньня паляводзтва.

Такім чынам, разглядзеўшы ўплыў ступені забалочанасьці зямель на прыбытак галоўных галін сельскай гаспадаркі, выяўлены ў каш-

тоўнасных адзінках і на ўдзельную вагу гэтых галін у агульным („агульным“—прымаючы пад увагу зробленую раней абмоўку) прыбытку гаспадаркі, прыходзім да вываду, што, чым больш забалочаны землі селішча, тым больш спрыяюча (адносна) складаюцца ўмовы гаспадараваньня для жывёлаводзтва (хоць-бы і экстэнсыўнага). Роля-ж мэліарацый пры наяўнасьці балотных зямель зводзіцца да таго, што, з аднаго боку палепшаюцца ўмовы для паляводзтва (большая землезабясьпека), а галоўнае—яшчэ больш палепшаюцца ўмовы для таго-ж жывёлаводзтва за кошт скарачэньня нягодных, нескарыстоўваемых балот, яшчэ больш у выніку гэтага павышаецца ўдзельная вага жывёлаводзтва ў агульным прыбытку гаспадаркі.

Дыяграма № 2.

Прыбытак ад быдла ў працантах да ўсяго прыбытку:



Апрача таго, калі парагледзіць усе вышэйзьмяшчоныя табліцы, то лёгка заўважыць, што ўплыў ступені абсушкі найбольш правільна і найбольш рэзка сказваецца ва ўмовах найбольшага процанту балотных зямель.

З усяго сказанага відаць, што ва ўмовах многабалотнай Беларусі, пры наяўнасьці значнай колькасьці зусім нягожых для сельскай гаспадаркі, зусім нескарыстоўваемых балот, кажучы аб сельска-гаспадарчай перазалюднёнасьці, нельга забывацца на абсушэньне гэтых нягожых зямель, нельга забывацца на мэліарацыі, бо ў гэтым адна з магчымасьцяў зьмягчэньня перазалюднёнасьці, бо як мы бачылі, абсушэньне балот павялічвае землезабясьпеку сельскае гаспадаркі, зьмягчае зямельны голад селяніна.

З другога боку, у тых жа беларускіх умовах нельга гаварыць аб перавядзеньні сялянскай гаспадаркі на жывёлаводныя рэйкі, не спамянуўшы пры гэтым аб гэтакім важным чыньніку гэтага пераходу, як мэліарацыя, бо мы бачалі, што абсушэньне балотных зямель павялічвае кармовыя магчымасьці сялянскай гаспадаркі, за кошт тых жа нягожых, нескарыстоўваемых балот, тым самым павялічвае ўдзельную вагу жывёлаводзтва ў агульным прыбытку гаспадаркі.

Далей трэба паставіць гэткае пытаньне: калі ступень забалочанасьці і абсушэньне зямель адбіваюцца з аднаго боку на сярэдняй

забясьпецы сялянскай гаспадаркі зямлёй і жывёлай, г.-зн. на разьмерах гаспадаркі, з другога—на ўдзельнай ваге асобных галін гаспадаркі ў агульным прыбытку, то яны павінны так ці інакш адбіцца і на разьмерах агульнага прыбытку гаспадаркі; ці рабіць уплыў, сапраўды, зьмена ступені забалочанасьці і абсушэньня на агульную, сумарную (ад усіх разглядаемых галін) прыбытковасьць гаспадаркі, і як, у які бок робіцца гэты ўплыў?

З мэтай высьвятленьня гэтага пытаньня быў зроблены наступны разьлік:

Табл. № 16.
Tab. № 16.

№ групы. № der Gruppen.	Групы селішч па % балотн. зямель. Gruppen der Siedelungen nach dem % Gehalt der Sumpfländereien.	Сярэдні % балотных зямель. Durchschnitsprozent der Sumpfländereien.	Падгрупа па ступені абсушэньня (на 100 дзесяцін балотных абсушана дзесяцін). Untergruppen nach dem Grade der Entwässerung (auf 100 Dessj. Sumpfland entfallen entwässerte).	Усяго прыбытку у рублёх. Gesammt-Ertrag in Rbln.	Лік усіх гаспадарак. Anzahl sämmtlicher Wirtschaften.	Усяго прыбытку на 1 гаспадарку ў сярэднім рублёў. Gessammt-Ertrag im Durchschnitt von einer Wirtschaft in Rbl.	Спад прыбытку ў рублёх. Sinken des Ertrages in Rbl.		Страта прыбытку ў % да усяго (гр. 9 ў % да гр. 5). Einbusse am Ertrage in % zu allen (N 9 in % zur 5-ten).	Страта прыбытку ў руб. на 1 дз. усей зямлі. Einbusse am Ertrage in Rbl. auf eine Dessjatine des gesammten Landes.
							На 1 гаспадар. у сярэднім. In einer Wirtschaft im Durchschnitt.	Па ўсіх гаспадарках. In sämmtlichen Wirtschaften.		
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11
I	Да 5% bis 5%	0,8	0 без мэліар. . . 0 (ohne Melioration)	256307	1276	200,87	0	0	0	0
		—	Да 40 дзес. . . bis 40 Dessj.	—	—	—	—	—	—	—
		3,1	> 40 дзес. . . > 40 Dessj.	155679	839	185,55	15,32	12853,48	—	—
		3,1	Усяго з мэліар. . im Ganzen meliorirt.	155679	839	185,55	15,32	12853,48	—	—
II	5—15 %	8,3	0 без мэліар. . . 0 (ohne Melioration)	230779	1357	170,07	30,80	41795,60	—	—
		10,5	Да 40 дзес. . . bis 40 Dessj.	278690	1492	186,79	14,08	21007,36	—	—
		10,8	> 40 дзес. . . . > 40 Deszj.	467786	2534	184,60	16,27	41228,18	—	—
		10,6	Усяго з мэліар. . im Ganzen meliorirt.	746476	4026	185,41	15,46	62241,96	—	—
III	>15 %	30,1	0 без мэліар. . 0 (ohne Melioration	274206	1517	180,75	20,12	30522,04	11,1	2,71
		26,2	Да 40 дзес. . . . bis 40 Dessj.	955156	5083	187,91	12,96	65875,68	6,9	1,78
		26,5	> 40 дзес. . . > 40 Dessj.	696361	3579	194,57	6,30	22547,70	3,2	0,88
		26,3	Усяго з мэліар. im Ganzen meliorirt	1651517	8662	190,66	10,21	88439,02	5,3	1,41
	Разам Im Ganzen	16,3	0 без мэліар. . . 0 (ohne Melioration)	761292	—	—	—	72317,64	9,5	2,82
		22,3	Да 40 дзес. . . . bis 40 Dessj.	1233846	—	—	—	86883,04	7,0	1,87
		18,4	> 40 дзес. . . . > 40 Dessj	1319826	—	—	—	76629,36	5,8	1,68
		20,4	Усяго з мэліар. . im Ganzen meliorirt.	2553672	—	—	—	163534,46	6,4	1,78
			Разам . . . Im Ganzen	3314964	—	—	—	235852,10	7,1	2,00

Табліца гэтая паказвае, што сярэдні разьмер прыбытку на адну гаспадарку (гр. 7) найбольш высокі ў групе селішч з найменшым процантам балотных зямель і без мэліарацый.

Па меры росту забалочанасьці гэты сярэдні прыбытак на двор спадае, але пры адным і тым жа проценту балотных зямель у селішчы з мэліарацыяй ён вышэй, чым у селішчах без мэліарацый.

Разглядаючы першую падгрупу селішч без мэліарацый і пры 0,8% (у сярэднім) балотных зямель, як тую, што знаходзіцца ў найбольш спрыяючых (у сэнсе забалочанасьці) умовах, параўнаем з сярэднім прыбыткам на адну гаспадарку гэтай падгрупы аналёгічныя лічбы (гр. 7) іншых падгруп, і розьніцу занясём у гр. 8 той жа табліцы.

Ведаючы лік гаспадарак у кожнай падгрупе селішч і маючы „спад" прыбытку у сярэднім на гаспадарку, шляхам перамножаньня гэтых данных (гр. 6 × гр. 8 = гр. 9) атрымаем спад сярэдняга прыбытку для кожнае падгрупы па ўсім селішчам, уваходзячым у яе (гр 9). Падлічыўшы суму аднолькавых падгруп розных груп па проценту балотных зямель атрымаем у падрахунку (гр. 9) агульную страту прыбытку па ўсім селішчам, якая выцякае з павялічэньня ступені забалочанасьці зямель (235852,10 руб.) з падзелам на падгрупы па ступені абсушэньня. Калі аднесьці гэтую страту да вылічанага прыбытку (усяго) па кожнай групе (гр. 5), то будзем мець процант страты прыбытку (гр. 10) ад забалочанасьці зямель звыш 0,8% у сярэднім.

Як відаць з гр. 10, вылічаная такім чынам страта прыбытку гаворыць аб тым, што павялічэньне ступені забалочанасьці ва ўзятых селішчах ад 0,8 да 19,0% балотных зямель у сярэднім вядзе (наогул па ўсім селішчам) да таго, што прыбытак зьмяншаецца на 7,1% ад сваіх разьмераў пры звычайных умовах.

Найбольш значна гэтая страта у селішчах без мэліарацыі—9,5% і пры гэтым павялічваецца па гэтых селішчах да 11,1% прыбытку разам з павялічэньнем забалочанасьці да 30,1%. Такім чынам можна бачыць, як ступень забалочанасьці, павялічваючыся, сказываецца адмоўна на агульным разьмеру сярэдняга прыбытку гаспадаркі, зьніжаючы апошні на 7,1% у сярэднім; у селішчах жа, якія ня маюць мэліарацый, павялічэньне забалочанасьці вядзе да яшчэ большай страты магчымага прыбытку.

Яшчэ больш выразна можна назіраць, як ужо было адзначана вышэй, уплыў ступені абсушэньня на прыбытак гаспадаркі. Перш заўсё, калі параўняць усе селішчы з мэліарацыямі і селішчы бяз іх, то відаць, як праведзенае абсушэньне балот зьмяншае процант страты прыбытку ад забалочанасьці, ці, кажучы іншымі словамі, павышае прыбытак гаспадаркі мэліарыраванай у параўнаньні з гаспадаркамі тых-жа балотных селішч, але без мэліарацый. Апрача таго, чым больш абсушаны балотныя землі селішча, тым больш зьмяншаецца страта прыбытку, тым больш набліжаецца разьмер прыбытку да ўмоў звычайных (умоўна)

Найбольш рэзка і прыметна сказываецца наяўнасьць абсушэньня. ва ўмовах многабалотных селішч, дзе адзін чыньнік наяўнасьці мэліарацыйных прац зьмяншае страту ад забалочанасьці з 11,1% да 5,3%, г.-зн. амаль што ў два разы, і яшчэ больш прыметны ўплыў ступені абсушэньня, бо пры больш 40% абсушаных балотных зямель страта прыбытку зьмяншаецца больш чым у тры разы, будучы выяўлена ў процантах да ўсяго прыбытку.

Уплыў ступені абсушэньня балотных зямель на зьмену страты прыбытку ад забалочанасьці можна паказаць у відзе крывых ліній.

Дыяграма № 3.

Страта прыбытку і ступень абсушэньня (усе селішчы):



Як відаць з гэтае дыяграмы, павялічэньне ступені абсушэньня балотных зямель вядзе да раўналежнага зьніжэньня абедзьвых крывых, дзе верхняя—страта прыбытку ў процантах, а ніжэйшая—страта прыбытку на 1 дзесяціну ўсёй зямлі. Гэта навочна гаворыць аб тым, што правядзеньне абсушыцельных прац ёсьць добры спосаб павысіць сярэдні прыбытак гаспадаркі ва ўмовах большай ці меншай забалочанасьці зямель селішча, альбо, што адно і тоя, зьменшыць страту прыбытку сельскай гаспадаркі, якая выклікана забалочанасьцю зямель.

Для праверкі апісанай залежнасьці паміж забалочанасьцю і абсушэньнем зямель з аднаго боку і сярэднім прыбыткам гаспадаркі—з другога, былі вылічаны каэфіцыенты карэляцыі (па спосабу сум з праверкай), дзе за „X“ быў прыняты процант балотных зямель у кожным з 160 селішч, а за „У“ вылічаны прыбытак у сярэднім на 1 гаспадарку ў тых-жа селішчах. Пры разьмяркаваньні кожнага з абодвых варыяцыйных радоў па зьмяншаючайся ступені, канцовыя члены (як у бок максім., так і мінім.) далі па тым ці іншым прычынам (непаўната, ці памылкі ў выхадных паселішчных картках пры запаўненьні іх) вельмі рэзкія адхіленьні, у выніку чаго, прышлося іх адкінуць, чаму з 160 селішч і засталося 138.

Атрыманыя каэфіцыенты відаць з наступнай табліцы:

№ падгруп	Падгрупа па ступені абсушэньня	Лік выпадкаў (N)	Каэфіцыэнт карэляцыі (r)	Сярэднія памылкі (mr)
1	0—без мэліар.	37	— 0,38	± 0,12
2	Да 40 дз. абсуш. на 100 балотных	40	— 0,31	± 0,14
3	Больш 40 дзес.	61	— 0,09	± 0,12
		138	—	—

Перш за ўсё ва ўсіх трох падгрупах па абсушэньню знак карэляцыі адмоўны, г.-зн. ёсьць тэндэнцыя да паніжэньня сярэдняга прыбытку гаспадаркі па меры павялічэньня забалочанасьці зямель. Вялічыня каэфіцыенту карэляцыі толькі ў першым выпадку—у селішчах без мэліарацый—дазваляе з большай ці меншай упэўненасьцю казаць аб наяўнасьці карэляцыйнай залежнасьці. У астатніх жа падгрупах каэфіцыэнт карэляцыі зьмяншаецца і сярэдняя памылка яго павялічваецца, што асабліва прыметна ў апошняй падгрупе, ва ўмовах найбольшага абсушэньня балотных зямель.

Інакш кажучы, тут бачым тоя, аб чым ужо абгаварвалася вышэй: 1) павялічэньне забалочанасьці зямель селішча вядзе да некаторага зьніжэньня („страты") сярэдняга прыбытку гаспадаркі, 2) найбольш прыметны гэты спад прыбытку ў селішчах без мэліарацый на балотных землях і 3) чым больш абсушаны балотныя землі, тым менш сказваецца на сярэднім прыбытку адмоўнае дзеяньне забалочанасьці зямель.

Канчаючы на гэтым працу, неабходна яшчэ раз абгаварыцца. Характар скарыстанага матар'ялу – паселішчныя даныя, паселішчныя нормы прыбытковасьці, „вылічаны" прыбытак, сярэднія па селішчам і групам селішч вялічыні—па першае, і малая колькасьць селішч—выпадкаў, нязначная тэрыторыя дасьледваньня—па другое, ня даюць магчымасьці казаць аб якіх небудзь пашырэньнях атрыманых вынікаў, экстарпаляцыі іх. Усё гаворанае вышэй аб сувязі сярэдняга прыбытку сялянскай гаспадаркі з забалочанасьцю і абсушэньнем зямель трэба разумець дзеля гэтага, як некаторыя тэндэнцыі, і, значыцца, праца мае ў значнай ступені арыентыровачны характар. Мэта яе—выявіць наяўнасьць тых ці іншых тэндэнцый у пастаўленых пытаньнях для больш дэталёвай паглыблёнай праработкі іх на большым матар'ялу падворнага і бюджэтнага досьледу, якое і была зроблена экспэдыцыяй у 1927 годзе. Узяўшы пад увагу такую абмоўку, у выніку гэтае працы можна бачыць наступнае:

1) Як ступень забалочанасьці зямель, так і ступень іх абсушэньня азначаным чынам адбіваецца на сярэднім разьмеру і складу прыбыткаў сельскай гаспадаркі дасьледаваных 160 селішч.

2) Ва ўмовах многабалотных селішч, удзельная вага жывёлаводзтва ў агульным прыбытку гаспадаркі павышаецца, што тлумачыцца большай забясьпекай гаспадаркі кармовай плошчай, большай колькасьцю быдла (у сярэднім) у гаспадарцы. Роля абсушэньня балот зводзіцца да таго, што скарачаючыяся плошчы нескарыстоўваемых, нягожых балот пераходзяць у кармавыя ўжыткі, яшчэ больш пашыраюць кармовыя магчымасьці гаспадаркі, што яшчэ больш павышае ролю жывёлаводзтва ў агульным прыбытку гаспадаркі.

3) „Увесь" прыбытак у сярэднім на адну гаспадарку па меры павялічэньня забалочанасьці мае тэндэнцыю да спаду, бо адносна зьмяняюцца разьмеры і склад сельска-гаспадарчай плошчы з аднаго боку і ўдзельная вага ў агульным прыбытку паляводзтва і жывёлаводзтва—з другога. Абсушэньне балотных зямель пры гэтым, маючы тэндэнцыю затрымаць гэты спад прыбытку, як бы адхіляе адмоўнае дзеяньне забалочанасьці. Найбольш прыметна спрыяючае дзеяньне абсушэньня балот ва ўмовах многабалотнасьці зямель селішча, пры чым, па меры павялічэньня ступені абсушэньня, станоўчы ўплыў яго на прыбытак гаспадаркі выступае найбольш выразна.

К. С. Загорский

РЭЗЮМЕ

Главной задачей данной работы являлось ориентировочное выяснение основных тенденций в изменении доходности крестьянского хозяйства в связи с заболоченностью и осушением земель.

Материалами послужили: 1) выборочное поселенное описание крестьянского хозяйства 160 селений Бобруйского и Слуцкого округов БССР произведенное экспедицией по экономике мелиораций в 1926 г. 2) нормы доходности об'ектов обложения крестьянского хозяйства единым сельско-хозяйственным налогом, опубликованные Бобруйским и Слуцким Окрисполкомами.

В результате работы можно видеть следующее:

1) Как степень заболоченности земель, так и степень их осушения определенным образом отражаются на среднем размере и составе доходов крестьянского хозяйства обследованных 160 селений.

2) В условиях многоболотных селений, удельный вес животноводства в общем доходе хозяйства повышается, что об'ясняется большей обеспеченностью хозяйства кормовой площадью, большим количеством рогатого скота (в среднем) в хозяйстве. Роль осушения болот сводится к тому, что сокращающиеся площади неиспользуемых, неудобных болот переходят в кормовыя угодия, еще больше расширяют кормовые возможности хозяйства, чем еще больше повышают роль животноводства в общем доходе хозяйства.

3) „Весь“ доход в среднем на одно хозяйство по мере увеличения заболоченности имеет тенденцию к падению, так как относительно изменяются размеры и состав сельско-хозяйственной площади с одной стороны и удельный вес в общем доходе полеводства и животноводства—с другой. Осушение болотных земель при этом, имея тенденцию задержать это падение дохода, как бы устраняет отрицательное действие заболоченности. Наиболее заметно благоприятное действие осушения болот в условиях многоболотности земель селения, при чем, по мере увеличения степени осушения, положительное влияние его на доход среднего хозяйства выступает наиболее отчетливо.

K. S. Sagorsky.

Zusammenfassung.

Die hauptsächlichste Aufgabe vorliegender Arbeit besteht in einer orientierenden Klarstellung der einer Veränderung in der Ertragsfähigkeit bäuerliher Wirtschaften zu Grande liegenden Tendenzen im Zusammenhange mit der Versumpfung und Entwässerung des Landes.

Als Grundlage der Arbeit wurden benutzt: 1) Eine in auserlesenen Siedelungen veranstaltete Beschreibung der bäuerlichen Wirtschaft in 160 Siedelungen des Bobruiskischen und Slutzkischen Kreises von der S. S. Belarussischen Republick, ausgeführt im Jahre 1926 von der Expedition für die Oekonomik von Meliorationen und 2) die Ertragsnormen für Abgabenobjekte der bäuerlichen Wirtschaft zwecks Erhebung der einheitlichen landwirtschaftlichen Abgabensteuer, welche von dem Bobruiskischen und Slutzkischen Bezirksamte veröffentlicht worden sind.

Als Schlussergebniss dieser Arbeit lässt sich Folgendes aufführen: 1) Sowohl die Höhe der Versumpfung des Landes, als auch der Grad der Entwässerung derselben übt in vollkommen bestimmter Weise einen Einfluss auf die durchschnittliche Höhe, sowie auf den Bestand des Ertrages der bäuerlichen Wirtschaften in den 160 untersuchten Siedelungen aus.

2) Unter den Verhältnissen sumpfreicher Siedelungen wächst das specifische Gewicht der Vichzucht im Gesammtertrage einer Wirtschaft an, was sich durch erhöhte Sicherstellung der Wirtschaft durch Futtermittel tragende Flächen erklären lasst, was eine (durchschnittliche) Steigerung des Rindvichbestandes in der Wirtschaft zur Folge hat. Die Rolle, welche eine Entwässerung der Sümpfe mit sich bringt, besteht darin, dass die Flächen ungenutzter sumpfiger Oedländereien sich in Futterkränter tragende Flächen verwandeln, und dadurch die Möglichkeit für die Wirtschaften, ihre futterliefernden Flächen zu vergrössern, steigert, in Folge wessen die Rolle der Vichzucht im Gesammtertrage einer Wirtschaft von neuem an Bedeutung zunimmt.

3) Der „Gesammt"—Ertrag im Durchschnitt berechnet auf eine einzige Wirtschaft hat je nach dem Grade der Steigerung von Versumpfung die Tendenz zu sinken, da sich verhältnissmässig die Grössenverhältnisse und der Bestand der lundwirtschaftlich genutzten Flächen einersüts und das spezifische Gewicht im Gesammtertrage von Ackerbau und Viehzucht andrerseits ändern. Eine Entwässerung versampfter Gelände beseitigt dabei, indem sie die Tendenz hat dieses Sinken des Ertrages aufzuhalten, gewissermassen die negative Wirkamkeit der Versumpfung. Am meisten macht sich die wohltätige Wirkung einer Trockenlegung von Sümpfen bemerkbar unter den Verhältnisser, wie sie Siedelungen mit sumpfreichen Ländereien darbieten, wobei, je nach Massgobe einer Zunahme der Entwässerung, die positive Wirkung derselben am allerdeutlichsten zu Tage tritt im Ertrage einer mittleren Wirtschaft.

А. І. Гарэлікаў.

Уплыў балот, нягожых зямель і асушэньня на галоўныя бакі сялянскай гаспадаркі Беларускага Палесься.

Уступ. Асабістыя водныя ўмовы Беларусі, якія характарызуюцца наогул вельмі незначным ухілам дна амаль усіх рэчак, працякаючых на яе тэрыторыі, палажылі незгладжальны адбітак на глёбавыя і іншыя яе прыродныя ўмовы. Малая скорасьць рэчак, як вынік такога слабага ўхіла дна іх, а таксама слабая праніцаемасьць падглёбы садзейнічалі павышанай забалочанасьці зямель з аднаго боку, а з другога,—дзякуючы скапленьням вялікіх мас рачных пяскоў,—утварэньню, ў некаторых мясцох Беларусі, даволі значных пясчаных прастораў.

Больш за ўсяго балоты і пяскі распаўсюджаны ў заходняй частцы Беларусі, якая завецца Палесьсем. Балоты, якія цягнуцца нярэдка 5—10 і болей вёрст, часта зьмяняюцца там непраходнымі лясамі, лясы ўступаюць месца ня менш абшырным пясчаным прасторам, якія толькі дзе-ня-дзе парасьлі кустамі лазы і пясчанай асакі. Вось аснаўны фон ландшафту гэтай часткі Беларусі (Палесься). Пахаць тут толькі невялічкімі плямамі ўкраплена сярод балот і пяскоў. Таму і ступень насяленнасьці Палесься наогул значна ніжэй сярэдняй па Беларусі. А іменна: па Беларусі у сярэднім на 1 кв. кілёмэтр на 1 студзеня 1926 г. прыходзіцца 39 чалавек, па Палесьсю-ж (Мазырская, Бабруйская і быўш. Слуцкая акругі)—усяго толькі 30 чалавек [1]).

Ужо гэтае адно кажа аб тым, што збытак балот і пяскоў ня мог не адбіцца на гісторыка-бытавых і эканамічных умовах гэтага раёну. Да інакш, канечна, і быць не магло, бо Палеская раўніна, да правядзеньня на ёй асушэньня, уяўляла сабой амаль што сплашное абшырнае балота, асобныя часткі якога даходзілі да 1400 кв. вёрст [2]).

Значная частка гэтага балота большую частку году знаходзілася пад вадой, астатняя-ж частка была іспешчрана частымі зыбунамі, якія рабілі немагчымым карыстаньне гэтым балотам ні ў якасьці лугу, ні ў якасьці выпасу для жывёлы.

З таго часу, дзякуючы дзейнасьці асушальных каналаў, вельмі багата чаго перамянілась у прыродных і эканамічных умовах Палесься. Аднак колькасьць вільгаці ў шмат якіх мясцох яшчэ маецца ў лішку.

Калісь-то непраходзімыя „топі“ да гэтага часу зрабіліс проста балотамі, і вядуць лютую вайну за сваё існаваньне як з прыродай, так і з чалавекам.

Аб разьмерах эканамічнай карысьці ад асушэньня казённых балот і лясоў даволі красамоўна кажа кніжка Оппокова—Дубаха: „Результаты осушения в Минской губ.“

Гэтая-ж праца мае сваёй задачай прасачыць уплыў забалочанасьці, нягожых зямель і асушэньня на сялянскую гаспадарку Палесься.

---

[1]) Статыстычны штогоднік і каляндар Белар. Ц. С. У. на 1927 г.
[2]) Очерк работ Западной экспедиции по осушению болот.

Характарыстыка матар'ялаў. Матар'ямамі для яе паслужылі галоўным чынам, бюджэты сялянскіх гаспадарак, сабраныя экспэдыцыей па вывучэньню пытаньняў эканомікі мэліарацый у 1926 г.

Дапасавальна да абсьледванай тэрыторыі гэтыя бюджэты разьмяркоўваюцца такім чынам.

Табл. № 1. Разьмяркаваньне бюджэтаў па адміністрацыйных раёнах.

№№ па парадку	Назва раёнаў	Сабрана бюджэтаў		У ва скольк. селішчах сабран. бюдж.
		Поўных	Усіх	
	Бабруйскай акругі:			
1	Буда-Кашалёўскі	1	5(1)	2
2	Гарадзецкі	1	5	2
3	Рагачоўскі	4	12	4
4	Жлобінскі	4	11	4
5	Стрэшынскі	2	6	2
6	Бабруйскі I	3	8(1)	2
7	Бабруйскі II	2	6(1)	2
8	Парыцкі	3	9	3
9	Глускі	4	12(3)	4
10	Клічоўскі	3	9	3
11	Асіпавіцкі	3	9(3)	3
12	Сьвіслацкі	4	12(2)	4
	Па акрузе	34	104(12)	35
	Слуцкай акругі:			
1	Капыльскі	1	5	2
2	Грэскі	2	6(1)	2
3	Старобінскі	2	6(1)	2
4	Стара-Дарожскі	1	3	1
5	Любаньскі	2	6	2
	Па акрузе	8	26(2)	9
	Мазырскай акругі:			
1	Азарыцкі	5	12(1)	4
2	Пятрыкоўскі	4	11(4)	4
	Па акрузе	9	23(5)	8
	Усяго	51	153(19)	52

Усяго по 52 селішчах, з 205 усіх абсьледаваных экспэдыцыей, сабрана ў агуле 153 бюджэты, з якіх 51 поўны—з вучотам затрат працы па ўсіх галінах, і 102 скарочаных, без вучоту працы (як правіла, у кожным з бюджэтных селішчаў складалась па 1 поўнаму і 2 скарочаных бюджэты).

Але пры крытыцы гэтага матар'ялу 21 бюджэт [1]), з прычыны да-

[1]) Лік іх паказан па кожнаму раёну ў дужках графы 2 табл. № 1.

волі значных адхіленьняў маючыхся ў іх данных, галоўным чынам у бок буйнасьці гаспадаркі, ў падлік ня былі ўключаны. Па колькі-ж сабраныя бюджэты зьяўляюцца рэпрэзэнтатыўнымі для гаспадарак абсьледаванай тэрыторыі, паказвае наступная табліца.

Табл. № 2. Характарыстыка бюджэтаў у параўнаньні з данымі вясеньняга апытваньня Ц. С. К. Б.

Назва мелраёнаў і склад іх	Па якіх матяр'ялах	На 1 гаспадарку прыходзіцца:				% пасеву ад пахаці	З 100 дз. пасеву ў полі, дзесяцін пад:			% кароў да ўсяе рагатае жывёлы
		Душ абоега роду	Пасеву дзесяцін	Працоўных коняйівал.[1])	Кароў		Жытам	Бульбаю	Лёнам	
I. Лугава-мурожны (Буда-Кашалёўскі і	Па вясен. апыт. .	5,6	3,8	1,3	1,6	74,0	38,9	12,3	4,6	63,1
Гарадзецкі)	Па бюдж. экспэд.	6,6	4,3	1,4	2,1	90,4	42,2	15,5	3,2	67,8
II. Балотна-заліўны (Стрэшынскі, Жло-	Па вясен. апыт. .	5,5	3,5	1,5	1,8	73,5	42,4	13,9	3,5	62,8
бінскі і Рагачоўскі)	Па бюдж. экспэд.	6,3	3,5	1,4	2,2	71,7	41,0	15,7	3,4	65,5
III. Балотна-пясчаны (Глускі і Парыцкі)	Па вясен. апыт. .	5,4	3,6	1,4	2,1	70,8	46,6	14,5	3,4	59,2
	Па бюдж. экспэд.	5,8	3,5	1,7	2,8	78,8	51,8	15,4	3,3	58,9
IV. Лугава-балотны (Бабруйскі I і II)	Па вясен. апыт. .	5,3	3,5	1,2	1,5	73,7	44,8	14,1	3,9	59,9
	Па бюдж. экспэд.	6,1	4,2	1,4	2,0	72,2	39,8	10,4	2,9	57,2
V. Балотна-лясны (Асіповіцкі, Сьвіслацкі і Клічоўскі)	Па вяссн. апыт. .	5,4	3,4	1,3	1,7	74,4	39,1	13,8	4,4	63,0
	Па бюдж. экспэд.	5,4	3,4	1,3	2,2	78,2	42,7	13,3	3,7	67,1
VI. Пясчана-балотны (Стара-Дарожскі, Лю-	Па вясен. апыт. .	5,5	3,8	1,2	2,1	76,4	40,6	14,4	2,8	56,4
баньскі і Старобінскі)	Па бюдж. экспэд.	6,1	3,0	1,5	3,2	78,5	42,4	19,9	2,9	57,1
VII. Інтэнсыўна-травапольны (Грэскі і Ка-	Па вясен. апыт. .	5,4	4,1	1,2	1,7	82,1	35,2	12,1	2,6	57,4
пыльскі)	Па бюдж. экспэд.	6,0	5,1	1,4	2,5	89,2	33,4	11,2	2,6	54,0
Азарыцкі		6,2	3,2	1,0	3,0	90,7	41,9	17,0	1,6	61,1
Пятрыкоўскі		5,3	3,4	1,2	2,1	85,5	56,1	14,6	3,6	55,5

Прыведзеныя вышэй паказчыкі кажуць, што даныя бюджэтаў, ня лічучы некаторых упаўне магчымых адхіленьняў, наогул даволі блізкі да масавых статыстычных матар'ялаў як у адношаньні эканамічнай моцы абсьледаваных гаспадарак, так і па напрамку галоўных іх галін.

Мэтад працы. Па колькі мэтай працы зьяўляецца высьвятліць уплыў, з аднаго боку, азнакаў адмоўных, як забалочанасьць і нягожыя землі, а з другога, станоўчых—асушэньня, то, каб, шляхам ізаліраваньня альбо камбінацыі адпаведных адзнакаў, адкрыць уплыў кожнага з іх паасобку, прышлось ісьці некалькімі шляхамі.

Па першае. Каб высьвятліць уплыў ступені забалочанасьці і асушэньня, бюджэты былі разгрупаваны па % забалочаных зямель у

[1]) Пара працоўных валоў прыраўнівалася 1 прац. каню.

бюджэтных селішчах[1]) у камбінацыі з наяўнасьцю ці адсутнічаньнем у гэтых селішчах асушэньня. Пры гэтым усе бюджеты па аднаму і таму-ж селішчу пападалі ў адну якую-небудзь групу селішчаў з аднолькавай ступеньню забалочанасьці і асушэньня. Атрымаліс, такім чынам, групы не асобных гаспадарак, а цэлых селішчаў, у якіх забалочанасьць і асушэньне—фактары, агульныя усім гаспадаркам гэтых селішчаў, а не зьяўляюцца прыналежнасьцю некаторых з гэтых гаспадарак.

Па—другое. Для высьвятленьня ўплыву нягожых зямель бюджэты былі падлічаны па % нягожых зямель у гаспадарцы. Пры гэтай групоўцы бюджэты па таму ці іншаму селішчу пападаюць у розныя групы.

Што тая ці іншая ступень забалочанасьці пэўным чынам павінна адбівацца на арганізацыі гаспадаркі—гэта бясспрэчна. А значыцца і забалочанасьць сама па сябе ўпаўне можа служыць пэўным грунтам для групоўкі гаспадарак.

Роўным чынам бясспрэчны і уплыў на гаспадарку пэўнай мясцовасьці прарытых асушальных канаў. Уплыў гэты павінен быў адбіцца на палепшаньні лугавых і папасных ужыткаў, а таксама і пахаці. Таму што задача асушэньня—давесьць якасьць гэтых ужыткаў да больш ці менш нармальнага для данае мясцовасьці ўзроўня, лічучы за меру нармальнага—селішчы якія не меюць нужды ў асушэньні, у даным выпадку—селішча з слабай забалочанасьцю і без асушальных канаў. Усё гэта ўпаўне зразумела.

Але пытаньне ў тым, як дакладна вучэсьць гэты уплыў? Бо для таго, каб дакладна вызначыць колькаснае павышэньне вытворчасьці абсушальных зямель пасьля правядзеньня на іх асушэньня, неабходна мець даныя аб вытворчасьці гэтых зямель да асушэньня. Гэтага-ж як раз і ня маецца. Да і гэтага было-б недастаткова таму, што з часу пабудовы асушэньня на зьмяненьне арганізацыі і вытворчасьці сялянскай гаспадаркі мелі уплыў і другія фактары, акрамя асушэньня, і ізаліраваць іх было-б не магчыма. І таму да пытаньня аб уплыве асушэньня на сялянскую, у даным выпадку, гаспадарку прыходзіцца падыходзіць другім шляхам. Іменна, шляхам параўнаньня селішчаў і гаспадарак з аднолькавай ступеньню забалочанасьці, але з наяўнасьцю асушэньня ці без яго, адносячы розьніцу ў палепшаньні гаспадаркі ў селішчах з асушэньнем за карысьць гэтага апошняга. Шлях гэты, зразумела, не саўсім дасканалы, таму што наяўнасьць на землях таго ці іншага селішча абсушальнай канавы, таксама як і адсутнічаньне яе, яшчэ не азначае, што гаспадарчыя ўмовы ў ім (у даны момант) упаўне здавальняючыя. У свой час канава сапраўды моцна адбілась на гаспадарчым ладзе селішча. Яе ўплыў заметны і цяпер, але магло-ж здарыцца, што асушэньне толькі зраўняла быўшыя раней паганымі гаспадарчыя ўмовы селішча, на землях якога маецца канава, з гаспадарчымі ўмовамі селішча, якое прымаецца ў гэтым адношаньні за нармальнае. Тады і ніякага эфэкту асушэньня не ўдасцца вызначыць такім шляхам. А між тым гэты эфэкт быў.

Магло далей здарыцца так, што ня гледзячы на вельмі вялікае палепшаньне гаспадарчых умоў селішча пасьля правядзеньня на яго землях абсушальных канаў, вытворчасьць яго гаспадаркі, дзякуючы выключна спрыяючым умовам другога селішча, без асушэньня, ўсё-ж такі не дасягнула вытворчасьці гэтага апошняга, значыцца, і ў гэтым выпадку эфэкт асушэньня застанецца не высьветляным.

---

[1]) Забалочаныя землі гэта: балотны луг+балотны выган+балоты нескарыстоўваемыя—браліcь з паселішчных картак экспэдыцыі.

Не падлягае сумненью, што пры іншых роўных умовах, асушэньне ў агуле ўсё-ж павінна павысіць даходнасьць сельскай гаспадаркі селішчаў, маючых абсушальныя канавы, у параўнаньні з селішчамі без такіх канаў. А калі гэта так, то значыцца і такім не саўсім дасканалым спосабам, як прыняты ў гэтай працы, магчыма з дастатковай ступеньню пэўнасьці знайсьці колькаснае выражэньне гэтага павышэньня.

Далей магчыма няўпэнянасьць такога роду: землі бюджэтных гаспадарак могуць знаходзіцца—для меркаваньня аб гэтым у бюджэтах няма ніякіх указаньняў—у больш ці менш спрыяючых умовах, у адношаньні забалочанасьці ці сфэры уплыву абсушальных канаў, чымся землі астатніх гаспадарак абсьледаваных (бюджэтных) селішчаў. І тады, зразумела, атрыманыя даныя будуць далекі ад сапраўднасьці.

Аднак падобнага роду крайнасьці пры самым экспэдыцыйным абсьледваньні ізаліраваліс дасьледчыкамі, якія, як правіла, старались браць гаспадаркі так званыя сярэднія [1]) для данага селішча. І дзякуючы гэтаму, гаспадаркі з вышэй памянутымі крайнасьцямі маглі папасьці ў лік бюджэтных толькі выпадкова і ў вельмі незначнай колькасьці.

Такім чынам і такая якасная адзнака, як наяўнасьць ці адсутнічаньне ў селішчы ці гаспадарцы асушеньня, таксама можа быць упаўне падыходным грунтам для групоўкі гаспадарак.

Некаторай няўпэўнянасьцю страдае трэцьці, узяты для групоўкі адзнак нягожыя землі, па колькі само паняцьце „нягожыя землі" ня мае ўпоўне ўстаноўленых і ясных прымет.

У даным выпадку пад нягожымі землямі разумеліс землі, нескарыстоўваемыя гаспадаркай ні ў відзе пахаці, ні ў відзе сенажаці ці выгану, як аснаўных угодзьдзяў. Гэта, галоўным чынам, балоцьвіны і кускі балот, залітыя вадой, мхі, выгары і пакрытыя не замацованымі пяскамі плошчы. Сюды-ж адносяцца месцы пад могілкамі, глінішчамі, дарогамі.

Усе віды толькі што пералічаных угодзьдзяў у той ці іншай колькасьці маюцца амаль што ў кожнай сялянскай гаспадарцы Беларусі; у Беларускім-жа Палесьсі такіх зямель больш чым дастаткова.

І толькі ў рэдкія гады і прытым урыўкамі, мокрыя балоцьвіны скарыстоўваюцца ў якасьці выпасу і амаль што ніколі—у відзе сенажаці. Што датычыцца пяскоў, то яны служаць толькі для прагону ці для адпачынку на іх жывёлы. Жалабы на няўдобія прыходзіцца чуць ад сялян амаль што ў кожнай беларускай вёсцы. І зразумела, гэтыя жалабы маюць пад сабою грунт у відзе шматгадовага вопыту і назіраньня сялян над сваёй гаспадаркай.

Гэтыя-ж назіраньні прыводзяць да катэгарычнага заключэньня, што так званыя няўдобныя землі зьяўляюцца толькі цяжкасьцю для сялянскай гаспадаркі: яны зьмяншаюць і кармавыя і папасныя яго магчымасьці, а разам з тым, канечна, робяць уплыў і на даходнасьць галоўных яго галін.

Выходзячы з гэтага меркаваньня, зроблена папытка прасачыць у гэтай працы уплыў на сялянскую гаспадарку і гэтага трэцьцяга фактару—няўдобных зямель. Прычым, як вышэй указана, гаспадаркі групаваліся для данае мэты па % няўдобных зямель у самой гаспадарцы.

Само сабой зразумела, што забалочанасьць і няўдобныя землі не адзіныя азнакі, якія маюць адмоўны уплыў на сялянскую гаспадарку, роўным чынам як не адзіным становчым у гэтым адношаньні фактарам можа лічыцца і мэліарацыя.

[1]) Бядняцкую, сярэднюю, заможную.

Рэзультат сельскай гаспадаркі ёсьць функцыя шматколькіх як прыродна-гістарычных—глёба, рэльеф, клімат, так і грамадзка-эканамічных—разьмер гаспадаркі, яе землеўпарадкаванасьць, адлегласьць ад рынкаў сбыту с.-г. прадуктаў—умоў, і ўрэшце якасьцяў, самаго гаспадара, што было-б безгрунтоўным лічыць узятыя для групоўкі азнакі галоўнымі пры сужджэньні аб большай ці меншай даходнасьці гэтай гаспадаркі. Аднак забалочанасьць і няўдобныя землі найбольш рэзка кідаюцца ў вочы. У іх, як ў люстры, адбіваюцца ўсе аснаўныя прыродна-гістарычныя ўмовы сельскай гаспадаркі. Апрача таго, пры даных умовах с.-г. культуры яны больш чым, скажам, глёба ці клімат знаходзяцца пад уладаю чалавека ў яго змаганьні за палепшаньне ўмоў свайго існаваньня. Таму ён і зьвяртае на іх увагу ў першую чаргу, таму і важна прасачыць уплыў іх на сялянскую гаспадарку. Зрабіць-жа гэта звычайным шляхам эканамічнага аналізу, шляхам удаленьня з поля погляду ўсіх іншых азнакаў з адначасовай камбінацыей азнакаў, якія нас цікавяць, пры дастатковым ліку назіраньняў, упаўне магчыма.

Нарэшце ня можна было змаўчаць, пры вывучэньні вышэйпаказаных фактараў, і пытаньня аб тым, у якой меры на даходнасьць сялянскай гаспадаркі ўплывае разьмер гэтай апошняй. Бо вядома, што, чым буйней гаспадарка, чым мацней яна ўзброена сродкамі вытворчасьці, тым, у пэўны момант, на адзінку затрат яна дае, да вядомых граніц, большы эфэкт і наадварот.

У даным выпадку цікава пытаньне, як на рэзультатах сялянскай гаспадаркі адбіваецца разьмер яе зямельнай плошчы, таму што гэтая апошняя ў сваёй частцы (забалочанась і нягожыя землі) зьяўляецца ў данай працы галоўным аб'ектам вывучэньня—гэта па-першае.

Па-другое, высьвятленьне ўплыву разьмераў землекарыстаньня на галоўныя бакі сялянскай гаспадаркі пры гэтым важна яшчэ і таму, што ўпаўне магчыма дапусьціць, што няудобныя землі ня ёсьць сьведка немагчымасьці іх скарыстаньня пры даных умовах культуры, ў сілу іх натуральнай няпрыгоднасьці, а магчыма думаць, што наяўнасьць большай ці меншай колькасьці няўдобных зямель ёсьць вынік большай ці меншай землезабясьпечанасьці сялянскіх гаспадарак. Дакладней, магчыма прадпалажыць, што больш землезабясьпечаная сялянская гаспадарка, нават пры Беларускай зямельнай перенасельнасьці, у меншай ступені даражыць зямлёй, чым малазямельная. І таму пры наяўных трудавых і капітальных сродках першая гаспадарка ўцягвае ў культуру толькі землі найлепшыя і прытом у такой меры, у якой яна можа асіліць іх трудом сваей сям'і. Землі-ж худшай якасьці, хоць і ўпаўне прыгодныя для апрацоўкі, яна пакуль што закідае. Тады як гаспадарка малазямельная, імкнучыся як мага паўней скарыстаць труд сваёй сям'і, апрацоўвае нават і такія землі, якія больш землезабясьпечанай, суседняй з ёй гаспадаркай, пакінуты. Калі гэта сапраўды так, то ў малазямельных гаспадарак няўдобных зямель, за выключэньнем плошчаў пад шляхамі, могілкамі і глінішчамі, амаль саўсім не павінна быць. І далей, з павялічэньнем зямельнай плошчы гаспадаркі, павінен павышацца і % нягожых зямель у яе. Як вынік-жа з гэтага павінна выцекаць тое, што групоўка гаспадарак на няўдобных землях ёсьць тое-ж самае, што і групоўка гаспадарак па колькасьці зямлі ў іх.

Каб упэўніцца ў якой меры, у адносінах да аналізуемых гаспадарак, прылажыма гэтае прадпалажэньне, была дадаткова праароблена скарочаная групоўка гэтых гаспадарак і па землекарыстаньню.

Табл. № 3. Вось якія рэзультаты пры гэтым атрыманы.

Групы гаспадарак па колькасьці ўсяе свае зямлі	Лік гаспадарак у групе	Усяе зямлі на 1 гаспадарку дзес.	% няўдобных зямель	З 100 дзес. усіх няўдобных зямель пад няўдобнымі балотамі і пяскамі знаходзіцца дзес.
I (да 4 дзес.)	10	4,30	4,03	100,0
II (4—8 дзес.)	47	6,57	5,06	56,8
III (8 -12 дзес.)	42	10,24	8,10	65,8
IV (> 12 дзес.)	33	15,58	13,32	60,7

Гэтая табліца падцьвярджае, што процант няўдобных зямель у гаспадарцы, па меры павялічэньня яе землекарыстаньня, сапраўды павялічваецца. І павялічваецца пры гэтым амаль у такой жа ступені, у якой нарастае зямельная плошча гаспадаркі.

Аднак-жа, калі мы праверым гэтае палажэньне шляхам групоўкі гаспадарак па % няўдобных зямель у іх, то выйдзе другі малюнак.

Пры гэтай групоўцы землекарыстаньне сярэдняй гаспадаркі IV групы ўзрасло, у параўнаньні з сярэдняй гаспадаркай I групы, на 43%, тады як процант няўдобных зямель узрос на 1300% (глядзі табл. № 6а на 78 стар.). Гэта-ж сьведчыць аб тым, што сувязь паміж процантам нягожых зямель і разьмерам землекарыстаньня сярэдняй гаспадаркі настолькі незначная, што зробленую ў гэтай працы групоўку гаспадарак па % няудобных зямель няма падставы лічыць аналёгічнай групоўцы па разьмерах землекарыстаньня.

Даныя-ж аб характары няўдобных зямель (апошняя графа т. № 3), апрача таго, сьведчаць яшчэ і аб тым, што ў гэтай раўналежнасьці няма ніякай падставы для падцьвярджэньня, быццам землезабясьпечаныя гаспадаркі менш інтэнсыўна скарыстоўваюць сваю зямельную тэрыторыю чымсь малазямельныя.

Бо калі-б гэта было так, то ў гаспадарак малазямельных, у даным выпадку ў гаспадарак I гр. (табл. № 3)—у разрад няўдобных зямель павінны-б папасьць толькі землі пад шляхамі, могілкамі і глінішчамі; што-ж датычыцца так званых няўдобных балот і пяскоў, то мець іх у сваім землекарыстаньні даступна як быццам толькі землезабясьпечаным гаспадаркам; малазямельныя-ж прымушаны скарыстоўваць балоты ў відзе выгану ці сенажаці, пяскі—ў відзе пахаці.

Альбо ўва ўсякім выпадку няўдобных балот і пяскоў у многазямельных адносна павінна бы быць, па прынятаму прадпалажэньню, значна больш, чым у малазямельных. Назіраецца-ж наадварот, а іменна: у гаспадарак першай групы наўдобныя балоты і пяскі паглынаюць усе 100% няўдобных зямель, у гаспадарак жа астатніх груп, ня гледзячы на вельмі рэзкае павялічэньне землекарыстаньня ад II да IV групы, процант няўдобных балот і пяскоў застаецца амаль што без зьмяненьня.

Абвяргаючы, такім чынам, зробленае раней дапушчэньне аб наяўнасьці неаднолькавай ступені інтэнсыўнасьці ў скарыстоўваньні свaей зямельнай плошчы гаспадаркамі рознай землезабясьпечанасьці, гэтая абставіна, разам з тым, падкрэсьлівае, што не ступень гэтай землезабясьпечанасьці зьяўляецца адной з галоўных прычын наяўнасьці ў больш моцных гаспадарках большага проценту няўдобных зямель, а

прыродныя свойствы зямельных угодзьдзяў той ці іншай мясцовасьці наогул.

А раз так, то, значыцца, групоўка гаспадарак па проценту няўдобных зямель ёсьць упаўне рэальны адбітак ня толькі экамамічных, але, галоўным чынам, прыродных фактараў гаспадаркі, якія у даволі значнай ступені вызначаюць яго даходнасьць.

Сапраўднасьць гэтага палажэньня падцьвярджаюць наступныя табліцы.

Табл. № 4. Пераважнай глебай па пахаці служыць (% гаспад.):
Als hauptsächlichste Bodenarten des Ackerlandes sind vertreten (% des Gehaltes).

Групы гаспадарак па % няўдобных зямель Gruppen der Wirtschaften nach ihren Oedländereien	Лік гаспадарак у групе Anzahl der Wirtschaften in der Gruppe	Гліна Lehm	Суглінак Sandiger Lehm	Пясок Sand	Супясок Lehmiger Sand	Разам Im Ganzen
I (0%)	33	—	53	7	40	100
II (0,01—3%)	35	—	49	7	44	100
III (3,01—13%)	33	7	52	16	25	100
IV (> 13%)	31	3	29	41	27	100

Лічбы гэтай табліцы ўпаўне гавораць аб тым, што якасьць найбольш важнага з прыродных фактараў—глебы дастаткова адбіваецца ў гэтай групоўцы: па меры павялічэньня % няўдобных зямель, % гаспадарак з суглінкамі і супяскамі на пахаці падае, процант-жа гаспадарак з пяскамі,—наадварот рэзка павялічваецца.

А вось аналёгічныя даныя аб разьмяркаваньні бюджэтных селішчаў па роду пераважнай глебы на пахаці.

Табл. № 5. Пераважнай глебай на пахаці служыць (% селішчаў).
Als hauptsächlichste Bodenarten des Ackerlandes sind vertreten (% der Siedelungen)

Групы селішчай па % забалочаных зямель Gruppen der Ansiedelungen nach dem % Gehalt ihrer versumften Boden	Лік селішчаў у групе Anzahl der Wirtschaften in der Gruppe	Гліна Lehm	Суглінак Sandiger Lehm	Пясок Sand	Супясок Lehmiger Sand	Разам Im Ganzen
I (0— 3%	4(4)	—	75	—	25	100
II (3—13%)	13(13)	8	53	8	31	100
III (13—23%	14(14)	—	21	36	48	100
IV > 23%	9(18)	—	33	11	56	100

Тут аналёгічная карціна: з павялічэньнем забалочанасьці, таксама як і з павялічэньнем проценту няўдобных зямель, суглінкі з пахаці выцесьняюцца больш легкімі глебамі—ў даным выпадку супяскамі і пяскамі, якія паступова займаюць ўсё большае і большае месца па пахаці.

Далей пярэйдзем да характарыстыкі разьмяркаваньня гаспадарак па групах і інтэрвалаў паміж гэтымі апошнімі, а таксама і да кароткай харатарыстыкі некаторых асноўных паказчыкаў па гэтых групах.

Што датычыцца разьмеркаваньня гаспадарак па групах, то яно прадстаўляецца ў такім відзе:

Табл. № 6. Разьмеркаваньне гаспадарак па групах [1])

По % забалочаных зямель							Па % няўдобных зямель		
Групы гаспадарак	Інтэрвалы	Лік гаспадарак			у т. л. з асушэньнем		Групы гаспадарак	Інтэрвалы	Лік гаспадарак
		Без асуш.	З асуш	Разам	Да 50%	> 50%			
I	0—3% .	8	3	11	—	—	I	без няўд. з.	33
II	3—13% .	3	29	32	—	—	II	0,01—3 %	35
III	13—23% .	11	26	37	—	—	III	3—13%	33
IV	> 23% .	4	38	42	—	—	IV	> 13%	31
	Усяго	26	96	122	57	39		Усяго .	132

З гэтай табліцы відаць, што разьмеркаваньне гаспадарак па асобных групах у цэлым упаўне здавальняючае; ня можна аднак сказаць таго-ж пра разьдзяленьне груп на падгрупы без асушэньня і з асушэньнем наогул, бо гаспадарак з асушэньнем у агуле ў 4 разы больш, чым гаспадарак без яго. Добра, далей, разьмеркаваньне гаспадарак з асушэньнем па ступені гэтага апошняга, гэта знача з асушэньнем да 50% і > 50% ўсіх забалочаных зямель.

Адносна-ж інтэрвалаў паміж групамі неабходна сказаць наступнае.

Па забалочанасьці (т. № 5) для I групы інтэрвал ад 0 да 3% узят з прадпалажэньня, што такая невялікая ступень забалочанасьці калі і аказвае, то амаль няўлавімы ўплыў на сялянскую гаспадарку. Таму ў данай групоўцы гэтая ступень забалочанасьці лічыцца нармальнай і служыць мерай для параўнаньня з ёю другіх груп.

Наступныя групы бралісь мэханічна праз 10%, прычым пасьля 23% забалочанасьць правільна павялічваецца да 40%, больш-жа 40% яна была ў 2 толькі селішчах (адно з 59,88 і другое з 71,93%.

Па няўдобных землях за нармальную ўзята нулевая група (т. № 4), другая група, з мінімальнай колькасьцю няўдобных зямель у гаспадарцы,—да 3%, трэцьцяя—да 13% і чацьвертая—>13% [1]). Трэба сказаць, што першпачаткова меркавалася вылучыць і пятую групу, у якую ўвайшлі-б гаспадаркі маючыя больш 23% няўдобных зямель. Гаспадаркі-ж з процантам няўдобных зямель ад 13 да 23% тады ўвайшлі-б у чацьвёртую групу,—но ў віду таго, што не аказалася гаспадарак, маючых больш 13% няўдобных зямель і пры тым без асушэньня, прышлось з гэтых дзьвёх груп утварыць адну.

У заключэньне трэба сказаць некалькі слоў аб агульнай характарыстыцы атрыманых, у выніку прынятага мэтаду падліку, сярэдніх гаспадарак па групах. Па гэтаму пытаньню маюцца такія паказчыкі.

---

[1]) Па некалькіх селішчах ня было дадзеных аб процанту забалочаных зямель, чаму бюджэты па іх у падлік па % забалочаных зямель не ўвайшлі. Гэтым і тлумачыцца, што на % няўдобных зямель гаспадарак больш, чымсь па % забалочанасьці.

Табл. № 6а. Прыходзіцца ў сярэднім на 1 гаспадарку.
Im Durchschnitt entfallt auf jede Wirtschaft.

ГРУПЫ GRUPPEN	У перакладзе на мужчыну Verrechnet auf Mannsleute				Дзесяціны: Dessjatinen:												У пачатку году: Zu Beginn des Jahres:			
	Едакоў Esser		Работнікаў Arbeiter		Пахаці Ackerland		Лугу Heuschlag		Усяе удобн. Gesammtmenge des Kulturlandes		Усяе зямлі Menge des gesammten Landes		Пасеву Aussaaten		Кароў Kühe		Усяе рагат. жывёлы у перакладзе на карову Gessammtmenge des Rindviehes berechnet in Kühen	
	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland	Забал. Sumpf.	Н. з. Oedland
I	4,6	3,9	3,6	3,2	5,2	4,1	1,9	2,1	8,9	8,1	9,2	8,1	4,7	3,6	2,3	2,6	2,7	3,2
II	3,9	3,8	3,3	3,2	5,2	4,1	2,1	2,2	10,0	8,8	10,8	9,0	4,3	3,7	2,2	2,3	2,7	3,0
III	4,3	4,3	3,6	3,6	4,8	4,9	1,9	2,2	9,0	9,4	10,0	10,1	3,6	3,7	2,4	2,4	3,2	3,2
IV	3,8	4,2	3,1	3,6	3,4	4,6	2,4	2,0	8,0	8,9	9,1	11,5	2,8	3,5	2,6	2,4	3,4	3,2
Без асушэньня . . Ohne Trockenlegung	4,3	—	3,5	—	4,5	—	1,8	—	7,8	—	8,2	—	3,6	—	2,5	—	2,9	—
З асушэньн. наогул Mit Entwässerung in Allgemeinen	4,0	—	3,3	—	4,5	—	2,2	—	9,2	—	10,3	—	3,6	—	2,4	—	3,2	—
У тым ліку да 50% Darunter bis zu	3,9	—	3,4	—	4,4	—	2,4	—	9,4	—	10,6	—	3,3	—	2,4	—	3,1	—
> 50% . . . . . Über	4,1	—	3,4	—	4,5	—	2,2	—	8,9	—	9,7	—	4,0	—	2,4	—	3,2	—

Мы бачым, што, з ростом % забалочанасьці зямель, пры амаль што не зьмяняючайся плошчы ўсяго землекарыстаньня сярэдняй гаспадаркі, колькасьць удобнай зямлі ў яе значна паменшылась. Яшчэ рэзчэ скарацілась у яе плошча пахаці і разам з гэтым пасеву. Колькасьць едакоў і працаўнікоў у агуле сьледуе той-жа тэндэнцыі—зьмяншэньню, па меры пераходу ад I групы да апошняе. Плошча-ж сенажаці і раўналежна ёй колькасьць кароў і ўсяе рагатае скаціны ў перакладзе на карову, наадварот, значна ўзрасьлі.

Па проценту-ж няўдобных зямель атрымалась другая карціна. А іменна: разам з значным павялічэньнем усяго землекарыстаньня гаспадаркі заметна павялічылась таксама і плошча пахаці. Плошча-ж пасеву і сенажаці, а таксама і колькасьць кароў і ўсяе рагатай скаціны ўва ўсіх групах амаль што аднолькавы. Колькасьць едакоў і працаўнікоў, нарэшце, некалькі ўзрасла.

Што датычыцца эканамічнай моцы асобных гаспадарак, якія ўваходзяць у тую ці іншую групу па % забалочанасьці ці няўдобных зямель, то аб ёй дае прадстаўленьне наступная табліца.

Табл. № 6б. Разьмеркаваньне гаспадарак (унутры ўзятых груп) на падгрупы па колькасьці капіталаў на 1 двор [1]).

Падгрупы па капіталу	Капіталаў на 1 гаспадарку	I гр.		II гр.		III гр.		IV гр.		Разам		Без асушэньня		З асушэньнем	
		З.	Н. з.	З.	Н. з	З.	Н. з.	З.	Н. з.	З.	Н. з.	З.	Н. з.	З.	Н. з.
I	Да 600 р. .	1	9	8	6	9	10	16	12	34	37	6	—	28	30
II	601—1000 р.	5	11	12	14	17	13	12	10	46	48	11	—	35	36
III	>1000 р. .	5	13	12	15	11	10	14	9	42	47	9	—	33	38

Абсьледваньне, як відаць з гэтай табліцы, даволі раўнамерна ахапіла эканамічныя групы сялянскіх гаспадарак, а гэта яшчэ раз падцьвярждае даволі здавальняючую ступень рэпрэзэнтатыўнасьці аналізуемага матар'ялу.

Па абедзьвых аснаўных групоўках (па % забалочаных і нягожых зямель) былі падлічаны адны і тыя-ж даныя. Атрыманыя вынікі, як гэта будзе відаць з далейшага, па свайму напрамку ў агуле даволі аналёгічны друг другу, таму і разгляд іх будзе весьцісь адначасова.

I. Зямельныя ўгодзьдзі. Пачнем гэты разгляд з арганізацыі зямельных угодзьдзяў, як аднаго з аснаўных элемэнтаў арганізацыі сельскай гаспадаркі.

---

[1]) У табл. № 6б і ў далейшых стаўбцы лічбаў пад літарай „з“ адносяцца да груп гаспадарак па % забалочаных зямель, пад літарамі „н. з.“—да груп гаспадарак па % няўдобных зямель.

Anmerkung: In Tabelle № 6b und ff. Gruppen werden Sumpf (versampfte Ländereien) mit „S“; Oedländereien (unkultivirbare) mit „O“ bezeishnet werden.

Табл. № 7. На 100 дзес. усяе зямлі прыходзіцца дзесяцін.
Aüf je 100 Dessjatinen des gesammten Landes entfallen an Dessjatinen.

ГРУПЫ GRUPPEN	Пахаці Ackerland		Сенажаці Heuslang		Выгану Weidetrift		Іншыя удобнай Übrigen Kulturlandes [1])		Усяе удобнай Des gesamten Kulturlandes		Няудобнай Des Unkultivirbaren Landes		Усяе зямлі Gesammt menge des Landes
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	
I	57,1	51,0	20,4	26,3	13,1	13,7	5,9	9,0	96,5	100,0	3,5	—	100
II	48,7	46,0	19,6	24,0	8,6	10,1	16,4	17.7	93,3	97,8	6,7	2,2	100
III	47,8	48,5	18,8	21,5	10,5	8,2	12,1	14,8	90,1	93,0	9,9	7,0	100
IV	37,6	40,5	26,7	17,7	9,6	7,8	14,2	11,6	88,1	77,6	12,0	22,4	100
Па ўсіх гаспадар. без асушэньня . . . . Auf allen Wirtschaften ohne Trockenlegung	55,8		21,9		8,9		8,6		95,2		4,8		100
З асушэньнем наогул Mit Entwäserung in Allgemeinen	43,6	—	21,7	—	10,1	—	14,6	—	90,0	—	10,0	—	100
У тым ліку: да 50% . Darunter bis zu	41,7	—	22,2	—	10,9	—	14,1	—	88,9	—	11,1	—	100
> 50% . . . . . . Über	46,5	—	20,8	—	8,9	—	15,8	—	92,0	—	8,0	—	100

Доля кожнага з трох галоўных угодзьдзяў, як гавора гэтая табліца, раўналежна павялічэньню і забалочанасьці і няўдобных зямель у агуле вельмі энергічна скарачаецца ў агульнай плошчы землекарыстаньня абсьледаваных гаспадарак. Разам з гэтым, за карысьць удобных зямель наогул, у такой-жа ступені нарастае процант няўдобных зямель і так званых іншых удобных, якія не зьяўляюцца ніводным з грунтоўных с.-г. угодзьдзяў.

Пры разьдзяленьні гаспадарак на 2 групы „без асушэньня“ і „з асушэньнем“ у першай групе атрымоўваецца больш высокі процант пахаці і удобных і менш няўдобных зямель. Гэта, канечна, тлумачыцца тым, што ў першую групу пападаюць селішчы і гаспадаркі з найменшым процантам няўдобных зямель і з меншай забалочанасьцю, якая ў групе гаспадарак без асушэньня раўна 14,2% ад плошчы ўсіх зямель, у групе-ж гаспадарак з асушэньнем—16,6% (табл. № 9).

Даволі ясна, затым, відаць і тое, што наяўнасьць большай ступені асушэньня ўпаўне спрыяюча сказалась на складзе зямельных ужыткаў, значна павысіўшы ў селішчах, дзе забалочаныя землі асушаны больш, чым на 50%, процант пахаці і ўсяе ўдобнае, за карысьць зьмяньшэньня % няўдобных зямель.

[1]) Да „іншай удобнай“ аднесены землі, якія не скарыстоўваюцца ў відзе с.-г. ужыткаў, асабліва лес і хмызняк, не скарыстоўваемые ў відзе лугу ці выгану.

Unter „übrige Kulturländereien“ sind Ländereien, die landwirttschaftlich nicht g nuzt werden, besonders Strauchlandereien, die des Heuschlag oder Weidetrift dienen, verstanden.

Аднак наяўнасць большага проценту пахаці ці другога ўгодзьдзя ў першых групах табл. № 7 нічога яшчэ ня кажа аб якасным баку галоўных угодзьдзяў.

Таму разгледзім наступную табліцу.

Табл. № 8.

Групы Gruppen	На 100 дз. сваёй пахаці знаходзіцца пад: Auf je 100 Dessjatinen des Gesammten Ackerlandes entfallen auf:							З 100 дз. усяго лугу—дзесяцін: Von je 100 Dessjat. Zugehörigen Heusschlages entfallen Dessjatinen:						
	Пасевам Angesäte Flochen		Папарам чыстым Reine Brache		Залежжу і аблогамі Oed-und Sumpflandereien		Разам. Im Ganzen	Заліўнога Riselwiesen		Мурожн. Trockene Wiesen		Балотн. Sumpfige Wiesen		Разам Im Ganzen[2]
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з O.		З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	
I	86.2 (86,6)[1]	85,7 (87,7)	11,8	10,9	2,0	3,4	100	12,5	8,6	52,4	29,5	18,3	60,4	100
II	81,8 (82,1)	83.2 (84,9)	13,2	11,0	5,0	5,9	100	10,7	10,0	54,2	34,3	32,7	54,0	100
III	71,2 (71,8)	74.8 (74,4)	18,0	12,6	10,8	12.6	100	23,1	13,9	18,8	26,2	51,4	59,4	100
IV	79,5 (78.5)	74,7 (74.4)	4,6	12,7	15,9	12,9	100	4,6	12.4	13,7	19,2	80,2	61,7	100
Без асуш. . Ohne Trockenlegung	75,2 (75,6)	—	17,6	—	7,2	—	100	22,6	—	19,1	—	54,8	—	100
З асушэньн. Mit Entwässerung im Allgemeinen	79,3 (79,0)	—	11,0	—	9,7	—	100	9,4	—	31,2	—	57,0	—	100
У т. л.: да 50% Darunter bis zu	74,7 (74,7)	—	13,3	—	12,0	—	100	10,0	—	33,2	—	54,6	—	100
> 50% . . Über	86,1 (86,0)	—	7,4	—	6,5	—	100	8,4	—	27,8	—	61,0	—	100

Мы бачым, што, чым мацней забалочанасьць і больш няўдобных зямель, тым менш інтэнсыўна скарыстоўваецца пахаць сялянскай гаспадаркай. Процант „обессиленных" пахатных угодзьдзяў (папару чыстага і залежы з аблогамі) нязьменна павялічваецца.

Так процант папару чыстага і залежы па забалочанасьці ўзрос у агуле з 13,8 у I гр. да 20,5 у IV гр., па няўдобных-жа землях з 14,3 у I гр. да 25,6 у IV гр. Разам з гэтым, канечна, скарацілась плошча пасеву з 86,2 да 79,5% па забалочанасьці і з 85,7 да 74,4%—па няўдобных землях.

Такое вялікае падзеньне проценту пасева тым больш цяжка для гаспадарак III і IV груп, што пахаці ў іх па няўдобных землях не на багата болей, па забалочанасьці-ж—значна менш, чым у першых дзьвёх групах.

Што датычыцца асушэньня, то яно тут праявілася яшчэ больш рэзка, чым гэта была адзначана у табл. № 7. Сапраўды: у гаспадар-

---

[1]) У дужках процант пасеву ад сваёй і арэндованай пахаці.

[2]) Рознасьць паміж 100% і сумай процантаў лугу па кожнай групе адносіцца за карысьць лясного і іншага лугу.

ках з селішчаў з асушэньнем [1]) амаль на 4% больш пасеву і на 6% менш папару чыстага, чымсь у гаспадарках з селішчаў без асушэньня.

Ня менш спрыяюча сказалась далей на гаспадарцы найбольшая ступень асушэньня (> 50%): гаспадаркі гэтай падгрупы маюць больш чым на 10% пасеву і амаль у 2 разы менш папару чыстага і аблог у параўнаньні з гаспадаркамі, у якіх абсушана да 50% забалочаных зямель.

З меншай упэўнянасьцю сказаўся ўплыў забалочанасьці і няўдобных зямель на складзе лугавых угодзьдзяў.

Усё-ж такі і тут законамернасьць відавочна.

Па няўдобных землях процант заліўнога лугу, які зьвязан з наяўнасьцю рэчак і пойменных разьліваў, вызываючых разам з тым і забалочанасьць і ўтварэньне няўдобных зямель, правільна павялічваецца.

У той-жа час процант мурожнага лугу з такой жа паступовасьцю падае. Што датычыцца балотнага лугу, то ён амаль не зьмяняецца.

Па забалочанасьці-ж апошні від сенажаці, як і трэба было чакаць, у IV групе захоплівае 4/5 усяе лугавое плошчы, вельмі выцесняючы пры гэтым мурожны і заліўны, каторы ў першых трох групах імкнецца ў агуле да пашырэньня.

Чакаць, каб асушэньне праявіла сябе і на складзе лугавых ужыткаў ня прыходзіцца: па сваёй экстэнсыўнасьці яно магло толькі палепшыць тэй ці іншы від лугу, павысіць яго вытворчасьць, і ні ў якім разе не магло зрабіць, скажам, мурожны луг з балотнага. Відаць толькі, што асушэньне наогул і найбольшая яго ступень у прыватнасьці, маецца там, дзе больш балотных лугоў.

Нарэшце цікавы характар няўдобных зямель.

Табл. № 9. З 100 дзес. усіх няўдобных зямель знаходзіцца дзесяцін пад:
Von je 100 Dessjatinen aller Oedländereien entffallen an Dessjatinen auf:

Групы Gruppen	Няўдобнымі балотамі Unkultivirbare Sümpfe		Няўдобнымі пяскамі Unkultivirbare Sande		Іншымі Uebrige Landereien		Разам Im Ganzen
	Заб. S.	Н. з. O.	Заб. S.	Н. з. O.	Заб. S	Н. з. O.	
I	27,2		17,5	100	55,3	—	100
II	45,2	32,1	30,2	26,0	24,6	41,9	100
III	37 0	41,0	26,6	17,1	36,4	41,9	100
IV	44,0	43,0	26,4	29,6	29,6	21,4	100
Без асушэньня . . . . Ohne Trockenlegung	28,5	—	12,0	—	59,5	—	100
З асушэньнем наогул . Mit Entwässerung im Allgemeinen	42,6	—	28,6	—	28,8	—	100
У т. л. да 50% . . . . darunter bis zu	51,8	—	19,4	—	28,8	—	100
> 50% . . . . über	22,8	—	48,3	—	28,9	—	100

[1]) У далейшым пад гаспадаркамі з асушэньнем будуць разумецца гаспадаркі з селішчаў з асушэньнем.

Процант няўдобных балот узрастае па абедзьвых групоўках, процант пяскоў па забалочанасьці таксама павялічваецца, пры групоўцы-ж па няўдобных землях ён, як быццам, імкнецца да паніжэньня.

Характэрна далей тое, што гаспадаркі без асушэньня маюць у агуле ў паўтары разы менш няўдобных балот, чымсь гаспадаркі з асушэньнем, другімі славамі патрэба ў асушэньні тут запраўды была бальшая. Прычым асушэньне больш паловы забалочаных зямель амаль у два разы скараціла процант нескарыстоўваемых балот, пасьля чаго галоўнае месца сярод няўдобных зямель наогул перайшло да пяскоў.

II. Паляводзтва. Па пытаньням паляводзтва экспэдыцыей сабрана даволі багата зьвестак як у бюджэтах, так і ў падворных і паселішчных картках. Усебаковае вывучэньне гэтых матар'ялаў магло-б скласьць спэцыяльнае апісаньне паляводзтва абсьледванай тэрыторыі.

Тут жа будуць закрануты толькі тыя бакі паляводзтва, на якіх уплыў няўдобных зямель і забалочанасьці сказваюцца з найбольшай відавочнасьцю. Гэта, галоўным чынам, арганізацыя пасяўной плошчы і валавая даходнасьць як глаўнейшых культур паасобку, так і ўсяго паляводзтва разам.

У т. № 8 было паказана, што, з ростам проценту забалочанасьці і няўдобных зямель, павялічваецца процант пад папарам чыстым і пад залежжу з аблогамі, якія ў чацьвёртых групах займаюць у агуле 20—25% усяе пахаці.

Прадастаўленьне адпачынку чацьвёртай—пятай частцы ўсяе пахаці—гэта цяжкая дань, якую сялянская гаспадарка прымушана плаціць ня толькі адсталай тэхніцы ральніцтва, але, —асабліва процант залежы і аблог—і скупой прыродзе.

І ўсё-ж клясычнай трохпалёўкі няма на землях разглядаемых гаспадарак.

Націскам жыцьця яна скінута з свайго прастолу, з якога так доўга душыла свайго гаспадара нуждой і голодам. Расткі новага жыцьця ў відзе траў і кораньплодаў усё больш і больш моцна ўнедраюцца на гэтай паласе.

Але ў масе гаспадарак унедраюцца стыхійна, без саблюдзеньня правіл пладазьмену. І таму замест севазвароту прыходзіцца казаць аб наяўнасьці у абсьледаваных гаспадарак беспарадачнага чаргаваньня расьлін на полі.

Адносна-ж разьмяркаваньня паміж гэтых расьлін пасяўнай плошчы маюцца такія дадзеныя.

Табл. № 10. На 100 дзес. усяго пасеву ў полі прыходзіцца дзес.
Auf je 100 Dessjatinen der gesammtaussaat im Felde entfallen an Dessjatinen.

ГРУПЫ GRUPPEN	Жыта Roggen		Аўса Hafer		Ячменю Gerste		Грэчкі Buchweizen		Лёну Lein		Бульбы Kartofoll		Вікі Wicke		Канюшыны Klee		Іншых культур Andere kulturen		Разам Im Ganzen
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	
I	40,0	40,0	18,7	15,8	3,5	5,0	4,8	4,4	2,5	3,0	13,1	15,2	7,0	1,5	5,4	5,7	5,0	9,4	100
II	50,2	41,6	14,7	13,8	5,7	5,2	6,0	9,1	3,2	3,2	12,3	13,3	1,9	2,5	2,5	2,6	3.5	8,7	100
III	44,5	45,4	10,4	10,4	5,9	4,7	11,3	11,4	3,0	3,8	15.5	14,7	—	1,0	2,8	0,9	6,6	7,7	100
IV	43,8	48,4	8,5	8,5	3,9	5,0	12,0	10,6	3,8	2.3	16,0	14,4	0,4	1,3	0,2	—	11,4	9 5	100
Без асушэн. Ohne Trockenlegung	45,6	—	13,8	—	4,9	—	6,6	—	3,0	—	13.6	—	1,9	—	2,1	—	8.5	—	100
З асушэн. наогул Mit Entwässerung im Algemeinen	46,0	—	11,8	—	5,0	—	9,7	—	3,3	—	14 6	—	1,5	—	2,0	—	6,1	—	100
У т. л. да 50% darunter bis zu	48,0	—	11,1	—	6,4	—	8,6	—	3,6	—	15.3	—	0,3	—	2,8	—	3,9	—	100
> 50% Über	43.5	—	12,6	—	3,4	—	11,0	—	2.9	—	13,7	—	2,5	—	1,1	—	9,3	—	100

Каб прадставіць малюнак таго ўплыву, які забалочанасьць і няўдобныя земли аказваюць на даходнасьць паляводзтва, прывядзем далей наступную табліцу.

Табл. № 11. Валавая даходнасьць (у рублёх) дзесяціны: Rohertrag (in Rubeln) von der Dessjatine

ГРУПЫ GRUPPEN	Жыта Roggen		Аўса Hafer		Ячменю Gerste		Грэчкі Buchweizein		Лёну Lein		Бульбы Kartoffel		Вікі Wicke		Канюшыны Klee		Усіх культур Aller Kulturen		Усёй пахаці Des gesamten Ackerlandes	
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O,	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.
I	90,0	88,8	85,1	102,3	112,2	92,1	38,5	46,9	120,8	161,6	246,6	202,4	88,4	60,5	152,3	167,9	115,1	99,3	99,9	87,1
II	70,2	84,0	105,3	100,8	69,5	73,4	40,7	41,8	129,1	112,9	241,1	206,0	44,2	45,0	152,3	126,8	101,6	101,3	83,5	86,0
III	73,7	72,1	102,2	94,1	99,6	91,6	38,2	39,9	137,3	112,6	188,8	211,3	—	105,0	188,9	179,9	96,9	95,4	69,6	71,0
IV	70,7	74,3	90,0	92,1	92,0	88,5	39,5	34,5	140,1	188,7	161,4	218,8	84,4	38,7	170,0	—	92,8	92,5	72,8	68,1
Без асушэньн. Mit Entwässerung im Algemeinen	70,0	—	88,4	—	92,5	—	34,7	—	127,5	—	217,9	—	81,0	—	163,7	—	96,6	—	73,1	—
З асушэньн. Ohne Trockenlegung	74,1	—	99,8	—	82,8	—	40,0	—	129,5	—	201,6	—	68,3	—	115,5	—	100,2	—	79,1	—
У т. л. да 50% Darunter bis zu	73,4	—	100,7	—	80,8	—	39,6	—	120,9	—	193,8	—	46,1	—	118,6	—	101,4	—	75,7	—
> 50% über	75,6	—	98,9	—	87,2	—	40,5	—	142,4	—	207,4	—	71,3	—	97,7	—	98,6	—	84,0	—

Зьмяненьні ў напрамку дадзеных табл. № 10 у агуле ў дастатковай меры тлумачацца прыведзенымі вышэй (табл. № 4 і 5) дадзенымі аб характару пераважнай глебы на пахаці. Так культуры, якія для свайго пасьпяховага ўзросту патрабуюць больш зьвязных глебаў,— як авёс і травы, — даволі энэргічна выцесняюцца з поля, па меры павялічэньня проценту забалочанасьці і няўдобных зямель; выключэньне ў даным выпадку прадстаўляе ячмень, процант якога раўналежна росту ступені распаўсюджаньня легкіх глебаў на пахаці, імкнецца ўсёж затрымацца на адным узроўні, што тлумачыцца магчыма, наогул, не шырокім распаўсюджаньнем гэтае культуры ў разглядаемай мясцовасьці.

Наадварот грэчка, якая любіць легкія глебы, знаходзіць пры гэтым упаўне спрыяючыя ўмовы для сябе: у апошніх групах ёй адводзіцца амаль у 3 разы больш месца, чымсь у першых.

Невялікае павышэньне проценту бульбы па забалочанасьці тлумачыцца бадай большай ступеньню перавагі, з ростам забалочанасьці, супяскоў на пахаці, зьяўляючыхся для бульбы ўпаўне падходнымі глебамі.

Наогул-жа ўсе падобнага роду перагрупоўкі культур, у сувязі з большым узмацненьнем ступені забалочанасьці і павялічэньнем проценту няўдобных зямель, прыводзяць, у канцы канцоў, да таго, што ў апошніх групах па абедзьвых групоўках амаль палову ўсяе пасяўной плошчы захоплівае жыта: яно ўстойлівей у барацьбе з неспрыяючымі кліматычнымі уплывамі, а разам з тым і больш пастаянна ў ураджайнасьці.

Наогул-жа на долю зернавых прыходзіцца ад 72 да 82% усяе пасяўной плошчы, у той час як у валавым прыбытку паляводзтва яны займаюць значна меншае месца, а іменна:

Табл. № 12. Сапастаўленьне % зернавых у пасеве з процантам у валавым прыбытку ад паляводзтва.
Gegenüberstellung des Prozentgehaltes an Getreide in der Ansaat zum Rohertrag von der Ackerwiruschatt.

Групы па: / Gruppen	I		II		III		IV		Безасуш. Ohne Trockenlegung	З асуш. Mit Entwässerung	У тым ліку Darunter: да 50% bis zu	>50% über
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	Па забалочанасьці Auf der Versumpfung			
% зернав. у пасеве / % an Getreide der Aussaat	72,0	74,6	80,0	78,4	78,7	79,7	79,8	82.0	78,1	80,1	78,1	79,8
% зернав. у валавым прыбытку ад паляводзтва . . . . / % an Getreide im Rohertrag des Ackerwirtschaft	58,6	62,8	63,7	67,3	60,4	61,3	60,1	60,5	59,8	63,2	63,1	64,0

Падцьвярджаючы высказанае палажэньне аб месцы зернавых у пасяўным кліну і ў валавым прыбытку ад паляводзтва, гэтая таблічка як бы суміруючы дадзеныя табл. № 10 і 11, апрача таго, гаворыць, што процант зернавых у пасеве і па % забалочанасьці і па % няўдобных землях паступова павялічваецца. У валавым-жа даходзе доля зернавых па забалочанасьці, праўда, таксама павялічваецца, але непа-

раўнаўча слабей, чым узрастаньне проценту пасеву, тады як па няўдобных землях, хоць і незначна, але падае.

Што датычыцца наяўнасьці асушэньня наогул, а таксама большай ці меншай яго ступені распаўсюджанасьці, то яно ў разьмеркаваньні культур дастаткова рэльефных зьмяненьняў не ўнясло за выключэньнем, даволі характарным, зьмяньшэньня проценту жыта ў выпадках з найбольшым распаўсюджаньнем асушэньня (абсушана звыш 50% забалочанай плошчы), аналёгічнае таму зьмяньшэньню плошчы пад жытам, якое назіраецца пры зьмяншэньні проценту забалочанасьці.

Яшчэ з большай яснасьцю аб уплыве няўдобных зямель і забалочанасьці на паляводзтва гаворыць табл. № 11. Валавая даходнасьць дзесяціны жыта, ячменю, грэчкі і траў па абедзьвых групоўках у агуле значна падае. Некалькі інакш вядуць сябе авес, лён, бульба. Валавая даходнасьць дзесяціны аўсу з узмацненьнем забалочанасьці некалькі ўзвышаецца, па няўдобных землях—падае, бульба, наадварот, з ростам забалочанасьці дае меншы і меншы валавы даход з дзесяціны, тады як па няўдобных землях гэты даход хоць і ў значна слабейшай ступені, чымсь падзеньне па забалочанасьці, але усё-ж узвышаецца. Нарэшце лён з павялічэньнем забалочанасьці таксама як і авёс, дае больш валавога даходу з дзесяціны, па няўдобных-жа землях, карціна гэтай даходнасьці ня вызначана.

Чым растлумачыць гэтыя асаблівасьці?

Не падлягае сумленьню, што на валавую даходнасьць усялякай культуры сьвядомым чынам маюць уплыў перш за ўсё прыродныя умовы яе праізрастаньня, як якасьць глебы і прысутнічаньне ў ёй той ці іншай колькасьці вады, ва ўмовах-жа абсьледаванага раёну яны ў першую чаргу абумоўліваюць пладародзьдзе глебы. Гэтыя ўмовы, таму і павінны быць раней за ўсё прыняты пад увагу пры тлумачэньні адмечаных вышэй асаблівасьцяў у напрамку дадзеных аб валавой даходнасьці аўсу і бульбы.

Запраўды мы бачым, што па забалочанасьці больш зьвязныя глебы, якія спрыяюць пасьпяховаму росту аўсу, усё-ж больш распаўсюджаны ў апошніх групах, чымсь па няўдобных землях, дзе вельмі вялікае месца займаюць пяскі—ворагі аўсу, таму і даходнасьць аўсу ў першым выпадку некалькі ўзвышаецца, у другім—заметна падае.

Большая-ж і большая перавага лёгкіх глебаў, з павялічэньнем проценту няўдобных зямель, якая, як правіла, сапраўждаецца ўнясеньнем гною пад бульбу, дастаткова садзейнічае поспехам гэтай культуры, тады як па меры росту забалочанасьці, якой падарожнічае ня толькі ўзмацненьне супяскаў на пахаці, але і лішняе увільгатненьне глебы, бульба, ня гледзячы на больш падыходную для яе глебу—супясок, адчувае сябе даволі дрэнна і, па ўпаўне панятнай прычыне, дае па гэтай групоўцы ўсё менш і менш валавога даходу з дзесяціны.

Менш растлумачана указанае вышэй павышэньне, з ростам проценту забалочанасьці, валавога даходу ад лёну. Аднак і ў даным выпадку не малаважным фактарам зьяўляецца адмечаная ўжо перавага больш зьвязных глебаў на пахаці пры гэтай групоўцы. Калі-ж прыняць пад увагу больш позны пасеў лёну, чымсь бульбы, калі глеба дастаткова высвабаждаецца ад злішку вільгаці, якая неспрыяюча дзейнічае на рост бульбы, то стане зразумелым, што забалочанасьць менш шкодна адбіваецца на ільну, чымсь на бульбе, якая пры такіх умовах, вясной—вымакае, улетку і ўвосень—страдае ад бульбянае хваробы.

Другім фактарам, які вызначае валавую даходнасьць кожнай культуры, пры параўнаўча аднародных спосабах апрацоўкі глебы, практы-

куючыхся ў сялянскіх гаспадарках Палесься, зьяўляецца ступень угнойваемасьці пасеву. Але дадзеныя аб колькасьці вывазімага пад асобныя культуры гною пры падліку бюджэтаў не атрымоўваліся, паколькі такія дадзеныя мелісь толькі ў поўных бюджэтах і таму пытаньні аб уплыве ўгнаеньня на даходнасьць ня толькі аўсу, лёну і бульбы, але і наогул асобных культур, прыходзіцца не чапаць.

Зато маюцца дадзеныя аб колькасьці вывезенага на дзесяціну палявога пасеву пудоў гною (па ўсіх гаспадарках) і аб процанце угнойваемай плошчы палявых пасеваў (па поўных бюджэтах).

Дадзеныя гэтыя наступныя.

Табл. № 13.

ГРУПЫ GRUPPEN	I		II		III		IV		Без асушэньня Ohne Trockenlegung	З асушэньнем наогул Mit Entwässerung im Allgemein
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з O.	З. S.	Н з. O.		
Вывезена пудоў гною на 1 дз. палявога пасеву . . . . . Ausgeführt wurde Dünger in Puden auf je 1 Dessjatine der Feld-Aussaat	285	318	282	315	291	308	431	302	345	319
% угнойваемасьці палявога пасеву . . . . % der bedüngten Aussaat	21,2	32,2	29,2	28,5	30,8	28,1	34,3	31,5	43,4	28,3

Як бачым, ступень угнойваемасьці дзесяціны ўсяго палявога пасеву, а роўна і процант угнойваемага палявога пасеву ўваўсіх групах па процанту няўдобных зямель амаль аднолькавы. З ростам жа процанту забалочанасьці і колькасьць гною на 1 дзесяціну і % угнойваемай плошчы пасеву—асабліва гэты апошні—імкнуцца да павышэньня. Ня гледзячы аднак на гэта, як відаць з табл. № 11, валавая даходнасьць паляводзтва ў пераводзе і на дзесяціну пасеву і на дзесяціну пахаці падае як з ростам процанту няўдобных зямель, так і па меры ўзмацненьня забалочанасьці. А гэта значыць, што наяўнасьць няўдобных зямель і забалочанасьці ў абсьледаваным раёне зьяўляецца адным з галоўных фактараў, якія зьніжаюць вытворчасьць пахаці.

Даволі спрыяюча на даходнасьці паляводзтва адбілась асушэньне. Ужо адна наяўнасьць яго заметна ўзвысіла даходнасьць большасьці культур у параўнаньні з такавой у гаспадарак без асушэньня. Гаспадаркі-ж з асушэньнем больш паловы забалочаных зямель атрымоўваюць вышэйшую валавую даходнасьць з дзесяціны ўсіх культур, акрамя канюшыны і аўса, чымсь з асушэньнем да 50%. Роўным чынам і ўсё паляводзтва ў цэлым у гаспадарак з асушэньнем дае больш валавога даходу ў пераводзе на дзесяціну ўсяго пасеву і ўсяе пахаці, чымсь у гаспадарак без яго.

Такое заметнае павышэньне валавой даходнасьці, дзякуючы наяўнасьці асушэньня, тлумачыцца ня чым іншым, як толькі тым, што апошняе значна паляпшае ўмовы праізрастаньня кульцівіруемых расьлін. Гэта-ж вядзе да таго, што і насеньне і угнаеньне больш рацыянальна скарыстоўваюцца прыродай, яна больш шчэдра нагарожвае земляроба за яго труды.

Што гэта сапраўды так, даказвае наступная табліца.

Табл. № 14, На 100 руб. затрат у паляводзтве (насеньня угнаеньне) атрымана рублёў валавога дахону ад яго:
Auf si 100 Rub. Auslagen in der Feldwirtschaft (Saat und Düngen) wurde von denselben ein Rohertrag in Rubln erhalten.

Групы Gruppen	I			II			III			IV			Разам. Im Ganzen			
															У тым ліку Darunter	
Па проценту Je nach dem Pro' centgehalt	Без асушэн. Ohne Trockenlegung	З асушэн. Mit Entwässerung	П а г р у п е In der gruppe	Без асушэн Ohne Trockenlegung	З асушэн. Mit Entwässerung	П а г р у п е In der gruppe	Без асушэн. Ohne Trockenlegung	З асушэн. Mit Entwässerung	П а г р у п е In der gruppe	Без асушэн. Ohne Trockenlegung	З асушэн. Mit Entwässerung	П а г р у п е In der gruppe	Без асушэн. Ohne Trockenlegung	З асушэн. Mit Entwässerung	З асуш. да 50% Mit Entwässerung bis zu	З асуш. > 50% Mit Entwässetung über
Забалочанасьці An Versumpfung	390	355	381	335	363	361	327	390	371	287	292	291	348	354	350	393
Няўдобн. зямель an Oedland	321	340	337	359	377	371	369	353	355	335	365	361	—	—	—	—

Яна кажа перш за ўсё аб тым-жа што і табл. № 11—павялічваючаяся з ростам проценту забалочанасьці увільгатненьне глебы утварае непараўнаўча горшыя умовы у ёй для біа-фізыка-хімічных працэсаў, якія там утвараюцца, чымсь гэта мае месца на палёх гаспадарак, разгрупаваных па % няўдобных зямель, дзе ў значнай меры распаўсюджаны лёгкія глебы. Таго затраты па паляводзтву пры групоўцы па забалочанасьці, з узмацненьнем гэтай апошняй, усё скупей і скупей акупаюцца валавым прыбыткам, тады як з ростам няўдобных зямель назіраецца нават невялікае павышэньне аплочваемасьці затрат.

Затым з яе яшчэ больш назіральна, чымсь з мінулых табліц, відаць яшчэ і тое, якую важную ролю сыграла асушэньне ў пытаньні палепшаньня умоў праізрастаньня расьлін, бо такое значнае павышеньне аплочваемасьці затрат па паляводзтву валавым даходам і па гаспадарках з асушэньнем наогул, (у кожнай групе па забалочанасьці і па няўдобных землях) і па гаспадарках, у якіх абсушана больш 50% забалочаных зямель абязаны, зразумела, галоўным чынам павышэньню жыцьцёдзейнасьці глебы ў сувязі з удаленьнем з яе асушальнымі канавамі лішняе вільгаці.

У заключэньне некалькі слоў аб месцы паляводзтва ў грашовых зваротах гаспадаркі. Адносна рынычнасьці паляводзтва маюцца наступныя дадзеныя.

Табл. № 15.

Г р у п ы	I		II		III		IV		Без асушэньня	З асушэньнем	У тым ліку	
Месца паляводзтва.	З.	Н. з.	З.	Н. з.	З.	Н. з.	З.	Н. з.			Да 50%	> 50%
У прадажах с.-г. прадуктаў і жывёлы . .	21,5	25.4	38,4	23,8	21,8	18,5	7,6	21,2	15,1	23,4	22,6	23,6
У пакупках с.-г. прадуктаў і жывёлы	40,0	44,1	38,8	42,8	55.1	42,2	40,6	57,6	54,4	44,2	47,0	36,3
На 100 р. выруч. ад продажы прадуктаў паляв. заплочана за гэтыя прадукты	47,0	85,0	61,0	134,0	253,0	204,0	364,0	244,0	307,0	136,0	187,0	80,0
На 100 р. вал. даходу ад паляв. продана прадуктаў паляводзтва . . .	5,9	9,6	9,6	7,4	6,4	4,9	2,8	5,1	4,9	6,8	6,2	7,6

Паляводзтва, як бачым дае каля $^1/_4$—$^1/_5$ усіх грашовых выручак за прадукцыю сельскай гаспадаркі. З усіх-жа пакупак прадуктаў і жывёлы на долю паляводзтва прыходзіцца ў агуле каля паловы.

Гэта кажа аб тым, што ўсіх харчавых патрэб гаспадаркі паляводзтва не здавальняе, таму даволі значная колькасьць прадуктаў гэтай галіны гаспадаркі сяляніну абсьледванага раёну прыходзіцца купляць. З гэтай жа табліцы таксама відаць, што і па рыначнасьці паляводзтва павялічэньне ступені забалочанасьці і % няўдобных зямель аказвае яўна адмоўны ўплыў.

Так з ростам % забалочанасьці і няўдобных зямель роля паляводзтва ў прадажах с. г. прадуктаў і жывёлы ў агуле падае, у пакупках, наадварот, павялічваецца, як вынік жа гэтага суадносіны пакупак прадуктаў паляводзтва да прадаж даволі рэзка падаюць.

Вельмі заметна падае далей і процант адчужджэньняў прадуктаў паляводзтва ад усяго валавога даходу апошняга.

Нарэшце не простай выпадковасьці, а ў значнай меры таму-ж спрыяючаму ўплыву асушэньня прыходзіцца прыпісаць і тое, што рыначнасьць паляводзтва ў селішчах з асушэньнем наогул значна вышэй, чым у селішчах без асушэньня, у селішчах-жа з асушэньнем больш 50% забалочаных зямель вышэй, чымсь у селішчах, якія асушылі гэтых зямель да 50%.

III Лугаводзтва. Адносна месца сенажаці ў агульнай плошчы зямельных угодзьдзяў сялянскай гаспадаркі абсьледаванай тэрыторыі было ўказана пры аналізу табл. № 7. Пры разглядзе-ж табл. № 8 зроблена кароткая характарыстыка плошчы лугавых ужыткаў.

Тут прыдзецца толькі некалькі застанавіцца на якасным баку лугавых ужыткаў, іменна на валавой іх даходнасьці

Нажаль атрымаць дадзеныя аб валавой даходнасьці асобных відаў лугу па ўсяму матар'ялу не прадставілась магчымым: у скарочаных бюджэтах ня было ўказаньняў аб родзе арэндаванага лугу, збор жа сена рэгістраваўся з усяго лугу разам. Такія дадзеныя атрыманы толькі па поўных бюджэтах.

Яны такія:

Табл. № 16. Валавы даход 1 дзес. сенажаці.
Rohertrag von 1 Dessjatine Heuschlag.

Групы / Gruppen	I		II		III		IV		Без асуш. Ohne Trockenlegung	З асушэн. наогул Mit Entwässerung	У т. л. Darunter	
											да 50% bis zu	>50% über
Род сенажаці / Art des Heuschlages	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	Па забалочанасьці			
Мурожная . . . . Trockene Heuschlage	34,4	35,2	41,6	30,7	28,7	27,2	16,4	22,0	40,0	41,2	39,5	43,6
Заліўная . . . . Rieselwiesen	97,2	65,1	90,3	89,4	83,9	74,4	79,6	96,0	100,0	98,0	94,1	100,4
Балотная . . . . Sampfige Wisen	14,0	25,9	36,5	39,5	32,2	27,6	35,1	48.2	31,5	35,0	26,7	47,3
Лік гаспадарак у групе . . . . . Anzahl der Wirtschaften in der Gruppe	4	10	10	9	12	14	13	9	9	30	15	15

Атрыманыя хоць і па параунаўча невялікаму ліку выпадкаў—ня усе віды сенажаці былі ў кожнай гаспадарцы—гэтыя сярэднія лічбы ў агуле даволі правільна адбіваюць тэндэнцыю ў зьмяненьнях даходнасьці асобных відаў лугавых ужыткаў, а разам з тым і іх прыродныя якасьці.

Запраўды, пры адсутнічаньні ў большасьці выпадкаў спэцыяльнага культур-тэхнічнага догляду з боку сялян за сваімі лугамі, даходнасьць апошніх амаль выключна залежыць ад ступені увільгатненьня іх.

Так, мурожны луг, усеяны, як правіла, вялякай колькасьцю куп'я, з павялічэньнем увільгатненьня пакрываецца зьверх таго яшчэ і слоем мху. Умовы для праізрастаньня траў, значыцца, яшчэ больш ухудшаюцца. Укосы, а таксама і грашовая іх каштоўнасьць—падаюць. Аб гэтым і гавораць прыведзеныя ў табл. № 16 лічбы.

Злішняя абвільгатненьне заліўнога лугу, якое спраўваждаецца ростам проценту забалочанасьці, спрыяе ўнядрэньню і ўзмацненьню на іх большай колькасьці кіслых траў. Гэтыя-ж апошнія, пры самых найлепшых для іх умовах не даюць такой-жа колькасьці сена, як звычайны травастой заліўных лугоў. У выніку зьмяншаецца і агульная даходнасьць дзесяціны гэтага роду лугу.

Пры групоўцы па няўдобных землях наадварот, атрымоўваецца абратная карціна: валавая даходнасьць дзесяціны заліўнога лугу павялічваецца па меры павялічэньня проценту няўдобных зямель. Тут справа тлумачыцца відавочна тым, што ў першай групе, без няўдобных зямель, якімі ў даным выпадку цалкам зьяўляюцца пяскі (табл. № 9) у разрад заліўнога лугу папаў альбо сапраўдны заліўны луг, але ў недастатковай меры заліваемы водамі месных рэчак і пойменнымі, альбо звычайны мурожны луг, які толькі выпадкова і ў незначнай ступені залівaецца тымі-ж водамі.

Па гэтай прычыне і вытворчасьць яго значна ніжэй, чым у наступных групах гаспадарак.

Урэшце балотны луг, дастаткова перасохшы ва ўмовах, дзе ступень распаўсюджаньня забалочанасьці і няўдобных зямель не вялікая—у даным выпадку ў першых двух групах па абедзьвых групоўках—і зьяўляючыйся упаўне спрыяючай глебай для залужэньня, ў натуральных умовах нясе на сабе ня густы і бедны травастой, тады як збытачна завільгатнёны балотны луг—любімае месца буйных асок і таму падобных траў, якія даюць у агуле хоць і мала добраякасную, але зато багатую колькасна ўкосную масу. Гэтым, канечна, толькі і можна растлумачыць павышэньне даходнасьці балотнага лугу па абедзьвых групоўках.

У адношаньні-ж усяго лугу дадзеныя[1]) як аб сярэднім зборы сена з дзесяціны, так і аб грашовай каштоўнасьці гэтага збору прыводзяцца ў наступнай табліцы.

---

[1]) У далейшым усе прывадз'мыя адносна лугаводзтва лічбы атрыманы па ўсіх бюджэтах.

Табл. № 17. Колькасная і якасная характарыстыка 1 дзес. усяго лугу.
Quantitative und qualitative Characteristic von je einer Dess. Heuschlag.

ГРУПЫ / GRUPPEN	I		II		III		IV		Без асушэн. Ohne Trockenlegung	З асушэньнем наогул Mit Entwässerung	У тым ліку Darunter: Да 50% bis zu	>50% über
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	Па забалочанасьці Auf der Versumpfung			
З 1 дзесяціны сабрана: Von 1 Dessjatine wurde geerntet:												
Пудоў сена . . . Heu in Puden	72	94	92	85	95	80	79	80	94	85	83	89
Каштоўнасьць яго: Sein Werth:												
У дацк. карм. адзінках In dänischen Futtereinheiten	1126	1432	1490	1339	1601	1652	1160	1239	1522	1331	1321	1363
У рублёх In Rubeln: Без асушэньня . Ohne Trockenlegung	23,6	27,0	24,6	38,7	46,3	31,3	22,1	31,8	33,4	—	—	—
У рублёх In Rubeln: З асушэньнем . Mit Entwässerung	33,5	35,1	41,5	32,4	32,8	51,6	32,6	32,7	—	35,1	32,3	39,1
У рублёх In Rubeln: Без разлічча па усіх гаспадарках . . Aus nahmlas für die ganze Wirtschaft	27,7	33,6	40,8	34,3	37,2	49,0	31,5	32,5	—	—	—	—

Як відаць з гэтай табліцы, з ростам проценту забалочанасьці, сярэдні збор сена з дзесяціны павялічваецца, пры чым гэтае павялічэньне павінна быць аднесена, канечна, галоўным чынам, за кошт балотнага лугу. У тым-жа напрамку следуюць лічбы, якія характарызуюць кармавую і грашовую каштоўнасьць гэтага сбору. Толькі ў IV групе колькасьць кармавых адзінак у зборы сена з дзесяціны рэзка падае дзякуючы выключнай перавазе балотнага лугу—80,2% (табл. № 8) у ва ўсім зборы сена.

Па проценту-ж няўдобных зямель, дзякуючы моцнаму падзеньню вытворчасьці мурожнага лугу, процант якога ў дзьвёх апошніх групах па гэтай групоўцы значна вышэй, чым па забалочанасьці, сярэднія зборы сена з дзесяціны падаюць, хістаньні ў радох лічбаў, якія паказваюць кармавое значэньне гэтага сярэдняга збору і яго грашовае выражэньне, тлумачыцца большай ці меншай перавагай таго ці іншага віду сенажаці ў пэўнай групе.

З гэтай жа табліцы відаць далей, што наяўнасьць асушэньня ў агуле даволі спрыяюча адбілась на сярэдняй даходнасьці дзесяціны лугу: даходнасьць гэтая ўва ўсіх групах, акрамя дзьвёх, у гаспадарках з селішчаў з асушэньнем значна вышэй, чым без яго, а ў гаспадарках з селішчаў, дзе асушана больш 50% забалочаных зямель, значна вышэй, чым у селішчах у якіх асушана да 50% гэтых зямель.

IV. Кармавое пытаньне. Як праізводная прыродна-эканамічных умоў той ці іншай мясцовасьці, кармавое пытаньне Беларускага Палесься мае цэлы шэраг сваіх асаблівасьцяў.

Перш за ўсё пасьбішча. У большасьці абсьледваных селішчаў пасьбішчам для жывёлы—у даным выпадку гаворка будзеісьці, галоўным чынам, аб рагатай жывёле—служыць лес.

Рана вясной выганяе ў яго сваю закормленую худобу сялянін.

Там яна то леташні сухі ліст падыме, то тонкую ветку з куста сарве, то куст ссохшай леташней асокі пад кустом ці на куп'е, па балоту, знойдзе. І такім чынам, і „праветрыцца“ і напасецца. Да, апрача таго, і ў дзень сваім мычаньнем „сэрца рваць“ ня будзе.

Але вось сагрэлась зямля пад жыватворнымі праменьнямі сонца. Зазялянела траўка на балотах. І скаціна ажыла. З раньня да вечара, пад доглядам пастушкоў (часьцей хлопчыкаў), таўчэцца яна па балоту. І ўсё было-б добра, калі-б не злошчасная „вяха“, не камары да не ваўкі. Гата бічы жывёлаводзтва.

Ня было ніводнага селішча, дзе бы сяляне не жаліліся, што ад вяхі на пашы ў іх штогодна гіне дзесятак—другі, а то і сотня галоў рагатай жывёлы і авечак. Вяха ў сялянскіх умовах па сваіх выніках раўнамоцна сыбірцы, бо мер лячэньня атруціўшыхся вяхой жывёлін сяляне, як правіла, не знаюць. І раз аб'елась вяхі карова, ці аўца—раздуцьце жывата, якое прычыняе скаціне цяжкія мучэньні, у аграмаднай большасьці выпадкаў аканчываецца сьмерцю.

Ня мала мучэньняў скату прычыняюць далей—асабліва ў балотных раёнах Мазыршчыны—балотныя і лясныя мошкі. Часамі яны прама на сьмерць заедаюць жывёлін. Так супрацоўніку экспэдыцыі В. Г. Аляксееву у в. Ляхавічы, Жыткавіцкага раёну (на беразе Князь-Возера), сяляне расказывалі што „ад заяданьня мошкамі“ ў 1924 г. у іх здохла каля 100 галоў рагатай жывёлы (больш маладняку).

Што датычыцца ваўкоў, то шкода, якую яны прычыняюць, заключаецца, канечна, ў тым, што яны самым наглым чынам, прама з пад рук пастушкоў, цягаюць авечак і рагаты маладняк.

З часу заказу пасьбы на лугах скот параходзе амаль выключна ў лес. Тут для яго новая бяда: самавольнае ці не самавольнае праглынаньне смалістых матэрый вызывае ў рагатай жывёлы крывавую мачу значна часьцей, чым яна назіраецца пры пасьбе на балотах.

У селішчах-жа, якія не прылягаюць да лясоў, з пасьбішчамі яшчэ хужэй. Тут скаціна вясной пасецца па лугу і па полю (у яравым і папару). З пасевам яравых—толькі ў папары і часткова па спэцыяльных выганах, з васходу і да заходу сонца туляецца скаціна па гэтых пасьбішчах, якія ў самых разнастайных напрамках зрэзаны каровяччымі сьцежкамі. Выган—што бубён. Аж гудзе, як бяжыш па ім—калі ён мурожны; калі-ж выганам служыць балота, то яно да таго зрэзана капытамі жывёлін і іспешчрано бальшой колькасьцю куп'я, што староньні чалавек здалі прымае яго за даўно паднятую і пазялянеўшую пахаць, а не за луг.

Зразумела, што аб напасываньні скаціны на такіх пасьбішчах і казаць ня прыходзіцца. На іх скот толькі час каратае. Вышаўшы галодным з двору, цэлы дзень мечыцца ён пад паляшчымі праменьнямі сонца, шукаючы корму, і, не знайшоўшы яго, амаль такім жа галодным і, акрамя таго, яшчэ і ўтаміўшымся зварочваецца ён дамоў. А дома хапае альбо паўсгніўшую салому са стрэх і падсьцілку, калі яна ёсьць, альбо з жаднасьцю пажырае прынесеную з поля ці гароду дробную траву з зямлей—падкармліваецца.

Толькі пасьля ўборкі жыта па сьцёрну пачынае „отходить“ скаціна. Тыдзень—другі яна больш ці менш напасваецца па ржышчу, а

потым па яровым кліну. І да восені ў агуле трохі „пасьвятлее“ А бываюць гады, калі худоба тошчая, учарнеўшая, з выпячанымі рэбрамі і часта з клакамі не апаўшай за лета леташней шэрсьці зноў становіцца на новую доўгую, мучыцельную для яе зіму. На трушанку, на рэзку ды на балотнае сена: харошае сена мала даецца рагатай жывёле.

Гэта-ж балотнае сена, вырасшае ня рэдка на багатым жалезістымі злучэньнямі балоце і ўбранае, апрача таго, па вадзе, трымае на сабе багата іржы. Апошняя-ж вельмі гібельна адбіваецца на скаціне. Жывёліна худзее, слабее, падае на ногі. І ляжыць часта да пролежняў на бакох, а потым... іздыхае. Гэта ў найгоршых выпадках. Выпадкі-ж такія ня саўсім рэдкі.

Па гэтаму поваду супрацоўнікам экспэдыцыі А. І. Гарэлікаву і В. Г. Аляксеяву сяляне паведамілі (пра 1924 год) наступныя зьвесткі [1]):

Табл. № 20.

№№	Назва селішча	Якога раёну	Рагатай жывёлы		А в е ц	
			Хварэла	Здохла	Хварэла	Здохла
1	В. Князь-Возера	Старобінскага	25%	9%	520 г.	520 г.
2	„ Пісарэвічы	„	25%	6%	15 г.	15 г.
3	„ Прыбалавічы	Лельчыцкага	260 г.	260 г.	—	—
			ш т о г о д н а:			
4	„ Стадолічы	„	25%	8%	70%	25%
5	„ Сіманічы	„	—	—	600 г.	300 г.
6	„ Лельчыцы	„	250 г.	50 г.	300 г.	150 г.
7	Х. Дубрава	Каралінскага	100 г.	багата	70 г.	багата
8	В. Карма	„	100 г.	большасьць	20 г.	большасьць

Калі-б нават гэтыя лічбы ўдвойчы былі павялічаны, то і пры гэтым надзвычайна вялікі тыя страты, якія церпіць сялянская гаспадарка ад „ржаўчыны“. Не дарам жалабы на яе так часта раздаюцца сярод сялян у частых вёсках (асабліва ў балотных раёнах) Мазыршчыны.

Такія вынікі худшых выпадкаў. У лепшых жа выпадках жывёліна ня гіне, але адчувае сябе вельмі дрэнна. Сьцельныя каровы часта выкідваюць.

Сяляне в. Вятчын, Старобінскага раёну, расказывалі В. Г. Аляксеяву, што у 1924 г. у іх скінула каля 140 кароў.

У заключэньне характарыстыкі агульных умоў кармавога пытаньня Беларускага Палесься прывядзем наступную табліцу з данымі аб падзяжы застрахаванай рагатай жывелы $> 1^1/_2$ г. па рэгістрацыйным сьпісам страхагэнтаў.

[1]) З дняўнікоў супрацаўнікоў экспэдыцыі і паселішчных картак.

Т. № 21. Падзёж буйнай рагат. жывёлы па дадзеным страхагентаў.
Das Eingehen des Rindviches; nach Angaben des Versicherungsamtes.

№ мэлраёна Des Bezirkes meliorationen	У якім годзё In welchem Iahr	Усяго застрахована галоў Im ganzen waren versichert Köpfe	Здохла: Gingenein — Галоў Köpfzahl	Здохла: Gingenein — У % да застрахаваных % Der versicherten	У тым ліку здохла галоў у % Darunter gingen ein in % der Kopfzah — Ад прычын зьвязаных з кармав. пытаньнем: Aus Grunden in Zusammenhang mit der Futterfrage — Тымпаніту san Trommelucht	Нерасьцёлу An Fehlgeburten	Схудаласьці An Verhagerung	Разам Im Ganzen	Ад прыч. зьвяз. з пасьбішчн. пытаньнем Aus Gründen in Abhöngigkeit von der Weidegang — Крывав. мачы An Bluthamen	Крывав. паносу An Dysenterie	Разам Im Ganzen	З'ездзена ваўкамі Aufgefressen von Wolfen	Ад іншых прычын Aus anderen Gründen	Ад невядомых прычын Aus unbekonnten Gründen	Усяго Im Ganzen
I	1924-25	15.146	634	4.9	32.49	8.52	2.37	43.38	6.31	2.52	8 83	0.16	39.11	8.52	100
	1925-26	20.827	1.207	5.8	44.57	14.25	6.88	65.7	6.21	5.63	11.84	0.17	19.9	4.31	100
II	1924-25	33.622	1.220	3.63	30.41	5.74	1.8	37.95	3.44	2.05	5.49	0,74	35.73	20.09	100
	1925-26	42.172	2.191	5.2	26.25	10.82	11.36	48.83	4.24	1.88	6.12	0.87	31.49	12.69	100
III	1924-25	48.234	1.403	2 91	14.26	5.42	0.21	19.89	7.34	8 34	15.68	8.55	48.25	7.63	100
	1925-26	54.662	1 663	3.04	17.02	9.14	1.56	27.72	4.39	6.67	11.06	8.78	43.84	8.6	100
IV	1924-25	24.992	1.056	4.24	26.42	10.32	0.19	36.93	11.27	1 61	12.88	3 31	42.81	4 07	100
	1925-26	32.101	1.688	5.26	20.9	16.17	5 51	42.58	3.97	1.84	5.81	1.72	39.41	10.49	100
V	1924-25	27.561	964	3.47	15.46	9.3	0.84	25.6	3.24	3.87	7.11	5.33	55.06	6.9	100
	1925-26	32.736	1.310	4.0	22 06	12.98	3.28	38.32	4.81	5.11	9.92	3.28	40.77	7.71	100
VI	1924-25	48.731	1.239	2.54	16.22	6.54	1.69	24.45	6.05	7.75	13.8	7.67	47.14	6.94	100
	1925-26	57.696	1.714	2.97	15.4	11.32	3.44	30.16	5.31	5.95	11.26	6,77	46.5	5.31	100
VII	1924-25	54.217	1.798	3.32	16.63	12.01	2.45	31.09	5.17	5.78	10.95	1.95	46.28	9.73	100
	1925-26	67.681	2.372	3.5	14.79	15.76	4.43	34.98	3.25	3 92	7.17	1.69	52 49	3.67	100

У гэтай табліцы ўсё гора, ўсе жахі кармавога і пасьбішчнага пытаньняў. За ёй амаль 22 з паловай тысяч галоў рагатай жывёлы больш $1^1/_2$ году, на працягу 22 месяцаў—з кастрычніку 1924 г. па жнівень 1926 г.—згінуўшай у 21 раёне 3 абсьледаваных акруг ад іржы, праглынутых з голаду тоўстых ветак, паднесенай у якасьці падкормкі паўсгніўшай саломы са стрэх, ад вяхі і другіх атрутных траў.

Яна гаворыць, што ад 20 да 65% усіх выпадкаў падзяжу прыходзіцца на долю прычын[1]), звязаных з кармавым пытаньнем, і ад 5 да 15% на долю прычын, зьвязаных з пашай. Яна падкрэсьлівае, далей, што 1925—1926 г. у кармавых адносінах быў непараўнаўча цяжалей 1924—1925 году.

Такавы ўмовы і вынікі кармавога і пазьбішчнага пытаньняў данай тэрыторыі наогул.

Разгледзім цяпер становішча кармавога пытаньня ў абсьледаваных гаспадарках. У іх:

Табл. № 22. На 100 дзес. усёй сваёй зямлі маецца дзесяцін:
Sie besitzen aüf je 100 Dessjatinen ihres Gesammtbodens in Dessjatinen:

ГРУПЫ / GRUPPEN	I		II		III		IV		Без асушэньня / Ohne Trocken-legung	З асушэньнем / Mit Entwässerung	У тым ліку / Darunter	
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.			Да 50% / bis zu 50%	> 50% / über 50%
С.-г. плошчы[2]) . . . . . Landwirtschaftliche Ackerbau Flächen	90,6	91,0	77,0	80,1	77,1	78,2	73,9	66,0	86,6	75,3	74,7	77,2
Сенажаць + выгану . . . Heuschlag + Weidetriften	33,5	40,0	28,3	34,1	29,3	29,7	36,3	25,5	30,8	31,8	33,0	29,7

Як бачым, с.-г. плошча, якая дастаўляе корм скаціне, у абсьледаваных гаспадарках займае ад 75 да 90% усяе іх зямельнай тэрыторыі, а плошча ўласна кармавая (луг+выган) ад 25 да 40%.

Па дадзеных жа перапісу 1917 г. [3]) гэтыя ужыткі займаюць у сялянскай гаспадарцы („трудавыя“) такое месца.

Табл. № 23. На 100 дзес. усяе зямлі прыходзіцца дзесяцін:

У акрузе	Пахаці	Лугу	Выгану	С.-г. плошчы
Бабруйскай	44,2	17,6	6,5	68,3
Мазырскай	37,6	18,2	10,7	66,5
Слуцкай	44,4	23,7	7,6	75,7
Па Беларусі	48,5	19,3	5,2	73,0

Па дадзеных абсьледваньня (табл. № 22) забясьпечанасьць сялянскай гаспадаркі с.-г. плошчай значна вышэй, чымсь яна была ў 1917 г. Часткова гэтае можа быць растлумачана различчам у мэтадах абсьлед-

[1]) Групоўка выпадкаў па прычынах падзежу рабілісь галоўным чынам па Шмулевічу «Первая помощь домашним животным».
[2]) Пахаць + сенажаць + выган.
[3]) Стат. штогоднік Белар. Ц. С. У. за 1923—24 г.

ваньня (сплашны-падворны перапіс у 1917 г. і выбарачнае бюджэтнае абсьледваньне экспэдыцыі ў 1926 г.), але галоўным чынам гэтая розьніца тлумачыцца, відавочна, тымі зьменамі ў сялянскім землекарыстаньні, якія адбыліся ў сувязі з размеркаваньнем паміж сялянамі, у даным выпадку вышэй упамянутых 3 акруг, вялікай колькасьці былых памешчыччых зямель. Якая-ж насялённасьць рагатай жывёлай і авечкамі с.-г. плошчы у абсьледаваных гаспадарак.

Табл. № 24. На 100 дзес. с.-г. плошчы прыходзіцца:
Auf 100 Dessjatinen Ww. Ackerlandes entfallen:

ГРУПЫ GRUPPEN	I		II		III		IV		Без асуш. Ohne Trockenlegung	З асуш. наогул Mit Entwässerung	У тым ліку Darunter	
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.			Да 50% bis zu	> 50% über
Рагатай жывёлы ў пераводзе на карову . Rindvieh, verrechnet auf Kühe	32.3	42,2	34,8	40,6	40,7	38,7	50,6	41,6	38,2	38,3	38,3	38,4
Авец, у перав. на ўзр. Schafe, verrechnet auf ausgewachsene	42,9	64,3	59,0	61,9	68,3	58,7	61,4	52,7	51,8	58,7	58,4	54,3

Ступень насялённасьці рагатай жывёлай і авечкамі с.-г. плошчы, па меры павялічэньня забалочанасьці, як бачым, у агуле павялічваецца, з павялічэньнем жа проценту нягожых зямель, наадварот,—зьмяншаецца.

Напрамак гэтых шчыльнасьцяў, як раз раўналежан проценту выгану (т. № 7) па кожнай групоўцы і дадзеным аб сярэдняй кармавой вытворчасьці дзесяціны сена-пахаці, прадстаўленым у наступнай табліцы.

Табл. № 25. Грубых кармоў (сена усякае+салома азімая і аравая+мякіна+каласавіна) прыходзіцца на 1 дзес. сена—пахаці.
Rauhfuttermittel (Heu jeder Art, Winter-und Sommerstroh, Spren und Achren) entfallen auf je 1 Dessjatine Acker—Neuschlag.

ГРУПЫ GRUPPEN	I		II		III		IV		Без асуш. Ohne Trockenlegung	З асуш. наогул Mit Entwässerung	У тым ліку Darunter	
	З. S.	Н з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.			Да 50% bis zu	> 50% über
Дацкіх адзінак [1]) . . In danische Futter einheiten	784	953	848	914	841	829	854	733	848	854	—	—

Што датычыцца наогул забясьпечанасьці сярэдняй гаспадаркі грубымі кармамі, то яна такая.

Табл. № 26. На 1 гаспадарку прыходзіцца грубых кармоў:
Rauhfuttermittel entfallen auf je eine Wirtschaft:

ГРУПЫ GRUPPEN	I		II		III		IV		Без асуш. Ohne Trockenlegung	З асуш. наогул Mit Entwässerung	У тым ліку Darunter	
	З. S	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.			Да 50% bis zu	> 50% über
Пудоў . . . . In Puden	469	477	492	477	452	437	431	434	432	469	—	—
Кармав. адзін. . . . . Futter einheiten	5957	6088	6215	6228	6104	6031	5521	5402	5760	5974	—	—

[1]) Дацкая кармавая адзінка па сваей пітацельнасьці раўна: $^{1}/_{3}$ ф. пшанічных вотрубей+$^{1}/_{3}$ ф. аўсу+$^{1}/_{3}$ ф. падсолнечнай макухі.

Яна ў агуле ўпаўне раўналежна забясьпечанасьці сярэдняй гаспадаркі сена-пахацьцю і вельмі блізка наступным дадзеным Бабіцкага[1]) аб забясьпечанасьці сярэдняй сялянскай гаспадаркі гру-бымі кармамі.

Т. № 27. Усіх грубых кармоў прыходзіцца на 1 гаспадарку.

У Бабруйскай акрузе . . . . 477.25 пуд.
» Слуцкай » . . . . 514.77 »
» Мазырскай » . . . . 491.43 »
Па Беларусі . . . . 489.85 »

Цяпер перайдзем да характарыстыкі кармавога рацыёну рагатай жывёлы. Вядома, што рагатая жывёла пакуль што галоўны спажывацель грубых кармоў.

У адношаньні абсьледаваных гаспадарак гэтае становішча падцьвярджае наступная табліца.

Т. № 28. З 100 пудоў (у пераводзе на дацкія кармавыя адзінкі), сабраных у гаспадарцы, адпаведна скормлена рагатай жывёле:
Von je 100 Pud. (verrechnet auf danische Futtereinheiten), die in einer Wirtschaft geerntet wurden, wurden dem Rinvich in der eigenen Wirtschaft verfüttert.

ГРУПЫ GRUPPEN	Сал. азімай Winter-Stroh		Сал. ярав. Sommer-Korn-Stroh		Сена лугов. Wiesenheu		Мякіны і каласавіцы Spreu und Achren		Бульбы[2]) Kartoffeln	
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.
I . . . . . ,	23.8	40,7	28,5	86,7	15,6	30,8	42,0	28,8	17,0	12,5
II	37.8	47,4	79,4	80,0	26.9	29,6	29,1	35,2	10,0	15,2
III	46,3	41,5	81,5	78,4	32,6	23,7	25.3	27,8	13,6	13,5
IV	45,6	41,9	63,8	85,5	31,0	17,3	26,3	41,4	11,4	12,3
Б. асуш. . . . . Ohne Trockenlegung	44,1	—	80,8	—	25,6	—	33,2	—	14.1	—
З асуш. . . . Mit Entwässerung .	41,7	—	72,4	—	27,1	—	25,7	—	11 8	—

З яе відаць, перш за ўсё, што рагатай жывёле ідзе ў агуле ад $^1/_4$ да $^1/_2$ ўсяе азімае саломы, а таксама мякіны і каласавіны, ад $^1/_4$ да амаль $^9/_{10}$ яравой саломы, ад $^1/_6$ да $^1/_3$ сена і ад $^1/_9$ да $^1/_6$ бульбы.

Затым яна кажа аб тым, што чым больш процант забалочанасьці, тым рагатай жывёле выдзеляецца ўсё большая і большая частка саломы азімай і яравой і сена лугавога з адначасовым скарачэньнем долі бульбы.

У групоўцы-ж па нягожых землях другі малюнак. Тут доля саломы азімай і яравой і бульбы амаль не зьмяняецца ў розных групах, доля сена лугавога поступова зьмяншаецца, а мякіны—павялічваецца.

Ужо гэтая табліца гаворыць да некаторай ступені аб ухудшэньні рацыёну рагатай жывёлы з павялічэньнем ступені забалочанасьці (асабліва) і проценту нягожых зямель.

Але каб гэтае становішча было больш відавочна, зроблен аналіз самаго кармавога рацыёну. Для гэтага ўсе кармы, якія даны на працягу стойлавога пэрыяду рагатай жывёле, шляхам памножэньня на адпаведныя каэфіцыенты, пераведзены ў дацкія кармавыя адзінкі. У выніку атрымана табліца № 29.

[1]) „Сов. стр.“ № 11, за 1926 г. „Производств. минимум в крест. хоз. Белор.“.
[2]) Бульба ўключана ў гэтую табліцу за тым, што займае значнае месца ў кармавым рацыёне рагатае жывёлы.

Т. № 29. З 100 дацкіх кармавых адзінак [1] *у з'ездзеных за год рагатай жывёлай кармох з'едзена ім кармавых адзінак у відзе:*
Von 100 daniscen Futtereinheiten in den vom Rindvich im Lauf des lahres verzehrten Futtermitteln wurden aufgefressen in Form von:

ГРУПЫ GRUPPEN	Саломы азімае Winterkornstroh		Саломы яравой Sommerkornstroh		Усяе саломы и мякіны Im Ganzen Stroh und Spren		Сена лугавого Wiesenheu		У тым ліку % болотн. Davon % sumpfiges		Сена сеяных траў Heuvon gesäten Gräser		Усіх грубых кармоў Im Ganzen Rauhffutter		Бульбы[2]) Kartoffeln		Зерна і мукі Körner und Mehl		Усіх кармовых адзінак[3]) (100%) Im Ganzen Futtereinheiten	
	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O.	З. S.	Н. з. O
I	12,2	12,5	13,7	26,7	29,5	41,7	14,1	29,4	77,5	71,8	10,5	1,5	54,5	72,6	36,7	18,8	7,8	6,9	1054	1086
II	16,0	14,3	29,1	23,9	48,3	41,4	25,0	28,8	41,6	68,3	2,0	4,4	75,3	74,6	16,9	17,4	6,1	5,9	1159	1174
III	13.8	14.2	22,4	23,7	38,3	40,7	36,3	30,7	68,8	74,4	0,6	—	75.2	71,4	17,5	20.5	5,5	4,6	1048	964
IV	16,2	16,6	17,3	21,8	34,8	43,0	21,7	32,7	93,0	82,7	—	1,1	76,5	76,8	13,8	18,4	5,1	3,7	777	911
Без асуш. . . . Ohne Trockenlegung	13,4	—	24,3	—	43,0	—	29.5	—	61,8	—	2,7	—	72,5	—	19,5	—	5,3	—	788	—
З асушэньн. . . Mit Entwässerung	14,8	—	22,9	—	40,6	—	33,3	—	74,3	—	1,3	—	75,2	—	16,3	—	5,7	—	985	—
У тым ліку: darunter Да 50% . . . . bis zu	15,5	—	22,9	—	40,9	—	30,9	—	72,1	—	1,0	—	72,8	—	17,5	—	6,4	—	996	—
> 50% . . . . über	13,5	—	22,5	—	39,5	—	36,2	—	77,1	—	1,9	—	77,6	—	14,4	—	4,5	—	983	—

1) Спутник техника-животновода по кормлению с.-х. животных проф. Е. А. Богданов (изд. Новая Деревня 1922 г.)

2) У графу «бульба» уключаны кораньплоды, якіх у ІІ-й групе па забалочанасьці 1,5%, у 1 гр, па няўдобных землях—2%, у астатніх групах менш 0,5%.

4) Разьніца паміж сумай указаных у т. № 29 кармоў і 100% адносіцца на долю зяленага корму, барды і т. п. Малака у кармавой дачы каля 0,5%.

Процант бульбы і зерна з мукой, як відаць з гэтай табліцы, з ростам проценту забалочанасьці і няўдобных зямель паступова падае (акрамя % бульбы па няўдобных землях); у той-жа час доля грубых кармоў (асабліва рэзка па забалочанасьці) павялічваецца.

Сярод грубых кармоў пераважнае месца ў агуле займае салома. Што датычыцца сена лугавога, то яно на 72—93% балотнае.

Агульная колькасьць усіх кармоў у перакладзе на 1 галаву рагатай жывёлы (карову), па меры ўзмацненьня ступені забалочанасьці і павялічэньня проценту нягожых зямель, таксама падае.

У гаспадарках з селішчаў з асушэньнем якасны бок кармавога рацыёну ў агуле ня лепш апошняга ў гаспадарках з селішчаў без асушэньня. Зато колькасная розьніца даволі значная: у гаспадарках без асушэньня кармавы рацыён амаль на 200 адзінак менш, чымсь у гаспадарках з асушэньнем.

Табл. № 30. А вось працантны склад кармавога рацыёну каровы за стойлавы пэрыяд 1924—1925 г. па матар'ялах Ц.С.У. [1]).

Акруга	Саломы азімай	Саломы яравой	Саломы і мякіны	Сена лугавога	Сена сеян. траў	Усіх грубых кармоў	Канцэнтр. кармоў	Іншых кармоў	Разам
Бабруйская	7	12	2,2	57,7	2,8	82,7	3,7	13,5	100
Мазырская	6,8	7,2	15,5	74,8	0,3	90,6	2,6	6,8	100
Слуцкая	7,9	14,7	25,8	43,9	5,2	74,9	8,8	16,3	100
Па Беларусі	7,5	17,9	30,8	45,6	6,4	82,8	6,8	10,4	100

Гэтыя дадзеныя некалькі адрозьніваюцца ад прыведзеных у таб. № 29, аднак гэтае адлічча можа быць растлумачана па першае тым, што дадзеныя Ц.С.У. адносяцца да каровы і да 1924—25 г., дадзеныя-ж экспэдыцыі—да усяе рагатае жывёлы ў перакладзе на карову і за 1925—26 г.

Што датычыцца таго, наколькі практыкуючаеся абсьледаванымі гаспадаркамі кармленьне рагатай жывёлы рацыянальна з боку адпаведаньня ў розныя пэрыяды году паміж падтрымліваючым і прадукцыйным кормам з аднаго боку, і жывой вагай і ступеньню прадукцыйнасьці, з другога, то высьвятленьне гэтага пытаньня, па маючыхся ў бюджэтах зьвестках, было не магчыма, па колькі расход усіх кармоў падлічваўся па кожнай гаспадарцы для ўсяе рагатае жывёлы ў цэлым, а не па асобных яго ўзростных групах.

На падставе лічбаў табл. № 29 можна сказаць толькі, што павялічэньне проценту забалочанасьці і няўдобных зямель вядзе да значнага ўхудшэньня (асабліва ўзмацненьне забалочанасьці) кармавога рацыёну, які ў апошніх групах па абедзьвых групоўках на 76% складаецца з грубых кармоў. Тады як рацыянальная кармавая дача, праўда для каровы, па ўцьвярджэньню Турскай дасьледчай станцыі [2]) павінна ўтрымоўваць каля 60% грубых кармоў. Затым, што нават і ў такім відзе дача гэтая ў групах з найбольшым процантам забалочанасьці і

[1]) Статыст. штогоднік Белар. Ц.С.У. за 1924—25 г. в. II, ч. I.

[2]) Бабицкий, Производств. минимумы в крест. хоз. Белоруссии, «Сов. Строит.» № 11, за 1926 г.

няўдобных зямель процантаў на 30—35 ніжэй, чымсь у першых групах па абедзьвых групоўках, што відаць з наступнай таблічкі.

Табл. № 31. На 1 пераводную [1]) галаву рагатай жывёлы прыходзіцца кармавых адзінак у сярэднім на 1 дзень [2]).

Auf je ein Haupt (verrechnet) Rindviehes entfallt im Durchschnitt Täglich an Futtereinheiten:

ГРУПЫ GRUPPEN	I	II	III	IV	Без асуш. Ohne Trockenlegung	3 асушэн. наогул Mit Entwässerung	У тым ліку: Darunter: Да 50% bis zu	> 50% über
Па забалочанасьці . . . Auf versumpften Lande	6,5	7,1	6,5	4,8	4,8	6,1	6,1	6,0
Па няўдобных землях . . . Auf Oedland	6,6	7,2	5,9	5,5	—	—	—	—

Гэтая дача далёка недастаткова для рагатай жывёлы: Турская дасьледчая станцыя разьмер дачы для каровы лічыць 10,5 кармавых адзінак у дзень. Калі гэтую дачу зьменшыць на тую долю прадукцыйнага корму на малако, якую рагаты маладняк займае ў указанай пераводнай адзінцы, то гэтая дача для пераводнай галавы будзе раўна 9,3 кармавых адзінкі [3]).

Пры супастаўленьні-ж гэтай нармальнай кармавой дачы з прыведзенай у табл. № 31 атрымоўваецца наступнае.

Т. № 32. З 100 кармавых адзінак, нармальна патрэбных пераводнай адзінцы рагатай жывёлы не дадаецца ёй кармавых адзінак.

Von 100 Futtereinheiten, die normaler Weise bei Umrechnung auf ein einzelnes Stück Rindvieh zu verfüttern ist, erhält dasselbe an Futtereinheiten zu wenig.

ГРУПЫ GRUPPEN	I	II	III	IV	Без асуш. Ohne Trockenlegung	3 асуш наогул Mit Entwässerung in Allgemeinen	У тым ліку Darunter Да 50% bis zu	über > 50
Па забалочан. . . Auf versumpften Lande	30,2	23,5	30,2	48,4	48,4	34,5	34,5	34,4
Па няўдоб. зям. Auf Oedland	29,1	23,6	36,6	40,9	—	—	—	—

Рагатая жывёла, як бачым, не даатрымоўвае нават і да такой, параўнальна ня высокай нормы кармоў і тым у большай ступені, чым у селішчах і гаспадараках больш процант забалочанасьці і няўдобных зямель.

Калі прыняць пад увагу, што кармленьне рагатай жывёлы ўтвараецца сялянамі ў большасьці выпадкаў без дакладнага вучоту і разь-

[1]) Коэфіцыент пераводу: карова = 1, раг. маладняк > 1 г. = 0,66, да 1 г. = 0,25

[2]) Стойлавы пэрыяд узят сярэдні для 3 акруг—163 дні. Статыст. штогоднік Бел. Ц.С.У. за 1924 г. в. II, ч. I.

[3]) Сярэдні ўдой пры гэтым браўся 25 пудоў, удойны пэрыяд—6 мес.

ліку, на вока, дзякуючы чаму найбольш востры недакорм, як правіла, прыходзіцца на другую палову стойлавога пэрыяду і асабліва на вясну, калі ў гумне ні сена, ні саломы, і калі крыніцай грубых кармоў служаць ня рэдка паўсгніўшыя стрэхі, то будзе ўпаўне зразумелы той высокі процант падзяжу застрахованай рагатай жывёлы ад схудаласьці, раздуцьця жывата (тымпаніту), катараў, запораў і т. п. і кароў—ад нерасьцёлаў, аб якім гаварылася ў т. № 21.

